Павел Місько

# Прыгоды Бульбобаў



Павел Місько

# Прыгоды Бульбобаў

Аповесці

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
2004

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
М65

*Для сярэдняга школьнага ўзросту*

ISBN 985-02-0676-4

© Місько П. А., 2004
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2004

# Прыгоды Бульбобаў



## Былі сляпыя, сталі відушчыя

А я ўжо думаў, што нічога на свеце лепшага і не трэба...

Праўда, спачатку нават не думаў. Проста адчуваў, як мне добранька, калі спіш каля чагосьці цёплага, мяккага, варухлівага, вялікага. І пахучага. Я гэты родны пах не пераблытаю ні з якім іншым. Бо ёсць яшчэ каля мяне нешта варухлівае, але не такое вялікае. Яно і пахне крыху не так. І не пасмокчаш яго. Праўда, я спрабаваў пасмактаць — за вуха ці за хвосцік, але смаку ніякага. Так — забаўка. А вось калі патыцкаешся мордачкай у тое вялікае і цёплае, зловіш такую сусолачку...

Ой, не магу!.. Цмокнеш раз, другі, і ў рот табе пальецца такое салодкае, смачнае, духмянае. Толькі каўтай, не марудзь. І каўтаеш, пырхаеш, аж захлёбваешся, і чуеш, як у тваім жывоціку цяплее, а па ўсім целе перакочваецца прыемная млявасць, ахоплівае дрымота. Ах, якая дабрыня!

А сёння толькі прачнуўся, пазяхнуў, як штосьці балюча рэзнула ў правае вока. Я перапужаўся і зноў заплюшчыў яго. От жа дзіва, га? Што гэта магло б такое быць? Што са мною сёння здарылася? Зноў паціху расплюшчваю вока — і зноў заплюшчваю ад страху. Ай-яй-яй! Так светла-светла наўкол, здаецца, нават у табе самім усё свеціцца. А сярод светлага ёсць яшчэ больш светлае —кружок. На яго ажно глянуць балюча, хіба як прыплюшчыш павекі, зробіш вузенькую шчылінку.

— Ну, што ты мне міргаеш адным вокам? Добрай раніцы, сынок!

Тое цёплае і вялікае, з-за каго я спалохана паглядваў на светлы кружок, узнялося нада мною. Не ўсё: адна толькі вялікая галава з вялікімі вушамі і вялікімі добрымі вачыма.

— Што, кажу, падміргваеш мне? Давай умывацца... Але спачатку пацягніся добра, каб усе жылкі затрашчалі, фіззарадачку зрабі.

Калі я пацягнуўся як след, галава схілілася нада мною, лізнула мне нос і губы, правае і левае вока, за вушамі, зноў вочы — правае і левае.

— От та-ак... От та-а-ак... Каб добра вочкі глядзелі,— вурчала галава.

Я ўжо бачыў на абодва вокі, у вачах больш не рэзала, як спачатку.

— Хто ты? — прапішчаў я.

— Твая мама.

— Ма-а-а-ама-а...— Мне зрабілася лёгка і радасна. Дык вось яно хто — тое вялікае, цёплае, добрае! І смачнае, пахучае! Гэта проста мая мама. Мама, мама!

— А хто я?

— Мой сынок, сабачаня. Ну, а ты чаго не прачынаешся? — Мама лізнула і тое цёплае, што ляжала справа ад мяне каля мамінага жывата. Такое, як і я, па росту і масці такое — шэранькае.— Уставай! Брацік твой зусім-зусім прачнуўся, у яго ўжо вочкі глядзяць. А ты... Эх ты, лежабок...

Мама вурчала і ўмывала яго языком. Усяго — ад носа да хвосціка. Брацік мой соладка мружыў вочы, крахтаў ад задавальнення. Але чаму мама яго ўсяго мые, а мяне толькі палізала ў пыску, у вочкі, за вушкамі? Што я — горшы за брата? Калі ён мне брат, то хто я яму? Таксама брат.

Два браты, абодва роўныя, і мама нас павінна любіць аднолькава.

Я не паспеў добра пакрыўдзіцца, як мама зноў пачала лізаць мяне, умываць і спінку, і жывоцік, і пад лапкамі.

— Ух-ха-ха! Ой, ха-ха-ха! — Ад казытання мяне разбірае смех — не вытрываць проста. А язык у мамы мокры, шурпаты, але і далікатны.

Мама сказала, што цвёрдае і халоднае, крыху цемнаватае вакол нас — дошкі будкі. А светлы, яркі-яркі кружок на адной сценцы — лаз. Ну, выхад, значыць. Мама паабяцала, што з гэтага дня будзе многа-многа нам расказваць.

Добра ў нашай будцы каля мамы. Утульна, мякка, цёпла. І светла! Як добра, калі светла, а не цёмна. Бачыш, куды ступаць, і не стукаешся носам.

А што там, за гэтым светлым-светлым кружком, за дзвярыма?

Мама пакарміла нас, брацік зноў соладка захроп, паклаўшы на мяне тоўстую мордачку. Бач

ты яго, прывычку ўзяў — наверх узбірацца. Не паддамся!

Я вылузаўся з-пад яго і ўбачыў, что мама шмыгнула ў лаз і знікла з вачэй.

Куды яна пайшла? Яна думала, што я сплю і можна ісці.

Але ж я не сплю!

Брат спіць, а я не сплю.

Што там, за гэтым светлым-светлым кружком, за дзвярыма? Адтуль столькі ўсякіх гукаў даляпае. Я нібы не чуў іх да сённяшняга дня. Нібы з'явіліся ў мяне не толькі вочы, але і вушы.

Што там?

## Хто каго выбраў

Пакуль я так думаў і прыкідваў — што там, за светлым кружком, у будцы пацямнела. Я ўзрадаваўся: мама вяртаецца! Ажно не. Дзірку-выхад амаль закрылі дзве галавы. На маміну не падобныя. Мордачкі ў іх пляскатыя, ружаватыя, не такія, як у мамы і брацiка. Але ёсць на мордачках і насы, і раты, і вочы, і вушы. Вочы добрыя, як у мамы. А ўсё астатняе — проста смех: насы тырчаць кругленькія, вушы таксама паўкруглыя, прасвечваюць ружовым і тапырацца ў бакі. Раты маленькія. Абедзве галавы вельмі падобныя адна на адну, мабыць, гэта браты, як і мы.

— Ой, Толя... Яны ўжо глядзяць! — сказала левая галава.

— Гэты, што глядзіць, — мой! — сказала правая галава, якую назвалі Толем.

— А тоўсценькі — мой! — сказала левая галава.

Толя прасунуў у будку ружовую лапу і пагладзіў мяне па галаве. Прыемна, нібы мама палізала. І не страшна!

— Булька... Булька...— гаварыў Толя і гладзіў, а ў мяне ад асалоды ажно вочы заплюшчваліся. Булька мяне зваць! А я і не ведаў!

— А мой — Боб! Бобка, хадзі сюды! — У будку прасунулася другая ружовая лапа з пальцамі і схапіла майго брата за каршэнь. Боб падрыгаў лапамі і знік у лазе.

— Няхай бы спаў! Ты чалавек ці хто? — накрычаў на яго Толя. Але і сам раптам схапіў мяне за загрывак, і я задрыгаў лапамі ў паветры. «Мама!» — хацелася закрычаць мне ад страху, але я толькі віскнуў.

І ніколечкі нам не балела. Гэтыя чалавекі не ведаюць, што так мама нас карае. У нас яшчэ і вочы не глядзелі, а Боб ужо лез да мяне сварыцца за сусолку. Яму здалося, што малако ў маёй смачнейшае, чым у яго. Ён адбіраў, а я не даваў. Тады мама страсянула Боба за каршэнь і паклала на сваё месца. Дала пысаю кухталя і мне — каб не сварыліся больш.

І я гэта добра помню!

Чалавекі пасадзілі нас сабе на калені і гладзілі, гладзілі...

— Булька, Булька... — лашчыў мяне Толя. Ён вёў рукою ад носа па лбе, па карку, па спінцы. Нават мой хвосцік памераў — хаваецца ў кулачку. І так мне прыемна было і зусім-зусім не страшна. Добра, што я выбраў сабе Толю! Ну, няхай не я, а ён мяне выбраў, дык што? Якая розніца? Мы адзін аднаго выбралі.

— Коля, а ў твайго Боба кончык хвосціка белы! — сказаў мой Толя.

— Ой, праўда! — Коля з радасці падняў Боба за пярэднія лапы, паглядзеў яму на жывот, бо хвосцік Боба быў там. Боб падціснуў яго ад страху.— Дык ты белахвосцік?! От, добра, цяпер мы вас не пераблытаем.

А Боб вісеў так, вісеў і ад страху пусціў маленькі фантанчык. Коля айкнуў і адхіснуўся ад яго, пачаў атрэпвацца.

Добра, што ў Боба знайшлася такая прыкмета. Але ж вельмі мала таго белага — мо з кіпцік даўжынёю.

Так і сядзелі каля будкі Толя і Коля і ўсё гладзілі нас. Боб супакоіўся, пазяхнуў і заснуў у Колі на руках. Мне таксама соладка драмалася, але я стараўся глядзець. Хоць адным вокам. Параўноўваў Толю і Колю. З твару яны кропачка ў кропачку падобныя, аднолькава адзетыя.

— Я пад майку свайго...— сказаў Коля, адцягнуў нешта на жываце, як шкурку, і паклаў у схованку Боба.

Хацеў і Толя са мною такое зрабіць, але пачаў раптам гаварыць «ха-ха-ха!» і паказваць на Колеў жывот. Майка ў тым месцы, дзе ляжаў Боб, зрабілася мокрай-мокрай.

«Як мы іх будзем пазнаваць, хто чый? — думаў я.— Няма ў іх хвастоў, няма белага кончыка на хвасце».

Стамілася маё правае вока глядзець — столькі святла на двары! Я заплюшчыў правае і расплюшчыў левае. Які вялікі двор! Гэта ж колькі на ім можна паставіць такіх будак, як наша? Мо больш, чым белых валаскоў на хвасце ў Боба. А каля нас

узвышалася і цягнулася сцяна такой высокай і вялікай будкі-дома, што не хапала вачэй, каб усё агледзець за раз. У сцяне былі і дзверы, толькі не круглыя, як у нашай будцы, і яны зачыняліся закрываткаю. Мабыць, у такіх будках-дамах жывуць чалавекі. І толькі я так падумаў, як закрыватка прыадчынілася і адтуль выскачыла наша мама, смачна аблізнулася.

— Пальма бяжыць! Кладзі назад! — спужаўся Коля.

Нас хуценька паклалі ў будку. Але чаго было баяцца? Наша мама добрая, яна не кусаецца, вунь — ветліва махае хвастом.

Сабакі, значыць, могуць хадзіць у чалавечы дом. А чаму не хочуць лезці да нас у будку Толя і Коля? Змясціліся б, толькі трэба ім крыху скруціцца. Хай бы і яны пажылі з намі!

— Толя! Коля! Ідзіце есці! — пачуўся недзе на двары чалавечы голас.— Мыйце рукі — і есці!

— Тата заве! — усхапіўся Коля. Любіў, мабыць, паесці, як і Боб.

А што такое тата? Ці хто такі? Тое самае, што і мама, ці не? Я стаў пярэднімі лапамі на Боба і выглянуў з будкі. Тата Колі і Толі быў каля дзвярэй у дом. Гэта таксама чалавек, толькі куды большы і здаравейшы за Толю і Колю. Значыць, Толя і Коля яшчэ не сапраўдныя чалавекі, а дзеці. І такое дзіва! Толя і Коля ішлі да таты на задніх лапах, і тата стаяў на задніх лапах. Пярэднія целяпаліся так сабе, яны, відаць, і называліся рукі. Але нашто іх было мыць? На руках жа не ходзяць. І нашто ім яны, калі вісяць без карысці? Хаця я ўжо ведаю нашто. Імі можна

браць за каршэнь лепш, чым зубамі. Можна імі і па галоўцы гладзіць.

І яшчэ я прыгледзеў: на кожнай руцэ ў іх многа пальцаў, і ўсе — доўгія.

## Нас пачынаюць блытаць

Мама Пальма толькі прасунула галаву ў будку — «Вы тут?» — і зноў кудысьці пабегла. Яна вярнулася, калі Боб моцна спаў. А я не спаў, я толькі драмаў. Я чакаў яе, каб папытацца: а ці ёсць і ў нас тата?

Мама лізнула мяне і Боба, адсунула пысаю ўбок і стомлена прылегла. Мне адразу стала так добра каля яе, што я і пра тату забыў.

...Прайшло некалькі дзён.

То спім, то дрэмлем, то кормімся. То няма мамы, і мы чакаем яе, нудзімся. То нас лашчаць, пасадзіўшы на калені, Толя і Коля. Мы ўжо зусім-зусім прывыклі да іх. Я пачаў нават адрозніваць Толю ад Колі — у яго быў свой пах.

Мама неяк расказала нам, што Коля, Толя і іх тата прыехалі сюды з горада. Але яны свае людзі, на іх брахаць не трэба. А самыя-самыя свае, якія ўвесь час тут жывуць, гэта баба Ганна і дзед Антон. Брахаць жа трэба толькі на чужых. А чужых людзей ёсць яшчэ многа, яны жывуць у сваіх дамах.

— А як гэта — брахаць? А ці на ўсіх чужых трэба брахаць? Ці заўсёды? — пыталіся мы.

І мама цярпліва на ўсё адказвала.

Боб паспрабаваў брахаць. Атрымаўся не брэх, а піск. Я нават не спрабаваў: толькі сораму набярэшся.

— А ў нас тата ёсць? — нарэшце спытаў я ў мамы.

— Ёсць, а як жа. Я калі-небудзь пакажу яго, пазнаёмлю. У сабак такая завядзёнка: таты не жывуць разам з дзецьмі.

Мы зноў паснулі. І, мабыць, у сне я злавіў Боба за белы кончык хваста і сusліў яго. Бо калі прачнуліся і падурэлі крыху з Бобам, падужаліся, мокры кончык хваста зрабіўся шэры ад пылу і пацярухі. Мы і так абодва былі шэрыя, толькі носікі чорненькія. І тут да будкі падышлі і прыселі Толя і Коля.

— Булька, Булька,— пазваў мяне Толя, а сам пацягнуў за лапу Боба.

— Боб, Бобка,— сказаў Коля і ўзяў за шкірку мяне.

Я запішчаў: пераблыталі! Але ні Толя, ні Коля не разумелі майго піску.

— Нешта пахудзеў мой Боб,— сказаў Коля і пагушкаў мяне.

— А мой Булька папраўіўся, малайчына,—гладзіў Боба мой Толя. І я зноў не вытрываў, запішчаў. Так лашчыць, як Толя, Коля чамусьці не ўмеў.

Толя гладзіў, гладзіў Боба і правёў па хвосціку раз, другі, прапусціў хвосцік цераз кулачок. І раптам закрычаў:

— Глядзі, і ў Булькі кончык хваста пабялеў!

Тады Коля пагладзіў, пацёр мой хвосцік.

— Ой, а ў Боба пацямнеў...— прашаптаў ён.

Мы пачалі абурана пішчаць.

— Мы іх пераблыталі! — нарэшце здагадаліся яны.

Толя і Коля памянялі нас, і мы адразу супакоіліся.

— Бульбобы вы! Абодва Бульбобы! — Толя падняў мяне за пярэднія лапы, паставіў на заднія, як чалавека.

— Ну — пайшлі! Ну — хадзем!

Ой, як цяжка, як нязручна хадзіць на дзвюх лапах. Бедныя, бедныя Толя і Коля, як яны пакутуюць! Коля таксама вадзіў Боба за пярэднія лапы.

— Белахвосцік ты... Дуралей малы... Свавольнік! Гэта ж трэба так нас ашукаць!

Коля не ведаў, што гэта я падстроіў такое з Бобавым хвастом.

## Мы ідзём гуляць самі

Сёння я прачнуўся раней за Боба. Прачнуўся, бо нехта закрычаў каля будкі на ўсё горла: «Ку-ка-рэ-ку!» Мамы Пальмы ў будцы не было, а Толя з Колем не прыйшлі яшчэ. Патузаў белахвостага за вуха — уставай! Патузаў за хвост — расплюшчыў той вочы, пазяхнуў:

— Ты чаго лезеш? Як цапну зараз...

Гэ, цапне ён... Непаварацень, пакуль збярэцца, дык я тры разы адскочу.

— Хадзем на двор, пагуляем,— сказаў я.

— Мама сказала нікуды не выходзіць з будкі,— адмовіўся Боб. Але сам усё-такі зіркнуў адным вокам на светлы кружок.

І тут зноў пачуўся прарэзлівы крык: «Ку-ка-рэ-ку!» Усё роўна як: «Ратуйцеся! Уцякайце хто куды!»

Белахвосты спалохана ўціснуў галаву ў плечы, падцяў хвост.

— Не бойся, там столькі цікавага! — пацягнуў я яго за вуха.

Паддаўся Боб на ўгаворы. Мы няўклюдна пералезлі цераз парожак.

Ногі нас чамусьці ўсё яшчэ не трымалі моцна. Мы хісталіся і цісnуліся адзін да аднаго. Мо ад страху? Двор такі вялікі — за дзень не перапаўзеш. Гэта ў адзін бок. Амаль столькі ж і ў другі бок ад будкі. Хіба ўпоперак паспрабаваць? Там каля дрэў высозная сцяна з дошак. Толькі гэтыя дошкі не шчыльна стаяць адна каля адной, а нібы цераз адну. Называецца гэта плот — так мама ўчора казала. Каля плота заўзята грабуць лапамі пясок смешныя белыя звяры на дзвюх нагах. Замест пысак у іх дзюбы. Хвасты растапыраныя, шырокія, на галовах нейкія банцікі. На дзвюх нагах, а на людзей не падобныя!

— Падыдзем бліжэй? — нясмела прашаптаў я.

— Ай...— віскнуў Боб.

Самы большы з гэтых двухногіх раптам адтапырыў у бакі шырачэзныя лапы, замахаў імі, пагнаў на нас вецер і пыл. І нечакана ўзляцеў на плот.

— Ку-ка-рэ-ку-у!!! Рыхтуйцеся да дажджу!

Крык быў страшны, і мы кінуліся хавацца за будку. А ногі нашы падкошваліся, мы тыцкаліся пыскамі ў пясок, куляліся.

Пасядзелі, аддыхаліся. У кутку за будкай я ўбачыў кучу кольцаў, зверху ляжаў прывязаны да іх абручык. Я падышоў, панюхаў: кольцы былі халодныя і пахлі мамаю. Яшчэ мацней пах мамаю абручык, ён не быў такі халодны і цвёрды. Што гэта за дзіва такое?

— Глядзі, хто ідзе! — Боб торкнуў пысаю мне пад бок.

Я азірнуўся. Да дзюбатых стварэнняў падыходзіла яшчэ адно. Не адно, а адна, бо гэта, мабыць, была мама. За ёю беглі, мітусліва перабіралі тоненькімі ножкамі яе дзеці. Кругленькія, пушыстыя і, мабыць, мякенькія. Яны папісквалі, як мы, а на шчанят не былі падобныя.

Дзюбатая мама квактала, клікала за сабою дзяцей. А дайшла да таго месца, дзе сядзеў на плоце крыкун, сказала:

— Злазь з плота, не смяшы курэй! Кэх, кэх... Не пужай, ніякага дажджу не будзе!

— Будзе, квактуха, будзе! Гэта я табе кажу — певень! — і ён зноў закрычаў: — Ку-ка-рэ-ку-у! Скора будзе дождж! Кураняты, не адыходзьце далёка ад мамы.

— Той, што на плоце,— певень! — прашаптаў мне на вуха Боб.

— Тыя, што ўнізе,— куры і кураняты,— сказаў я.— Давай пагуляем з куранятамі!

Як смешна ішоў Боб! Лапкі кароценькія, тоўстыя, жывоцік ледзь па зямлі не шмаруе. А хвосцік закруціў на спіну! Задраў і я, падумаеш, не вялікая навука... На паўдарозе мы прыселі: і стаміліся, і квактуха якраз паклікала да сябе куранят: «Кэ-кэ-кэ! Бяжыце сюды, чарвяка знайшла!»

Першымі дабеглі кураня з белымі крапінкамі на крыльцах і кураня з чорнымі крапінкамі. Схапілі дзюбкамі чарвяка за канцы. Тузаюць кожнае да сябе. То адно перацягне канацік, то другое, то адно тупаціць за чарвяком, то другое. А чарвяк то расцягнецца, то скароціцца. Трапечуць кураняты маленькімі крыльцамі, упіраюцца, не паддаюцца адно аднаму, ажно садзяцца на хвосцікі. Раптам кончык чарвяка выслізнуў з

дзюбкі правага кураняці, таго, што з чорнымі крапінкамі на крыльцах. Чарвяк — плясь! — па левым кураняці. А кураня — кулецъ! І другое ўпала, у другі бок...

— Хі-хі-хі! — не вытрываў Боб.

— Абодва прагныя,— сказаў я.

Падхапілася чорнае кураня, зноў учапілася дзюбкаю ў кончык чарвяка. Тузець! Белае кураня ўсхапілася на ногі, а чарвяк ужо вырваўся ў яго — плясь! — па дзюбе чорнаму.

— Ну, што вы не падзеліце! — Мама-квактуха дзеўбанула чарвяка, падняла — а на кончыку кураня вісіць, гушкаецца. Курыца апусціла яго на дол, дзёўб, дзёўб — разарвала чарвяка на кавалкі. Аднаго чарвяка на чатырох куранят хапіла.

— Прыміце і нас у кураняты! — Падышлі мы да квактухі.

— Хто такія? Прэч! — Курыца дзюбнула і мне ў галаву, і Бобу.

З вачэй пасыпаліся іскры, падкасіліся ногі. А курыца натапырылася, закруцілася, затупала на месцы: «Ух, якая я злосная... Кэх, кэх... Суньцеся толькі яшчэ! Суньцеся!»

З віскам мы кінуліся ў будку.

## З неба штосьці льецца

— За што яна нас? — скуголіў Боб, тручы лапкаю гузак на галаве.

— Мы ж хацелі толькі пазнаёміцца, пагуляць! — усхліпваў і я, цёр лапкаю вочы.

— Пабаялася, што чарвяка адбяром... Трэба нам яе чарвякі! — не мог супакоіцца Боб.

Добра, што ў нас ёсць будка. А то куды б мы ўцякалі, хаваліся? Як цікава на двары і як небяспечна... І хоць шчымелі і балелі гузакі на галовах, нам усё роўна зноў хацелася на двор. Вось каб не было там квактухі! Самы страшны звер — квактуха.

— Падумаеш! — сказаў я.— А наша мама яшчэ большая!

— Як скажам ёй... Як страсяне за шкірку тую квактуху! — пагражаў Боб.

І тут зноў закрычаў певень:

— Ратуйцеся-я-я!!!

Храбры Боб віскнуў і шмыгнуў у цямнейшы куток будкі. Спужаўся і я, але крыху памарудзіў. І тут як ляснула-бліснула! Я на момант аслеп і аглух. А потым убачыў, як па двары закружылася, завіхурыла смецце і пыл, нібы вялізны сабака мёў хвастом зямлю. А дрэвы за плотам таксама махалі галінамі, яшчэ больш наганялі ветру.

Квактуху вецер раскудлаціў і папхаў, пакаціў па двары. За ёю імчаліся, ножак не згледзець, клубочкі-кураняты. Піск, крык, кудахтанне...

Раптам расчыніліся дзверы чалавечага дома, выбегла баба Ганна: «Ах! Ох! Сюды! Сюды!» Я ведаў ужо, што гэты вялікі чалавек — баба Ганна, гаспадыня. Паказвала неяк здалёк мама Пальма. У людзей смешная прывычка — надзяваюць на сябе адзенне. Дык я запомніў прыкметы бабы: яна адзявае адну шырозную-шырозную штаніну на абедзве нагі адразу. Смех! Яна ж замінае бегаць. Толю, Колю і іх тату лягчэй бегаць, у іх на кожную нагу штаніна асобна.

— Сюды! Ціп-ціп-ціп! — клікала баба Ганна курыцу з куранятамі ў хату.

Квактуха сама ўскочыла на ганак, схавалася ў дзвярах. А кураняты разгублена мітусіліся, крычалі. Баба лавіла іх і падсаджвала на прыступкі ганка. Апошняе кураня так і панесла ў руках.

І тут штосьці залапатала па лісці. Пясок на двары зрабіўся рабы ад чорных плямак-кропель. З неба да зямлі павіслі бліскучыя, празрыстыя вяровачкі.

— Што гэта льецца? — падпоўз да мяне Боб. Высунуў язычок, каб злавіць колькі кропель. Думаў мо, што малако.

І я высунуў язык, лізнуў.

— Гэта не малако. Не той смак,— сказаў я.

Мы выпаўзлі з будкі. І тут нас пачалі дзяўбці і біць кроплі. Халодныя, колкія. Але ад іх не балела. Наадварот, перасталі балець нашы гузакі.

— Гэ-гэй! Гэта дождж! Ён — мокры! — здагадаўся Боб.

— Гэ-гэй! — закрычаў і я.— Мы не баімся нясмачнага дажджу!

Эх, каб з неба лілося замест дажджу малако! Еш — не хачу, купайся ў ім з галавой!

Я паплюхаў лапамі па маленькай лужыне каля будкі, потым па большай, крыху далей. Апырскаў Боба з галавы да кончыка хваста. Вось так! Вось та-ак! А Боб — мяне... А я — яго... А Боб...

— Вы чаго тут мокнеце, як сабакі? — Раптам выскачыла з-за будкі мама Пальма.— Прастудзіцеся!

Мы шмыганулі ў будку.

Каля ўвахода мама страсянулася ўсім целам, у бакі паляцеў дождж.

— І вы атрасіцеся трохі. А то доўга сохнуць будзеце! Во так, глядзіце...— Яна страсянулася яшчэ раз. У бакі зноў паляцеў дождж, толькі меншы.

Я паспрабаваў страсянуцца — і ўпаў.

Паспрабаваў Боб — упаў.

— Эх вы! Нічога вы яшчэ не ўмееце. Пара, пара брацца з вамі за навуку.

## Першы мамін урок

— Эх вы! — паўтарыла мама дакорліва.— І чаго вы так марудна расцяце? — Яна аблізвала нас, сушыла языком і не пераставала гаварыць.— Ну, хто з вас можа натапырыць вушы? Э-э, ніхто... А ў вашага таты прыгожа вушы тырчаць... Ну, тады паварушыце імі... Таксама не можаце? А сабакам без гэтага не абысціся. Мы гэтак знакі адзін аднаму падаём, «гаворым».

Мы дружна ўздыхалі: праўда, чыстая праўда, не слухаюцца нас вушы. Эх, каб хутчэй вырасці!

— А хвосцікі як? Слухаюцца вас хвосцікі?

— Ага, мамка! Слухаюцца! — закрычаў Боб.

— Боб навучыўся падцiскаць хвост ад страху,— сказаў я.

Боб пакрыўдзіўся.

— Я і задзіраць магу! Во, глядзіце, які вялікі абаранак на спіне.

— Хо, і я магу хвосцік абаранкам рабіць,— сказаў я.

— Ну і абаранкі ж у вас! Не абаранкі — сушкі маленькія. Ёсць такія — цвёрдыя, як костка. Толя даваў мне — смачныя. Калі-небудзь і вы пакашту-

еце, навучыцеся цвёрдае есці. Ну, а зараз я не пра гэта. Задзярыце хвосцікі і памахайце імі!

Мы закруцілі хвосцікі на спіну.

— Малайцы. Калі поўны абаранак, хвост напружаны, то гэта многае можа азначаць. Або ў сабакі цудоўны настрой. Або мы ўстрывожаныя, раззлаваныя. Калі ж не поўны абаранак рабіць і крыху памахаць хвастом, значыць: «Прывітанне!» Гэта калі далекавата бачыш знаёмага сабаку. Калі ж добры прыяцель, то трэба махаць мацней і часцей. Сыходзьцеся і лізніце адзін аднаму куточкі рота. Можна і носам пацерціся, паторкаць у пысу яму. Калі ж сапраўды блізкі сябар, то віляць трэба з усёй сілы, прыціскаць вушы да галавы, моршчыць лоб, усміхацца куточкамі губ, лізаць, прытанцоўваць, пакручвацца ў бакі. Я помню, яшчэ малыя былі Толя і Коля, па паўтара года, ці што, прыехалі яны з горада на лета. Тэп, тэп, ідуць да будкі. То я так узрадавалася, так віляла — пазбівала хвастом з ног аднаго і другога.

— Ха-ха-ха! — засмяяліся мы з Бобам.

— Нічога тут смешнага няма. Усё трэба ў меру рабіць, бо часам і за падлізванне, падхалімства гэта могуць прыняць. Во, яшчэ быў выпадак. Непадалёку ад нас хлапчук Генка жыве, у яго вялікі сабака Султан... Ага, дык тады Генку было гадоў пяць, а Толю і Колю па тры. Пакрыўдзіў Генка Колю... Я адразу заступілася, таўханула Генку лапамі ў плечы. Ён і брыкнуў. Коля раве, Генка ўпаў — раве... Дарослыя людзі набеглі, пачалі крычаць на мяне, думалі — я ўкусіла яго. Запомніце, сынкі: сабакі ніколі не кусаюць малых дзяцей — ні сваіх, ні чалавечых, нічыіх... Але я пачала пра другое. А пра што мы спачатку гаварылі?

— Пра хвосцікі,— падказаў я.

— А-га-а. Пра хвасты. Паўтараю, без хваста ў сабачай гаворцы не абысціся. Не ўсе людзі гэта ведаюць і разумеюць. Ёсць некаторыя пароды сабак, якім адсякаюць хвасты яшчэ маленькім. Баксёрам, напрыклад. Яны падрастаюць і не помняць нават, што мелі некалі нармальны сабачы хвост. Нават ганарацца, што яны бясхвостыя, пазлядаюць фанабэрыста на іншых. А чым ты ганарышся? Тым, што калека? Не лезь, Боб, не падлабуньвайся... Яшчэ рана карміцца: я не скончыла ўрока.

Я схапіў Боба за хвост і адцягнуў ад мамінага жывата. Бач ты яго, хітранькі! Пакуль я развесіў вушы і слухаю, ён давай прыладжвацца, каб пасмактаць.

— Дык я не скончыла пра хвасты. Пра хвост у сабачым жыцці можна многа расказваць. Я скажу яшчэ, што трэба паказваць хвастом пры першым знаёмстве. Мы, сабакі, далёка кепска бачым. Пазнаць пазнаеш, што сабака бяжыць. А кім ён табе будзе, сябрам ці ворагам? Мо адразу біцца з ім трэба будзе? Таму ўсё цела напружвайце, насцярожвайцеся, хвасты задзірайце ўгору, згінайце толькі крыху. Нібы пытаецеся ў яго: «Ну, ну, што ты за цаца?» Бачыш, і ён гэтак робіць хвастом, падыходзіць паўкругам. Лажыся тады на жывот, лапы пярэднія ўперад, заднія пад сябе, галаву ўвагні. А раптам ашуквае? Трэба, каб мог ускочыць імгненна... Ён бліжэй, бліжэй круг вядзе... Ужо відаць, што зморшчыў шкуру на лбе і носе, ашчэрыў іклы, вушы натапырыў і нахіліў уперад. Гыркае, пагражае... Усхоплівайся і ты, старайся гыркнуць яшчэ страшней, гэтым

нібы выкажаш сваю сілу. Ён не адскоквае, але і не нападае. Тады абыходзьце адзін аднаго па дузе, усё бліжэй, бліжэй... Хвост пакуль не апускайце, можаце толькі трошкі павадзіць кончыкам з боку ў бок. Калі ён зразумее дружалюбны намёк, то таксама трошкі вільне. А тады сыходзьцеся, нюхайцеся, нюхайце хвасты. Калі мірны сабака, то гэта адразу пазнаеш...

— Есці, есці...— запішчаў Боб. Ён мо і не чуў усяго, толькі пра яду і думаў, таўсцель.

— Ну, наце, карміцеся...— дазволіла мама.— Галоўнае — умець назіраць, умець распазнаць, што гаворыць сабака хвастом, вушамі, спінаю, пысаю.

Мама ласкава ўсміхалася — я пазнаў гэта па голасе, па маршчынках, што парабіліся ў куточках яе вачэй. Я ўжо ўмеў крыху назіраць.

## Знаёмства з Генкам

Генку, у якога ёсць сабака Султан, прывялі назаўтра Толя і Коля. Праўда, без Султана.

Спачатку мы пачулі іх звонкія галасы. Адразу прачнуліся, але ўставаць не хацелі. Мы песціліся, пазяхалі — хто даўжэй прабудзе з разяўленым ротам?

— А я кажу, непародзістыя! — набліжаўся нечы незнаёмы голас.

— Пародзістыя, пародзістыя! — у два галасы даказвалі Толя і Коля.— Яны шэрыя, як аўчаркі! Мы іх у горад забяром, выгадуем дзвюх аўчарак!

— Ха-ха-ха! І яшчэ раз — ха! — ужо зусім блізка чуўся незнаёмы голас.— Калі хочаце ве-

даць, на ўсё сяло ў мяне ў аднаго пародзісты сабака. Чыстакроўная аўчарка. Адкуль у Пальмы могуць быць пародзістыя дзеці, калі сама невядома хто?

Мне ўжо не падабаўся гэты незнаёмы голас. Задавака, мабыць, той, хто гэтак гаворыць. І нахабнік. Яшчэ не бачыў нас, а ўжо зневажае, абзывае непародзістымі. І на маму нашу абы-як — «невядома хто...». Як гэта невядома? Кожны тут ведае, што яна наша мама і лепшая за ўсіх.

Мяне ўсё больш разбірала злосць...

Каля будкі затупацелі і заціхлі крокі. Дзеці прыселі, мы ўбачылі Толю, Колю і незнаёмага. Твар у незнаёмага доўгі і нос доўгі, рот малы і вузкі. Незнаёмы працягнуў у будку руку з вялізазнымі пальцамі, схапіў мяне за лапу. Мне забалела, і я цапнуў зубамі.

— Ого! — незнаёмы адхапіў руку.— Ого, зубкі паказвае... Гэта добра. І глядзяць абодва лупата, разумна — таксама добра. Іх ужо выхоўваць трэба. Калі што не так будуць рабіць — караць.

Незнаёмы схапіў мяне за каршэнь, выцягнуў з будкі, хоць я і ўпіраўся.

— Вось так караць, вось так...— Ён даў мне ў нос дзве пстрычкі.

Я заскуголіў: было і крыўдна, і балюча. За што?!

— Ты... Ты!.. Яму ж баліць! — ледзь не заплакаў разам са мною Толя. Выхапіў мяне з яго ўчэпістых рук.— Ён цябе любіць не будзе! Ты гадкі, Генка!

— І не трэба, каб ён кожнага любіў. Трэба, каб любіў толькі свайго гаспадара. Толькі гаспадара слухаўся. Мой Султан слухаецца толькі мяне. Маё слова для яго закон!

— Генка, а паспрабуй Боба вазьмі! — сказаў Коля.

Толя прысеў на кукішкі, заглядвае ў будку, трымаючы мяне. Каля яго прысеў Генка, за Генкам — Коля. Усе глядзяць у будку. Я нічога ў ёй не бачу, у лазе цёмна, нібы там ноч.

Генка дастаў за шкірку Боба. Пасадзіў на сагнутую левую руку, праваю пагладзіў і тузануў за вуха. Боб, замест таго каб цапнуць за руку зубамі, лізнуў.

— Э-э, кісель... На! — Генка сунуў Боба Колю. Цярнуў палізаным месцам аб штаны.— Хаця пачакай... Паглядзім у роце.

Коля трымаў Боба, а Генка разяўляў, раздзіраў яму рот.

Расшчапіў, заглянуў...

— Кісель, я ж кажу... А ў гэтага?

Генка павярнуўся да Толі, у якога на руках быў я. Працягнуў да мяне рукі. Я завурчаў ад злосці. Не хапала, каб лезлі мне ў рот з нямытымі рукамі! Але Генка злаўчыўся і схапіў мяне адною рукою за верхнюю сківіцу, другою — за ніжнюю.

Расшчапіў сілком, хоць я не даваўся і сціскаў зубы з усёй моцы.

— О-о, вось гэты мне падабаецца. І ў майго Султана чорна ў роце. З характарам!

Я не зразумеў, хто з характарам. Я ці Султан? Калі я, то хіба гэта кепска?

— Выхоўваць іх трэба, выхоўваць,— паўтарыў Генка.— Строгі рэжым...

— Яны ж яшчэ маленькія! Другі месяц пайшоў, што яны разумеюць? — гаварылі Толя і Коля.

— Ужо трэба пачынаць выхоўваць. Ужо! Калі хочаце забраць з сабою, у кватэры трымаць... Гэта вам не ў сяле! — Генка зайшоў за будку, за ім Толя і Коля. Генка падняў той абручык, што пах мамаю. За абручыкам пацягнуліся адно за адным кольцы. Яны былі злучаны паміж сабою! — У сяле сабак добра трымаць,— гаварыў Генка.— Пасадзіў на ланцуг — і хай брэша. Дайце цвічок і малаток... Уваб'ём во тут у сцяну — чапляць аброжак. Каб не валяўся абы-дзе. А мо самі ўваб'яце?

— Самі! Самі! — заківалі галовамі Толя і Коля. Генка паклаў аброжак на будку.

— Гэта мы пускаем Пальму гуляць,— сказаў Толя.— Шкада яе.

— Я так і думаў, што вы... У дзеда Антона яна не вельмі разгульвала.

Я не разумеў, пра што яны гавораць. Як гэта — саджаць на ланцуг? Мяне каб пасадзілі на тыя халодныя кольцы, то я ўцёк бы ў будку. Холадна ад іх у лапы, у хвост.

А ў будцы цёпла, мякка, утульна.

— І трэба іх падкармліваць ужо, вучыць есці. Калі ваш тата забярэ вас? — спытаў Генка.

— Мо праз месяц.

— За гэты месяц яны павінны навучыцца і хлябтаць, і густое, цвёрдае есці.

— Праз месяц мы ў школу пойдзем, у першы клас,— пахваліўся Толя.

— Ага, і я ў першы! — кінуў Коля.

— Маляўкі! Я ў чацвёрты пайду, і то не хвалюся. Хто са мною зараз на рэчку? Я вудачку вазьму і Султана.

— Баба будзе сварыцца,— уздыхнуў Коля.

— Эх вы! Бабчыны ўнучкі! — пагардліва скрывіў губы Генка.

— Я пайду! І Бульку вазьму! — сказаў Толя.

— А я — Боба! — узрадаваўся Коля і пагушкаў майго брацiка.

І я ўзрадаваўся, захваляваўся: што такое рэчка? Ці далёка?

Мы ж не можам далёка ісці. І што гэта за Султан такі?! Толькі і чуеш — Султан, Султан...

А яшчэ я думаў: чаму мы непародзістыя? Хіба кепска жыць непародзістым? У нас жа і лапы, і хвост, і галава, і ўсё такое. Усё на месцы...

Толькі не думаў я, куды хочуць нас забраць Толя і Коля. Проста забыў пакуль што пра гэта.

## Генка — несур'ёзны чалавек?

Мы з Бобам не пайшлі сваімі нагамі. Нас панеслі на руках Толя і Коля.

Які ж вялікі белы свет! Акрамя двара ёсць яшчэ і вуліца, абапал яе стаяць вялікія дамы. З якога выйшаў Генка, я не прыкмеціў, хоць з рук было ўсё лепш відаць, чым з зямлі. Апынуўся ён каля нас нечакана, побач з ім быў высокі шэры сабака. Мо да барады Толю і Колю. Сам шэры, а жывот у яго светлы, спіна з чорнай палоскай. Якія рухавыя і вясёлыя ў яго вушы! Стаяць тырчком, імгненна паварочваюцца ва ўсе бакі. Я адразу здагадаўся, што гэта Султан. Нават патузаўся на руках у Толі, папішчаў, паняўкаў. Хацеў, каб Султан заўважыў мяне. Але ён ішоў побач з Генкам, крок у крок, і нават не зірнуў на мяне. І на Боба ні разу не зірнуў, быццам мы і не існавалі зусім. От жа ганарысты!

Ішлі мы доўга. Генка часам строга пакрыкваў на Султана: «Да нагі!», «Ісці побач!», хоць ён і так ішоў каля яго нагі. Калі і вытыркаўся наперад, то на паўгалавы, не больш.

Каля аднаго дома дарогу нам перабегла штосьці шпаркае і чорнае. Султан памкнуўся быў следам, але Генка крыкнуў: «Фу! Побач! Ты што — ката зроду не бачыў?» І Султан замёр на месцы, вінавата вільнуў хвастом. Але Генка ўсё роўна памахаў пальцам перад яго носам, гаварыў яму нешта сярдзітае. Султан у адказ угінаў галаву, прыціскаў вінавата вушы.

Сур'ёзны чалавек Генка!

Потым вуліца і дамы скончыліся, пачалася роўная, зарослая нечым зямля. Колер раслін быў такі, як і ў дрэў за нашым плотам,— шэры. Я хацеў убачыць, дзе канец гэтай роўнай зямлі, і не змог: расплывалася ўсё ў вачах.

— Мой Султан ужо выконвае шмат камандаў,— хваліўся Генка ідучы.— Бачыце, можа без павадка ісці побач. Ніколі ў чужога не возьме яду, нават самую смачную. Ведае, што «Фу!» — значыць «Нельга!», «Няможна!». Скажу — палку прынясе... Во, глядзіце...— Генка падняў з зямлі нейкую крывуліну, кінуў уперад.— Султан, прынясі!

Султан ірвануўся з месца і тут жа прынёс Генку тую крывуліну. Генка пахваліў яго, пагладзіў па галаве. А Султан ужо глядзеў на яго не вінаватымі, а вясёлымі вачыма, прытанцоўваў, віляў задам. Потым стаў на заднія лапы і пхнуў пярэднімі Генку ў грудзі. Генка пахіснуўся, адступіў на крок. Здаровы Султан і на задніх нагах намнога вышэйшы за яго.

— Ты што — падурэць хочаш? — спытаў Генка.

Султан адбегся паўкругам, вушы прытуліў да галавы, павільвае і задам, і хвастом больш у адзін бок. «Правільна Генка зразумеў Султана, правільна...» — хацелася мне сказаць, але па-чалавечы я не ўмеў.

Генка крыкнуў: «Гэй-гэх!», стаў на рукі, хацеў прайсціся колам, але ўпаў. І тут жа ўскочыў, прыпусціўся за Султанам. А той уцякаў ад Генкі кругамі, выпучваў спіну і яшчэ больш выгінаўся ў адзін бок — цвяліў Генку. Потым уцякаў Генка, а даганяў Султан. Дагнаў, паваліў на зямлю. Яны пачалі валтузіцца і качацца адзін цераз аднаго, Султан нібыта кусаў Генку. Але, мабыць, Генку не балела, бо ён стаў зусім несур'ёзным чалавекам. Рагатаў, выкручваўся з-пад Султана, прыціскаў яго рукамі да зямлі. А сам Султана не кусаў.

І так мы яшчэ доўга ішлі, а Генка і Султан бегалі вакол нас кругамі. Султан увагрэўся, з разяўленага рота высунуўся і матляўся доўгі язык. У Генкі таксама быў разяўлены рот, але язык не матляўся.

— Ой, якая тут трава зялёная і мяккая! А колькі кветак! — сказаў Толя і пусціў мяне на зямлю. Коля тут жа пусціў і Боба.

Я яшчэ раз паглядзеў на зямлю, пакрытую травою. Ні якая яна не зялёная. Шэрая!

— І чырвоныя кветкі! І сінія! І белыя! — крычаў Коля, ірвучы кветкі.

Я не бачыў ні чырвонага, ні сіняга — толькі шэрае. І сям-там на гэтым шэрым былі белыя плямкі кветак — белыя я бачыў. Затое чуў я столькі ўсякіх пахаў, што ажно кружылася галава.

І ніякая трава не мяккая, яна шорсткая і калючая, рэжа паміж пальцамі. А высокая, вышэй за нас намнога, заблудзіцца можна. Мы з Бобам блыталіся ў траве, падалі, не маглі нават хадзіць, а не толькі бегаць кругамі, як Султан.

Толя і Коля пападалі на траву, схапілі нас, пачалі тузаць, калашмаціць, куляцца з намі, саджаць сабе на грудзі. А мы пішчалі, нам было не весела, а страшна. Столькі ўсяго новага, незнаёмага абрынулася на нас!

— Рэчка! — закрычаў раптам Генка і пабег яшчэ далей, а за ім Султан.

Толя падхапіў мяне пад пуза, кінуўся за ім. Мяне так трэсла, так матлялася галава — думаў, адарвецца. Пашалелі, мабыць, дзеці ад гэтай травы, ад гэтых пахаў.

І тут я таксама ўбачыў раку. Гэта такая вялікая-вялікая і бліскучая, з белымі воблачкамі вада. У шырыню я бачыў канец вадзе, а ў даўжыню — не. Вады было куды больш, чым у той лужыне, дзе мы плюхаліся з Бобам. Я нават не ўяўляў, што на свеце можа быць столькі вады.

## Прыгоды на рацэ

Нас пакінулі на беразе. Генка раздзеўся, сказаў Султану: «Вартуй!», а сам разагнаўся і скокнуў у ваду. Султан пазяхнуў на ўвесь рот і сеў каля яго адзення. Толя і Коля таксама параздзяваліся і плюхнулі ў ваду. Генка ўжо далёка плюхаўся, адна галава з вады відаць. Толя быў бліжэй да берага, а Коля плюхаўся зусім блізка. Каля самай вады трава была высокая і вострая, а

там, дзе нас пусцілі на дол, кароценькая і мяккая. Султан сядзеў і глядзеў на Генку, а на нас ні разу не глянуў. Быццам мы былі не сабачаняты, а нейкія казюлькі, дажджавыя чарвякі.

Мне захацелася зрабіць нешта такое, нешта такое... Каб хоць разочак глянуў на нас гэты прыгожы ганарысты Султан. Во зараз як тупну лапамі па гэтай вялікай лужыне-рацэ... Як плюхну! Каб і Султана апырскаць...

Я трошкі прабегся па беразе, зрабіў размiначку. Штурхнуў носам пад бок Боба: «Глядзі!» Прысеў, пагайдаўся ўзад-уперад: «Эх, раз... Эх, два-а! Эх, два з палавінкаю... Гэх!»

Далекавата скочыў. Але не ўбачыў, ці паляцелі пырскі на Султана або хоць на Боба. Плюх быў вялікі, мяне ажно аглушыла. Вада расступілася пада мною, а потым захліснула тугім холадам. Хлынула ў рот, у нос, у вушы, я адразу задыхнуўся, кашлянуў. А вада ўсё лезла ў нос і рот, я пачаў адбівацца лапамі ад яе. Біў, біў пярэднімі лапамі ваду і... выскачыў наверх! Бліснула сонца, асляпіла... Удыхнуў паветра, закашляўся мацней... А лапамі біць перастаў, і мяне зноў па-а-ацягнула на дно... Ага, значыць, вада не любіць, калі яе б'юць лапамі, яна пускае ад сябе тады, калі б'еш. І я пачаў біць лапамі яшчэ мацней: бах-бах-бах-бах-бах! І зноў выплыў, а лапамі ўжо не пераставаў біць. І нічога не бачу з-за пырскаў, не бачу берага. У вачах нясцерпна рэжа, нібы засыпаў мне іх пяском Боб.

— Булька, ты рабіў буль-буль? Булька, ты не туды плывеш!!! — спалохана закрычаў Толя.

Я, значыць, плыў?! Во здорава, ніхто мяне не вучыў, сам навучыўся.

— Султан! — крыкнуў Генка.

І тут жа штосьці моцна плюхнула ў раку.

Я чуў ззаду сябе булькатанне і цяжкі дых, але не азіраўся, плыў. «Хо-хо! Сам плыву! Сам!!!» — хацелася мне крычаць ад радасці.

І тут мяне падгушкнула вада, над галавою пацямнела. Я азірнуўся і ўмлеў: на мой загрывак апускалася разяўленая пашча Султана.

— Ма-а-ама-а! — закрычаў я ад страху і пачаў тануць.

Зубы Султана лёгенька сціснулі маю шкуру на загрыўку — пад вадою ўжо! — пацягнулі ўверх.

— Султан, вынесі яго! — скамандаваў Генка.

А Султан мо падумаў: «Прынясі!» — і паплыў да Генкі, а не да берага. Я вісеў у Султана ў зубах, мой хвосцік і ніжняя частка тулава валачыліся па вадзе.

— На бераг! На бераг, ты куды?! — зноў закрычаў Генка і паплыў насустрач нам. Даплыў, развярнуў Султана мордай да берага, і мы паплылі побач. Потым Генка пайшоў па вадзе, а Султан яшчэ трошкі праплыў і таксама пайшоў.

Султан пусціў мяне на беразе каля Боба, ступіў два крокі ўбок і страсянуўся ўсім целам. Вось гэта быў дождж! Бура! Боб віскнуў і адскочыў далей. Спужаўся... А што было б, каб ён «плюхнуў» у раку, як я?

Султан пачаў бегаць вялікімі кругамі па траве, грэцца.

Генка прысеў каля мяне, дрыжыць. Толя вылез, прысеў каля мяне і таксама дрыжыць, зграбае з мяне рукою ваду. І Коля нагнуўся нада мною, глядзіць, і Боб забег за яго, паглядвае на мяне з-за Колевай нагі. А мне зрабілася вельмі

холадна, я калаціўся ўвесь, да самага кончыка хваста. У грудзях дзерла і душыла, было млосна: наглытаўся вады.

— Прастудзіцца, герой...— сказаў Генка.— У запазуху трэба яго.

— Няма запазухі, майка мокрая — Султан апырскаў,— сказаў Толя.

— Коля, у цябе сухая, пакладзі Бульку ў запазуху або дай Толю майку,— загадаў Генка.

— Ай,— перасмыкнуў Коля плечуком, забраў Боба з-пад ног і пайшоў берагам.

Я зразумеў, што Коля мяне не любіць. Ці любіць ён свайго Боба?

— Бяры маю, калі ён такі,— сказаў Генка і ўзяў з кучы адзення сваю майку.

— Пальма бяжыць! — раптам закрычаў Коля і паказаў на луг.

Я яшчэ не бачыў нашай мамы Пальмы, але зарадаваўся: от каб цяпер смактануць цёпленькага малачка! Адразу б сагрэўся.

— Пальма! Пальма! — крычаў радасна Толя, падскокваючы, і надзяваў Генкіну майку. Надзеў — яна была яму да самых каленяў.

— Па слядах знайшла! — сказаў Генка.— Ай, малайчына!

Толя падняў мяне, і я ўбачыў, як падбягае мама. Яшчэ здалёк яна віляла і хвастом, і задам, згіналася ў адзін бок, прыціскала вушы. Радавалася сустрэчы, вітала ўсіх-усіх.

Якая цудоўная ў нас мама Пальма! Прыбегла па нашых слядах аж на рэчку.

А Генка гаварыў, што наша мама «невядома хто» і мы самі непародзістыя. Яшчэ ж якая пародзістая мама! Ад радасці я нават дрыжаць перастаў.

## «Дзеці, паздароўкайцеся з бацькам!»

Толя сунуў мяне пад майку і ўздрыгнуў ад холаду: «Ва-ай!» А тут і мама Пальма падбегла. Я пачуў яе цяжкі дых, чуў, як свішча яе хвост, рассякаючы паветра. Я затузаўся пад майкаю, хоць мне і прыграваў бок Толеў жывот. «А-ай!» — крыкнуў Толя, выцягнуў мяне са схованкі. Незнарок я шкрабнуў яго лапаю.

— Дарэмна майку намачылі. Аддавай Бульку Пальме, яна абсушыць яго і абагрэе,— сказаў Генка.

Як цяжка дыхала наша мама! Які вялікі ў яе язык! Не меншы, чым у Султана.

Вярнуўся Коля з Бобам, і ўсе дзеці пасталі наўкол нас, глядзяць на Пальму, глядзяць на мяне. І Султан глядзеў. Ён ужо ціха ляжаў на беразе, паклаўшы галаву на выцягнутыя лапы, вочы зрэдку ляніва прыжмурваліся.

Мама адразу пачала мяне аблізваць. Лізне, лізне, падыхае разяўленым ротам, паматляе языком — «Ах-ха! Ах-ха!», зноў паліжа, зноў — «Ах-ха!». Бакі яе надзімаюцца-ападаюць, надзімаюцца-ападаюць...

— Чаго глядзіш так? — сказала мне мама.— Сабакі не пацеюць, яны языком ахалоджваюць сябе, каб не перагрэцца.

І зноў лізала мяне, зноў дыхала. Потым легла на бок, каб я хутчэй прыпаў да сусолкі. А мяне і ўпрошваць не трэба. Боб таксама затузаўся на руках у Колі, хоць не купаўся і не дрыжаў. Коля падклаў і яго.

Мне стала цёпла з усіх бакоў, і ў жывоціку так добранька стала. І я задрамаў.

А як прачнуўся, то нікога з дзяцей каля нас не было. Уставаць ад мамінага жывата не хацелася. Якое шчасце, што ёсць на свеце мама!

— Ну — што, не прастудзіўся? — спытала ласкава мама і прытуліла свой нос да майго носа.— Не, здаецца, не гарачы... От жа дурненькі, га? Гэтак і ўтапіцца нядоўга — мне Султан пра ўсё расказаў.

— Мама, а я не лазіў у раку,— пахваліўся Боб.

Але маме чамусьці не спадабалася гэта.

— Ну і добра, добра...— буркнула яна.— Дзеці, паздароўкайцеся з бацькам!

Я ўскочыў на ўсе чатыры лапы, нават вушы сталі тарчма.

— Дзе?!

Акрамя Султана, які сядзеў крокі за два ад нас, больш сабак не было. Зводдаль стаялі каля ракі Генка, Толя і Коля, яны трымалі ў руках нейкія доўгія і тонкія палкі.

— Ды не круці галавою... Во ён, во — Султан!

Султан у гэты час знарок абыякава пазяхнуў, крутнуў галавою, нібы адганяў муху. Зноў стаў глядзець нібыта міма нас. Але вочы яго былі добрыя, ласкавыя, і ён усіх-усіх нас бачыў.

Я кінуўся да яго...

Мама вучыла: калі знаёмяцца з добрым сабакам ці сустракаюцца з сябрам, трэба віляць хвастом, старацца лізнуць яму куточак рота, панюхаць хвост.

Я падскочыў раз, другі — не дастаць да морды Султана. А ён і не думае падстаўляць яе, каб лізнуў, задзірае яшчэ вышэй. Не мог я і хвост яго панюхаць — Султан сядзеў на ім. Тады з радасці я пачаў рабіць тое, што ў галаву прыйшло: абды-

маў сваімі лапкамі яго тоўстыя і высозныя лапы, штурхаў іх носам і грудзьмі, злёгку пакусваў. Султан пераступаў з лапы на лапу, нібы знізу яму пякло ў падушачкі, вырываў. Але не гыркаў, цярпеў! Шкуру на лобе не моршчыў, толькі злёгку прыжмурваў куточкі вачэй.

А Боб дапоўз да морды Султана, падцінаючы хвост, угінаючы галаву, і брыкнуўся на спіну. Прыціснуў да тулава лапкі, пусціў фантанчык...

— Фі-і... Ды яны ў цябе зусім не выхаваныя! — незадаволена буркнуў Султан.— Ці вучыла ты іх?

— Вучыла таму-сяму. Усяго ж адразу не схопіш. З бацькам, праўда, не вучыла сустракацца,— сказала мама.

— Не верыцца,— зноў буркнуў Султан.

— А што ты ад іх хочаш — малыя яшчэ.

Султан нарэшце вырваў лапы з маіх абдымкаў, устаў на ўсе чатыры.

Я пачаў бегаць паміж імі васьмёркай, стукацца лбом, бакамі — нібы заблудзіўся сярод чатырох дрэў.

А Боб ужо сядзеў на хвосціку і жаласліва павісквау, пазіраючы ў вочы бацьку: чакаў ад яго ласкі.

— Ну — хопіць. Бачу, што ты іх песціш,— Султан рашуча пайшоў ад нас да Генкі.

Я прабег крыху за ім, учапіўся зубамі за хвост. Султан тузануўся, вырваў хвост і нават не азірнуўся.

Сур'ёзны і строгі Султан... Не хоча з дзецьмі пагуляць.

Боб клубочкам круціўся на беразе, хацеў ухапіць сябе за хвост. Мо здурэў ад радасці. І да таго дакруціўся, што таксама плюхнуў у ваду. Праўда, каля самага берага, на мелкім.

Я вярнуўся да мамы. Мне чамусьці зрабілася нявесела. Мама вінавата вільнула мне хвастом.

І гэта ўсе сабачыя таты такія? Усе не прызнаюць сваіх дзяцей?

## Другі мамін урок

Нас прынеслі з рэчкі, паклалі ў будку. Адразу ўскочыла да нас мама.

— Сораму колькі набралася... Перад бацькам асаромiліся! — не магла яна супакоіцца.— Ніякай павагі да бацькі!

— Мама, а я з павагай поўз да яго,— падлез бліжэй да мамінай морды Боб, лізнуў яе ў куточак рота.

— А ты ўвогуле падхалім. Дагары брыкнуўся, жывот выставіў! Скажы ты, і вучыць гэтаму не трэба... Ды ведаеш ты, што так робяць толькі слабакі і палахліўцы? І толькі перад вельмі заядлым, вялікім і страшным сабакам, калі адразу відаць, што не пераможаш яго. Запомніце, калі давядзецца з кім схапіцца: жывот і шыю, гарляк беражыце ў першую чаргу. Ну, а калі выстаўляеш жывот ды яшчэ і лапкі падціскаеш — значыць, здаешся на літасць пераможцы. Бывае, што гэта адразу абяззбройвае і ўлагоджвае ворага. Але не заўсёды, чуеце?

— Чуем, чуем!

— Каторы сабака можа і кішкі выпусціць...

— Мама, а хіба Султан вораг? — спытаў я.

— Кажу, ён ваш бацька.

— А ты казала, што дарослыя сабакі не крыўдзяць малых,— успомніў Боб.

— Дык то ж малых. А вы ж не заўсёды будзеце малымі.

— Мама, а тата — хто такі? — спытаў я.

— Бач ты іх... З вамі ўжо цяжка збрахацца. Каб вы былі такія, як Султан, то лепшага я і не хацела б. Ён і прыгожы, і смелы, і сэрца ў яго высакароднае, добрае. Гэта выхаваны сабака, не такі, як вы — парасяты...

— Мы сабачаняты! — раптам заганарыўся Боб, хоць ні ён, ні я яшчэ не ведалі, хто такія парасяты. Чулі, што ёсць свіння з парасятамі ў дзеда Антона і бабы Ганны, але яшчэ не бачылі іх.

— Выхаваны! А сваіх дзяцей не любіць! — не мог я забыць сваю крыўду.

— Любіць. Толькі так заведзена ў сабак-бацькоў — не падаваць выгляду, што любіш. Суровае выхаванне, каб і вы былі суровыя, мелі цвёрды характар. А што тата не з намі — такая завядзёнка ў сабак, такі закон. А вось у нашых дзікіх сваякоў, у ваўкоў,— не так. Яны ў лесе жывуць... Лес — гэта многа-многа дрэў... Сосны, бярозы, елкі, дубы... Дык ваўкі сем'ямі жывуць, з бацькам. І дзеці доўга пры бацьках жывуць, старэйшы вывадак і малодшы — разам.

— А для чаго мы на свеце жывём? — спытаў я.

— Ух ты, разумнік мой! — лізнула мяне мама.— Ты ўжо такія пытанні задаеш? Значыць, расцяце вы, сталееце. Гэта вельмі добра, вельмі добра...

Мама памаўчала, задумалася.

— Памагаць чалавеку — вось для гэтага мы і жывём,— сказала яна.— Мы, простыя сабакі, ахоўваем дом чалавека, яго жывёлу, маёмасць, дзяцей. А чула я ад Султана — ён у горадзе да двух гадоў гадаваўся... Чуў ён, што ёсць сабакі-пастухі,

ездавыя сабакі... Запрагаюць сабак у лёгкія сані і ездзяць на іх там, дзе вельмі холадна, снег і лёд.

Мама растлумачыла нам, што такое сані, снег і лёд, і расказвала далей:

— Ёсць яшчэ сабакі-пагранічнікі, сабакі-сышчыкі... Па следу могуць знайсці чалавека. Гэта вельмі вучоныя сабакі, спецыяльную школу канчаюць...

— У сабак таксама ёсць школы?! — выгукнулі мы з Бобам радасна. Вось бы і нам павучыцца ў іх! Толя, Коля і Генка пойдуць у сваю школу, а мы — у сваю.

— Ёсць сабачыя школы, ёсць,— сказала мама.— Але вучыцца можна не толькі ў школе.

— Мама, а ты таксама добры сышчык! Ты знайшла Толю і Колю, нас знайшла каля ракі! — Ад радасці я залез на маму, каб лізнуць ёй куточак рота. Але пакаўзнуўся і з'ехаў са спіны, як з горкі.

Гэта мне спадабалася.

— Ну-у, скажаш... Які з мяне сышчык! — засаромелася мама.— Да сышчыка яшчэ далёка. Але мы, звычайныя сабакі, павінны ўмець усё.

— Значыць, мы лепшыя за пародзістых? Ура! — Я зноў палез на маму, зноў з'ехаў. За мною — Боб.

— Перастаньце, бок мне аблузаеце... Паслухайце лепш, што Султан аднойчы ў тэлевізары бачыў... У Генкі тэлевізар ёсць...

— А што такое тэлевізар-р-р? — «Р» прагучала ў мяне раскацiста, нібы ў дарослага сабакі.

— Гэта такая будка, закрытая з усіх бакоў. Там, дзе лаз,— шкло, падобнае на лёд. Хаця ж вы і лёду не бачылі... Ну, такое шкло, як у акне ў чалавечым доме... Блішчыць, як лужына на сон-

цы. Ага... І ў гэтым шкле паказваецца ўсё, што на свеце ёсць, толькі яно не пахне. Адзін цень... Чую аднойчы, кажа Султан, брэх у хаце... «Незнаёмы сабака забраўся?!» — падумаў і як кінецца ў дом. Ну, думае, правучу зладзюгу... Забег у другі пакой дома, а там тэлевізар свеціцца і Генка сядзіць, глядзіць тэлевізар. А ў тэлевізарным шкле — цені сабак. І во дзіва: цені, а брэшуць! І цені людзей, а гавораць! То якіх толькі сабак Султан не нагледзеўся ў тэлевізары — і вялікіх, і малых, і кудлатых, і гладкіх, з доўгімі мордамі і з кароценькімі, з хвастамі і без хвастоў...

— А як жа яны без хвастоў размаўляюць з іншымі сабакамі? — здзівіўся я.

— Не ведаю. Калекі — што з іх возьмеш... Ага, дык у тэлевізары яшчэ паказвалі, як сабакі параненых людзей ратуюць, як сляпых водзяць за сабою. Потым паказвалі сабак у светлых пакоях, а на іх наблытана нейкіх дратоў, трубак, рамянёў... Вакол сабак ходзяць людзі ў белым, штосьці робяць з імі... І яшчэ паказвалі, як сабакі з неба спускаюцца ў круглай будцы. Белка і Стрэлка звалі тых сабак...

— Такога не можа быць! — сказаў Боб.

— Не, не можа! — сказаў я.

— Можа! Султан не будзе хлусіць, не такі ён. Сабакі многа ў чым людзям памагаюць. Нашага розуму не хапае, каб зразумець усё. Але запомніце адно, дзеці: галоўнае ў нашым жыцці — служыць людзям, служыць сумленна. Людзі — нашы сябры.

— Усе-ўсе-ўсе?! Нават чужыя? А на каго ж тады брахаць? — засыпалі мы яе пытаннямі.

— Гм... Кгм...— пакашляла мама.— Зноў вы мяне падлавілі. Ну, вядома, не ўсе... Але добрых людзей, нашых сяброў, куды больш, чым кепскіх.

— Генка казаў, што сабаку трэба толькі свайго гаспадара любіць...— уздыхнуў з жалем Боб.— А мне хочацца любіць усіх-усіх!

— Чаму — толькі любіць?— сказала мама.— Можна яшчэ і проста сябраваць, паважаць, проста мірна жыць з тым ці іншым чалавекам. А некаторых даводзіцца і цярпець, хоць і не любіш, ненавідзіш. Нядобра, калі адразу пускаеш у ход зубы.

Я цяжка ўздыхнуў: як ва ўсім разабрацца, пазнаць, хто які ёсць?

## Толя прапаў

Два дні мы не бачылі ні Толі, ні Колі, ні Генкі. Прыходзіў да нас толькі дзед Антон. Ён надзеў і зашпіліў маме на шыі аброжак, і яна не магла нікуды пайсці пагуляць. Ляжала ў будцы сумная, і мы ўвесь час лезлі да яе пасмактаць малака — хацелася есці. Але малака было мала, і мама нават гыркала на нас: «Адчапіцеся!» Кожны раз, як вылазіла яна з будкі, вылазілі і мы, пачыналі бегаць наўкол яе, калі клалася на зямлю — карабкаліся ёй на спіну.

— Мама, а нашто табе пачапілі на шыю аброжак з ланцугом? — спытаў я.— Такі цяжкі, халодны...

— Гэта ўзнагарода за добрую службу,— сказала яна сумным голасам.— Бываюць аброжкі і без ланцугоў, з шырокімі нагруднікамі. На гэтыя

аброжкі і нагруднікі таксама чапляюць бліскучыя жалезкі-цацкі. Жэтоны называюцца, медалі — узнагароды...

— А табе скора прычэпяць медалі? — спытаў Боб.

— Як заслужу — прычэпяць.— Мама ўздыхнула і дадала: — Медалі больш пародзістым даюць, хто больш прыгожы, статны. На сабачых выстаўках гэта бывае...

І нам зрабілася нядобра, сумна. Чагосьці не хапала. Мы скуголілі, не знаходзілі сабе месца. Мо таму, што былі галаднаватыя? А мо таму, што даўно не бачылі Толі і Колі? Дзе яны падзеліся? Прапаў мой Толя...

Зноў прыйшоў дзед Антон. Прынёс нешта цвёрдае і пахучае маме і ў шкляным посудзе белай вады, падобнай на малако. Пакуль наліваў у металічную маміну міску гэтую белую ваду, мама з'ела той пахучы кавалак і пачала хлябтаць белую ваду, аблізвацца.

— Ты не вельмі, не вельмі... Гэта малако не для цябе,— адсоўваў рукою яе пысу дзед.— Гэта малым... Булька! Боб! Хадзеце сюды...

Дзед злавіў за вуха мяне, тыцнуў мордачкай у малако.

— Еш, Бобка, еш! Сма-а-ачна!

Я супраціўляўся — я ж не Боб! І не мог паверыць, што малако можа быць і не ў маміных сусолках. Задыхнуўся, пачаў тапіцца ў талерцы... Успомніў, як адбіваўся ад вады ў рацэ, і плюхнуў лапамі. Пырскі паляцелі ва ўсе бакі, трапілі на маму і на дзеда Антона. Я запырхаў, закашляўся.

— Чаго ты адбіваешся? Дурны, ты спачатку рассмакуй добра...

Дзед пусціў мяне, выцяг з будкі Боба, сунуў і яго пысаю ў міску.

— І ты, Булька, вучыся есці, хоць ты і тоўсты.

А тады зноў мяне... Я аблізнуўся — нічога, можна есці.

— Ну — самі цяпер вучыцеся...— сказаў дзед Антон.— А мне няма калі. Пахварэлі Толя і Коля... Гэта ж трэба — купацца надумалі ў такой халоднай вадзе. Добра, што яшчэ не патапіліся!.. А вечарам карова прыйдзе, цёплага малачка прынясе.

Дзед Антон пайшоў.

— А што тут за навука? — гаварыла мама і не пераставала хлябтаць.— Складвайце языкі лыжачкамі і хуценька зачэрпвайце. Во так — хлёб-хлёб-хлёб...

Паспрабаваў я — атрымалася. Паспрабаваў Боб — не вельмі.

— Што ты смокчаш, цэдзіш праз зубы? — сказала яму мама.— Гэта ваўкі смокчуць. А ты сабака, ты павінен хлябтаць... Вось так... вось... Вось так, так, так... Так, так, так...

Я пачаў хлябтаць хутчэй, але язык скора самлеў, перастаў слухацца.

Пакуль мама добра паказала, як хлябтаць, і малако скончылася. Мы аблізалі пустую міску — лізаць мы ўмелі добра.

Праўда што — смачна! Хутчэй бы настаў той вечар, прыйшла карова. Я яшчэ ні разу не бачыў каровы, не бачыў, як яна прыходзіць і раздае малым — дзецям і сабачанятам — малако.

У будку не залазілі, да мамы не прытуляліся — і так цёпла было. Мы сядзелі і з усёй моцы намагаліся, каб не заснуць, не прапусціць той

момант, калі прыйдзе карова. Але засыналі, прачыналіся, зноў засыналі...

Раптам чуем — рыпнулі варотцы. Бачым — з вуліцы на двор заходзіць чалавек, у руцэ ў яго нейкая скрынка з крыжам на бакавіне.

— Карова ідзе! — Сарваўся з месца і пакаціўся клубочкам Боб.

— Малако нясе! — Прыпусціўся следам і я.

— Стойце! Якая ж гэта карова! Гэта чалавек, доктар! — брахала мама ўслед.— Карова вялізная, у дзверы дома мо не ўлезе! І на чатырох нагах!

Мы не дабеглі да ганка. Чалавек-доктар дайшоў хутчэй, расчыніў дзверы і знік у доме.

А мы паселі на хвосцікі, аблізнуліся.

— Вяртайцеся, дурні, не смяшыце людзей... Кажу — гэта доктар. Ён будзе лячыць Толю і Колю! — гаварыла нам ад будкі мама.— Гэта добры чалавек, я ведаю. Ён і летась прыходзіў лячыць Толю і Колю і да дзеда з бабаю ходзіць...

Я неахвотна патрухаў да мамы. Боб застаўся каля ганка, не верыў, мабыць, маме. Сядзеў і глядзеў на дзверы.

І доўга мы так сядзелі — Боб каля ганка, а я каля мамы. Урэшце дзверы дома расчыніліся. Выйшлі на ганак доктар і дзед Антон.

— Не хвалюйцеся і цётку Ганну супакойце. Колю можна выпускаць гуляць. А з Толем горш. Я яшчэ заўтра зайду, паслухаю... Баюся, каб запалення не было. Заставайцеся здаровы!

— То дзякуй вам вялікі. Хадзеце і вы здаровыя! — сказаў дзед Антон.

І яны падалі адзін аднаму рукі. Такая звычка ў людзей — рукі падаваць. І наша мама ўмее, я бачыў, як яна падавала лапу Толю. «І я навучуся!» — думаў я.

Толькі доктар сышоў з ганка, як Боб кінуўся яму пад ногі. Стаў лашчыцца, угінацца — добры ж чалавек доктар, ён ужо вылечыў Колю! Боб забег доктару наперад, брыкнуў на бок, а потым дагары.

— Гэ-э, дык гэ-эта ты та-а-ак?! — сказаў працяжна доктар.— Ах ты, падхалімская твая душа...

Ён падняў з зямлі тоненькі дубчык і некалькі разоў сцебануў Боба.

— Ай-яй! Ай-яй-яй! — усхапіўся той на ногі, завішчаў, залямантаваў на ўсё горла. Здурнеў ад болю і страху, не ведаў, куды ўцякаць. Наткнуўся на плот, павярнуў потым да будкі, да нас.

— Я табе! Я табе! — затупаў для страху доктар, паляпаў рукою па назе.

Мама Пальма не вытрымала, браханула на яго.

Загаўкаў і я — першы раз у жыцці. Тоненька, нібы кураня запішчала.

Боб з енкам шмыгнуў у будку, у самы цёмны куток.

## Шчаняча-парасяча-кашэчыя канцэрты

— За што-о-о... ён мяне-е? Я ж не ўкусіў яго-о-о...— тоненька скавытаў у куточку Боб.— Я лізнуць хацеў! Я прылез да яго.

— Дзе баліць? Тут? — Я палізаў яму бачок.— Тут? — палізаў спінку.

— Ай-і-і-і-і... Ай-і-і-і-і...— плакаў Боб, на мае пытанні не адказваў.

Загрукала ланцугом па дошках, залезла ў будку мама.

— Праўда, мама, за што? Такі добры чалавек — і б'ецца.— Я лізаў Бобу бачок, і мне такса-

ма хацелася плакаць. На бачку Боба ўспух рубец-гузак.

— Ну, хопіць канцэртаў! Сам вінаваты...— сказала мама.— «Падхалімская душа...» Я даўно прыкмеціла гэта ў тваім характары. А тут і чалавек пацвярджае, значыць, праўда. Хіба ж можна да ўсіх аднолькава лашчыцца? А ты на жываце поўзаеш, прыніжаешся, дагары пераварочваешся... Цьфу, брыдота! І што з цябе за сабака вырасце, калі няма ніякай сабачай годнасці! Вы ж бы з Султана бралі прыклад!

Боб ужо не ўсхліпваў — вінавата маўчаў. Маўчаў і я, думаў над мамінымі словамі. Як усё няпроста ў жыцці, як цяжка разабрацца, што добра, а што кепска. Доктар адлупцаваў Боба — гэта дрэнна? Здаецца, дрэнна, а як падумаеш, то і добра, варта яму даць. Трэба кідаць нядобрыя звычкі. А мы ж хочам вырасці сапраўднымі сабакамі, каб не сорамна за нас было бацькам — ні маме, ні Султану.

На двары пачуліся знаёмыя галасы: Колеў і бабы Ганны.

— Ты ж нікуды з двара не хадзі! І не бегай моцна! — гаварыла баба Ганна.— А то нахапаешся ветру, яшчэ горш горла забаліць.

— Бабуля, а пакажы мне свінню і парасятак! Я так даўно не бачыў парасятак! — прасіў Коля капрызным голасам.

— Пакажу, пакажу... Зараз выпушчу, хай пабегаюць. Паглядзі, ці добра зачынены варотцы на вуліцу. І дзірку пад варотамі дошкаю закладзі!

— Добра! — Колеў голас аддаліўся.

— І глядзі, каб не лез да свінні! — папярэдзіла баба Ганна.

Мы выглянулі — Коля ўжо бег да нас ад вулічных варот, зрабіў тое, што прасіла баба. На шыі ў яго быў завязаны тоўсты калматы аброжак. Дабег да будкі, схапіў Боба.

— Бобка, ты плакаў? Ты плакаў, Бобка? — пасадзіў яго на левую руку, гладзіў праваю, прытульваўся шчакою да яго спінкі.

Добры ўсё-такі і Коля!

Недзе за будкаю былі дзверы ў хлеў, там грукала баба Ганна. І раптам адтуль пачулася — «В-вух!» — і цяжкі тупат, рохканне. Спалохалася курыца, з крыкам пераляцела цераз плот. Міма будкі прамчалася па двары штосьці белае, тоўстае і вялізнае — ажно зямля задрыжала. «Свіння!» — здагадаўся я. За ёю сыпанулі, замільгалі тоўсценькія, кругленькія свіняняты... Парасяты, значыць... Каля варот на вуліцу свіння рэзка спынілася, узрыла нагамі зямлю. Парасяты — каўзель, каўзель! — не паспелі затармазіць, мякка зашлёпаліся ў вароты. Некаторыя з разгону садзіліся на хвосцікі і ехалі. Гэтак тармазілі.

«Гух!» — скамандавала свіння і першай ірванула назад. «Кхру! Кхру!» — зачмыхалі парасяты, нібы таксама напалохаліся, і прыпусцілі ў наш бок. Праляцелі міма будкі, ажно пылам і ветрам дыхнула нам у вочы. Коля прытуліўся да самай сцяны, я і мама шмыганулі ў будку, потым зноў выглянулі. Тупат заціх каля ўвахода ў хлеў. «Гух!» — зноў спалохана рохнула мама-свіння, зноў усе тупацяць, імчацца да вуліцы...

— Трэніроўка! Ха-ха! — сказаў Коля. — Размінка! Мама Пальма буркнула:

— Не разумее свінячай мовы... «Гух!» — гэта ў свіней сігнал трывогі. Вучыць малых ратавацца ад небяспекі.

Чацвёрты раз свіння не пабегла па двары. Пайшла спаважна, стомлена дыхаючы, нюхаючы зямлю. Штосьці падбірала, рыла носам зямлю. Парасяты беглі ўроссып, іх было многа, больш, чым кіпцікаў у мяне на пярэдніх лапах. Во, каб у мяне было столькі брацікаў і сястрычак! Што б я рабіў? Парасяты ўсюды лезлі, усё нюхалі, калупалі. Мордачкі іх па самыя вочы парабіліся чорныя, мурзатыя.

Мама Пальма схапіла зубамі сваю міску, схавала ў будку. Коля ўскочыў з Бобам на ганак — таксама спужаўся свінні. А свіння ўсё бліжэй да будкі, бліжэй... Чмыхае так, што з-пад носа ў бакі ляцяць пыл і смецце. Ляпае ротам, цмокае гучна, аж брыдка слухаць. Вялікая свіння, у два разы большая за нашу будку. Вой, а якія парасяткі смешныя! Мордачкі на канцах нібы адсечаныя, а на нагах усяго па два касцяныя пальцы... Не, ёсць яшчэ па два, запасныя. Яны меншыя і прычэплены высока ззаду ножак. Нашто ім гэтыя запасныя пальцы, калі яны не дастаюць да зямлі? А хвосцікі якія! Не на спіну закручаныя, не абаранкам, а нібы завязаны ззаду вузельчыкам.

Раптам пачуўся страшэнны віск-лямант. Ад страху ў мяне шэрсць на загрыўку стала дыбам, захацелася выць. Свіння зарохкала і пацялёпкалася на той крык — бяда! Мама Пальма вылезла з будкі і загаўкала. Вылез і я. Бачу — Коля хаваецца з крыкам у дзвярах дома: «Дзядуля! Дзядуля!» Бачу — адно парася ўшчаміла галаву паміж дошак, а назад не можа выцягнуць, вушы не пускаюць. Вішчыць!!!

З дома выбеглі дзед Антон з жалезнай палкай, і баба Ганна без нічога, і Коля з Бобам. Свіння не

хацела падпускаць дзеда да парасяці, задзірала галаву, каб укусіць. Але дзед Антон моцна ляпнуў ёй па баку — «Аюсь!», і тая адступіла крыху. Засунуў жалезную палку ў плот — р-раз! Адна дошка адарвалася, парася вырвалася і пабегла, круцячы галавою.

Мы з мамаю таксама закруцілі галовамі, пачухалі лапамі вушы. Ух, ледзь не паглухлі...

«Бах! Бах!» — дзед зноў прыбіў дошку і пайшоў у хату. А баба заняла свінню з парасятамі, пагнала ў хлеў. Так ім і трэба, калі не хочуць гуляць па-добраму, лезуць абы-куды.

Коля прынёс Боба да нас. Надрапаў на зямлі палкаю нейкія клеткі і заскакаў па іх на адной ножцы.

На двары зрабілася ціха-ціха, не верылася нават, што на свеце можа быць такая цішыня. Але так было нядоўга. Хутка за плотам у агародзе пачаўся яшчэ адзін канцэрт.

— У-у-у-у-у-у-у-у-у-у-у-у-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-у-у-у-у-у-у! — вёў гнусліва, пагрозліва адзін голас.

— У-у-у-у-у-у-у-эў-эў-эў-ы-ы-ы-ы-ы-ы-у-у-у-у-у! — яшчэ больш агідна і пагрозліва цягнуў другі.

— Каты,— сказала мама.— Гэта надоўга. Могуць цэлую ноч выць, хто каго перавые. Гаў! Гаў! Гаў! — пачала яна страшыць іх.

Коля перастаў скакаць па сваіх клетках, падняў грудку зямлі і шпурнуў пад дрэвы, у агарод — «Апсік!». Потым кінуў у катоў палку, якою драпаў зямлю.

Не, не спужаліся і не перасталі.

— У-у-у-у-у-у-у-у-у-у-у-у-у!

— Уы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы!

— Сілу адзін аднаго выпрабоўваюць, страху наганяюць... От дурні! — абуралася мама.— Не,

каб кінуцца ў бойку, перамагчы ў сумленным баі. Гаў! Гаў! Гаў! Разыдзіцеся!

Каты хоць бы што — выюць!

Выйшла з хлява баба Ганна. Хуценька пратупала да дзвярэй у дом, вынесла вядро вады — ш-ш-шух за плот!

Каты пырснулі ў розныя бакі. Адзін з іх быў чорны, а другі пярэсты.

Ф-фу, адлягло ад вушэй... Ну і шумны сёння дзень!

## Страшыдла з іклямі на лбе

Звычайна мы пад вечар засыналі. Не вытрымлівалі — за дзень так натомішся, набегаешся, ажно костачкі гудуць. Вось чаму яшчэ ні разу і не бачылі, як прыходзіць карова.

А сёння дачакаліся змяркання. З-пад сцяны хлява павылазілі нейкія маленькія пляскатыя стварэнні. Ножкі ў іх кароценькія, крывыя. Яны таму не бегаюць, а скачуць: скок, скок, шлёп, шлёп жыватом аб зямлю. Пасядзяць, адпачнуць, падумаюць і зноў — шлёп, шлёп. Адну жывёлінку мы запынілі з Бобам, не далі схавацца ў агародзе.

— Гэта жаба, не чапайце,— сказала мама.

А Боб зайшоў спераду жабы і прылёг на пярэднія лапы, нюхаецца з ёю, павільвае хвосцікам, чмыхае. Я павярнуў жабу лапаю дагары жыватом — мяккая, як падушачка. Жаба — круць! — легла зноў на жывот.

— Пусціце, яна маленькая. Яшчэ незнарок задушыце... Вы ж не каты, каб гуляць з жабамі! — зноў сказала мама.

Пусцілі, вярнуліся да будкі. І тут чуем — р-р-рып!

Варотцы на двор самі адчыніліся. Не, не самі! Іх адчыніла страшным вялікім зубам-іклам тое, што прасунулася ў гэтыя варотцы. Звер быў вялізны, чараваты, а з ілба тырчалі не адзін, а два страшныя іклы. Доўгія, даўжэйшыя мо, чым я ці Боб.

Мы адразу прыселі, як нас вучыла мама, потым прылеглі, падабралі пад сябе лапы, падрыхтаваліся скочыць... А той звер усё бліжэй, бліжэй... Ой, якая галава ў яго — ледзь не з нашу будку! Якія ноздры на пысе, які рот! І іклы, іклы... Я ніколі не бачыў такіх зvirроў-страшыдлаў, каб у іх тырчалі іклы не з рота.

Страшыдла наблізілася да ганка, мінула ганак... «М-мы-ы-ы!» — сказала паціху. Мо крокаў тры не дайшло да будкі, павярнула да нас галаву і раўнула так аглушальна, што і я, і Боб кінуліся ў будку, душачы адзін аднаго. А мама Пальма, наадварот, вылезла з будкі, грукаючы ланцугом, пацягнулася, пазяхнула і прывітальна памахала страшыдлу хвастом. Дык яны добрыя знаёмыя?! Мо нават сябры?! Ну і смелая ж наша мама — сябруе са зверам, які называе сябе не «я-я-я», а «мы-ы-ы».

— Гэта карова,— сказала мама.— Чаго вы, дурненькія? Яна не кусаецца...

Выйшла баба Ганна з вядром. Падышла да каровы, прысела каля яе жывата, памыла сусолкі. «Дзынк... Дзынк... Дзэнк... Дзонг!»—пачуліся дзіўныя гукі. Нібы пад моцныя струмені дажджу трапіла маміна міска-бляшанка. Запахла на двары смачна-смачна, ажно ў маім жывоціку заціўкала і завурчала.

— Карова малако прынесла, Боб! — здагадаўся я.— Бяжым!

Мама Пальма ўжо сядзела злева ад бабы. Мы з Бобам паселі справа. Мы бачылі, як з-пад бабіных пальцаў выляталі белыя струмені і ўсё больш глуха плюхалі ў вядро: «Клёўх-х... Блё-ёўх-х...»

Выбег з хаты Коля з дзвюма конаўкамі ў руках — і зразу да бабы. Падаў пасудзінкі, стаіць каля нас, таксама аблізваецца.

— Баба, з пенкаю малачка нарабі! З пенкаю! — гаворыць ён.

Баба Ганна нацыркала адну конаўку, падала Колю. Ён тут жа выпіў, крэкнуў ад смакаты. Усе губы і нос у яго былі ў белай пене. «Угу-гу-гу!» — патрос ён галавою, вызверыўся на нас, каб настрашыць. А мы не збаяліся, нам было весела. Баба падала яму другую конаўку, але ён не піў яе, выцерся і панёс асцярожна малако ў дом. Мабыць, Толю.

Доўга даіла карову баба Ганна. Мы думалі, што і канца гэтаму не будзе. Бочка з малаком, ды яшчэ на нагах...

Але баба надаіла толькі вядро малака і ласкава ляпнула карову па баку: «Хадзі здаровенька...» Ну і праўда, хопіць з нас і таго, што баба надаіла, хай нясе малако далей, па чужых дварах. Але карова не пайшла з двара, а паволі і стомлена патупала ў хлеў.

— Карова не ўсіхная, а наша! Го-го-го! — радасна залямантаваў мне ў вуха Боб.

— Аглушыў, дурань,— пачухаў я вуха лапаю.— У кожным двары свая карова мыкае — хіба не чуеш?

Баба Ганна плюхнула нам у міску малака і пайшла. А мы пачалі хлябтаць — усе ўтраіх з

аднае. Цеснавата было, але мы ўсё роўна так стараліся з Бобам, так стараліся... І пырхалі, і задыхаліся, а тут яшчэ беражок міскі высокі, націскае на горла... Языкі памлелі, хлебчучы. Але ўрэшце малако скончылася. Мы з Бобам аблізалі адзін аднаму пыскі, уздыхнулі: «Ах, якая добрая карова!» Стогнучы, папаўзлі да будкі. Нашы жывоцікі шморгаліся па зямлі, ногі не трымалі ад стомы.

## Мы адкрываем страшную таямніцу

Спаў я без усякіх сноў.

Калі ўрэшце лыпнуў вачыма, было зусім светла і сонечна. Дзесьці сакаталі куры, ціўкалі кураняты, пішчалі на дрэвах яшчэ нейкія птушачкі. Не чуваць было толькі свінні з парасятамі, каровы, людскіх галасоў. Не чуваць крыкуна пеўня...

Цудоўны сёння дзень, сонечны... Хіба можа быць у такі дзень кепскі настрой? А ў мяне ён быў. Мы з Бобам вылезлі з будкі, агледзеліся. Мамы нідзе не відаць, пры самай сцяне ляжыць аброжак і ланцуг. Хто яе зноў спусціў з ланцуга? Мо Толя і Коля? Мо паправіліся ўжо абодва? Няма майго Толі, зусім я засумаваў без яго... Я лёг на жывот, паклаў галаву на лапы і трошкі паскавытаў.

У кутку двара, каля варот на вуліцу, стаіць машына. Машына — гэта такая вялікая будка або хата на колах. Машыны ўмеюць каціцца на колах па зямлі, мы бачылі ўжо такія і яшчэ большыя на вуліцы. Яны злосна вурчаць, падыма-

юць пыл і смуродзяць дымам так, што забівае дых, прытупляецца нюх. Адкуль жа гэтая ўзялася ў нас на двары, калі?

З дома раптам выбег Коля.

— А наш татка прыехаў! А наш татка прыехаў! — заспяваў ён і паскакаў на адной ножцы да нас.

Мы і ахнуць не паспелі, як ён узяў Боба пад адну руку, мяне — пад другую і пабег у дом.

Я яшчэ ні разу не быў у чалавечым доме. Які ж вялізны іх дом! Мы спачатку зайшлі ў цёмны пакой, потым у светлы, дзе нікога не было, але пахла густа і смачна. Пачуў толькі, што дзесьці ў кутку пад сталом сядзіць наша мама і смачна хрумстае нешта цвёрдае. Мы перайшлі яшчэ ў адзін светлы пакой, многа большы за пярэдні. Тут стаялі дзед Антон і баба Ганна, Колеў і Толеў тата. Тут таксама смачна пахла. А ў ложку сядзеў, прыкрыты коўдраю, Толя. У руках ён трымаў пярэстага ката.

— Булька! Бульбобка ты мой! — Толя пусціў ката і працягнуў да мяне рукі.

— Пад'еш, з Булькам потым будзеш гуляць,— сказаў Толеў тата строгім голасам.

— Не хачу есці пеўня, хачу Бульку! — закруціў галавою Толя.

У мяне задрыжаў хвосцік: што ён — ашалеў? За што ён мяне хоча з'есці? Што я яму такога зрабіў?

— Ну, яшчэ трошкі, каток... Пасёрбай булёнчыку... А мо і другое крыльца абгрызеш? — падышла бліжэй да ложка баба.— Міхась, не сядзі, кармі яго, калі ўзяўся!

Я толькі цяпер убачыў, што Толеў тата трымае міску з ядой, і гэта з міскі так духмяна і смачна пахне.

— Ён ужо не маленькі, каб яго з лыжачкі карміць. Бяры лыжку сам. Ну! Раскапрызіўся тут...— Толеў тата падаў Толю міску і лыжку.

— Ай! — круціў той галавою.— Дайце Бульку!

Коля ўрэшце падабраўся бліжэй да ложка і сунуў мяне ў рукі Толю.

— Ну, што гэта такое?! — закрычаў тата.— Не кончыў есці, а ўжо за сабаку ўзяўся. Якія ў цябе будуць рукі! А потым за хлеб будзеш брацца.

— А я — без хлеба,— сказаў Толя.

— Хай сядзіць з Булькам, хай... Давай я яго дакармлю! — Забрала баба ў Толевага таты міску і лыжку, прысела на ложак.

А дзядзька Міхась захадзіў узрушана па пакоі.

— Ну і раздурэлі вы тут у дзеда і бабы! Такога бальшуна з лыжачкі кормяць!

— Булька... Булька мой...— Толя свяціўся ад радасці і туліў мяне да грудзей. І сёрбаў лыжку за лыжкай... Пасля пятай лыжкі ён дастаў з рота кавалачак і сунуў мне ў нос.

Я панюхаў і з'еў. Смачна!

— А хлеб будзеш? На...— Ён адкусіў кавалачак і зноў сунуў мне пад нос.

У хлеба свой смак і пах, я з'еў і хлеб. Але яшчэ смачнейшы пах ішоў з міскі. Што там такое?

— А зараз мяска дам... Бабуля, дай мне крыльца пеўня! — запатрабаваў Толя.

— На, каток мой, на...— дала баба яму крыло. І чаму яна называе Толю катом? Ён жа не вые так, як тыя каты ў агародзе.

Толя крыху пагрыз крыло, а потым адарваў мне костачку, другую кінуў Бобу. Боб сядзеў унізе, на падлозе, з Колем.

Я схапіў костачку, і ў мяне адразу набегла поўны рот сліны. Дык вось яно, тое, чым так смачна пахла ў чалавечым доме! Мясам пеўня...

Колькі я сёння дзіваў і таямніц адкрыў: смачнае не толькі малако, але і бульба, і хлеб. А самая страшная таямніца — людзі ядуць пеўняў і выплёўваюць костачкі!..

І я грызу костачку пеўня, нашага крыкуна пеўня. Значыць, яго ўжо няма жывога?!

Мне зрабілася млосна. Гляджу з ложка ўніз: можа, і Бобу нядобра ад мяса і костачкі? Ого, вурчыць нават, мармыча пагрозліва, калі Коля спрабуе костачку адабраць.

Эх, была не была...

Я зноў прылёг каля костачкі. Трэба ці не трэба гараваць і пакутаваць, што ем пеўня? Людзі ж ядуць, мама Пальма ў кутку пад сталом таксама хрумстае.

Цікава, толькі певень смачны ці курыца і кураняты таксама?

Трэба будзе злавіць, пакаштаваць...

## Людзі плачуць не так, як сабакі

— Не ведаю, што з вамі рабіць...— Дзядзька Міхась хадзіў па пакоі і спыніўся каля Колі.— Трэба забіраць вас у горад.

— Ну але! Хворых у дарогу браць! — сказала абурана баба.

— Каця перажывае вельмі — як яны тут... Наказвала, каб прывёз, гарадскім урачам паказаў.

— У нас таксама доктар добры. Ён і сёння прыйдзе, паслухае. І парашкі ж дзеці п'юць...

Баба ўстала, забрала ў мяне костачку.

— Хопіць забаўляцца, пасцель запэцкаў. Не па зубах яшчэ вам гэта.

Дзед Антон дасюль моўчкі стаяў каля дзвярэй, назіраў за ўсім. А цяпер сказаў:

— Праўда, ну як іх везці такіх? Нахапаюцца больш ветру... Колю-то можна было б, а гэтага боязна. Хай пабудуць у нас пару дзён яшчэ, тады ўжо будзем рашаць.

— Можна і пачакаць, я на два дні адпрасіўся з работы,— сказаў дзядзька Міхась.— Але ж у машыне ехаць, у закрытай, гэта не на кані.

— Баіцца наш доктар, каб не было запалення лёгкіх,— сказала баба Ганна і панесла ў пярэдні пакой міску, зноў вярнулася.

— Тата, мы Бульку возьмем з сабою,— сказаў Толя.

Ён гушкаў мяне на руках, хукаў цёплым паветрам мне ў вочы, і я жмурыўся.

— У-у, Бульку возьмеце, а Боба не-е?! — адразу горка заплакаў унізе Коля.— Мы ж не вінаваты, што нас двое...

— А я не сказаў, што возьмем Бульку. Ні Булькі не возьмем, ні Боба. Дзе з імі там дзецца? Гэта ж вам горад, а не вёска.

Толя і Коля пачалі крычаць і плакаць у два галасы:

— Не пакінем сабачанят!

— Булька мой? Мой! Мой!

— Бобка такі харошанькі!

— Не паедзем без іх!

Толя прыціснуў мяне да грудзей так, што я пачаў задыхацца, потым паднёс мяне да твару. Я са здзіўленнем углядаўся ў Толю: увесь твар яго зрабіўся мокры, як пасля купання ў рэчцы.

А кроплі вады ўсё выкочваліся з вачэй і трыма ручаямі цяклі па шчоках уніз. І Толя, і Коля не пераставалі галасіць, як іх ні ўгаворвалі.

— Ну і музыка! Канцэрт! — узмахваў рукамі дзядзька Міхась.

— Ну ціха ж! Ціха ўжо! Ну, што вы, дурненькія...— уцішвалі іх і баба, і дзед.

Мне зрабілася так шкада Толю, так шкада! Я крутнуўся ў яго руках, дацягнуўся да шчакі, лізнуў. Вада, што цякла з Толевых вачэй, была нясмачная, *салёная*!

От жа дзіва... Ай-яй-яй! А сабакі ж, калі плачуць, то ляжаць ціхенька, паклаўшы морду на выцягнутыя лапы. Ну, скуголяць часам, калі зусім ужо не вытрываць. Бывае, што нават выюць... А каб салёная вада цякла з вачэй? Не, такога, мабыць, не бывае. Мама пра гэта не казала.

— Возьмеце з сабою! Заберацe! Не плачце толькі! — казала Толю і Колю баба Ганна.

Дзядзька Міхась затуліў далонямі вушы:

— Дайце слова сказаць!

Паступова Толя і Коля прыцішылі галасы.

— Падумайце, дзе іх будзем трымаць? У кватэры? Выкінем вашы ложкі, а на тое месца сабачанят паселім?

— У-у-у! — зноў дружна завялі Толя і Коля.

Я хацеў сказаць, што мы ж маленькія, нам не трэба столькі месца. Але не паспеў.

— Ціха, кажу! Гэта — па-першае. А па-другое: і раненька, і ўдзень, і ўвечары іх трэба вадзіць на прагулку. А то і часцей. Улічыце, ні мне, ні маме няма калі гэтым займацца.

— Мы самі будзем вадзіць! Мы!

— Сціхніце! Вы спіце ў гэты час, хоць з гарматы страляй. Па-трэцяе: яны не ўмеюць

яшчэ нічога, не прывучаны захоўваць у кватэры чысціню. Хто за імі будзе прыбіраць, калі што якое? Вы?

— Мы... Мы-ы...— не так дружна ўжо вялі Толя і Коля.

— Гэта вы зараз так гаворыце, а потым не тое заспяваеце. Чацвёртае: ну, вырастуць яны, скажам, куды іх падзець? Два вялізныя сабакі ў кватэры... Мама выганіць з хаты вас разам з сабакамі.

— А мы ў кіно бачылі: у некага нават леў на кватэры жыве! — сказаў Толя.

— Можна дзве будкі на балконе зрабіць. Такія, як у дзеда на двары,— сказаў Коля.

Дзед і баба пакуль што маўчалі, гаварылі Толя, Коля і дзядзька Міхась.

— Жывёлы — не цацкі, каб з імі гуляць, забаўляцца, а потым выкідваць. І так развялося ў горадзе многа бяздомных катоў і сабак. Бяруць вось такія, як вы, забаўляюцца, а потым выганяюць. Ды ніхто не дазволіць на балконе будкі рабіць, псярню заводзіць... Суседзі скаргі будуць пісаць, што брэшуць... Міліцыя аштрафуе!

— А леў? Леў жыве ў кватэры, і ніхто не штрафуе! — не здаваўся Толя.

— Леў не брэша. Ды гэта эксперымент! Выключэнне з правіл!

Мы не разумелі ўжо, пра што ідзе гаворка.

— Ну і пятае: пра Пальму вы падумалі? Як ёй будзе — добра ці не? Ад яе ж забяруць родных дзяцей! І ці добра будзе Бульку і Бобу без мамы? Яны ж яшчэ сысункі!

Толя і Коля маўчалі, думалі.

— А каб вас хто пахапаў, павёз за трыдзевяць зямель? Вам добра было б без мамы і таты? А нам без вас?

Толя і Коля зашморгалі насамі, зноў пачалі плакаць.

— Вой,— не вытрывала баба Ганна.— То хіба ты хочаш дзяцей назусім ужо забраць? Яшчэ ж да школы цэлы месяц!

— Хай возьмуць сабачанят на колькі дзён. А паправяцца дзеці, зноў прывязеш сюды ўсіх разам,— сказаў дзед.

— І то праўда. Свая ж машына ў руках. Гэта ж не пехатою, не на аўтобусе нават,— дадала баба.

Толя і Коля не плакалі ўжо. Яны згадзіліся на гэта. Мабыць, згадзіўся і дзядзька Міхась, бо таксама маўчаў.

Я быў падумаў, што самы разумны ў хаце дзядзька Міхась. А зараз пачаў сумнявацца — мо дзед Антон?

Значыць, нас не забяруць назусім ад мамы. Гэта добра. Бо як бы мы жылі без яе?

— Толя і Коля добрыя, але ж яны — не мама Пальма,— шапнуў мне на вушка Боб, калі Коля зноў выносіў нас на двор.

А з другога боку, калі падумаць, то з мамаю таксама вечна не пражывеш. Сабакі павінны служыць людзям — мама сама нам пра гэта гаварыла. Дык лепш ужо служыць Толю і Колю, чым каму.

Ох-ха, што з намі будзе далей? Як усё не проста на свеце!

## Няўдалае паляванне. Смелая курыца

Два дні, што прабыў дзядзька Міхась у дзеда і бабы, прайшлі для нас у трывозе. Што будзе? Як усё павернецца?

Мы бачылі, як доктар прыходзіў у той дзень, калі бралі нас у дом, і нават назаўтра. Што ён сказаў Толю? Горш за ўсё, што і Коля не выходзіў. А мо ён выходзіў тады, калі мы спалі?

За гэты час маму Пальму двойчы спускалі з ланцуга і зноў узнагароджвалі ланцугом. Дзед Антон, мабыць, баяўся, што і мы без яе не будзем пільнавацца будкі, а пабяжым куды вочы глядзяць.

Пад канец другога дня не вытрымалі. Пачакалі, пакуль задрэмле ў будцы мама, і пайшлі на разведку. Нас даўно вабілі вароты: не тыя, што каля вуліцы, а тыя, што ў канцы двара, дзе хлеў. За гэтымі, другімі, варотамі быў лужок. Паўз яго злева цягнуўся агарод з дрэвамі-яблынямі, той самы, што і каля плота, а справа — проста агарод.

Мы хуценька адшукалі ў плоце каля варот добрую дзірку. Зямля ўнізе гэтай дзіркі-лаза спярэшчана слядамі-крыжыкамі курэй. Многа было і маленькіх слядкоў, мабыць, кураняты тут бегалі. Я падумаў, што і куры, і кураняты толькі ходзяць, не ўмеюць лятаць. Адзін певень умеў, дый таго ўжо няма.

Як добра на лужку! Тут такая ж мяккая, як каля рэчкі, трава. Тут і кветак многа пахне. З агарода на траву выпаўзлі доўгія калючыя сцяблы нейкіх раслін. З іх тырчаць угору на такіх жа калючых сцяблінках-дудачках закругленыя лісты. Некаторыя такія, што пад імі можна схавацца ад дажджу. Мама потым гаварыла, што гэта — гарбузнік. Сям-там на сцяблах раслі вялізныя, пыску можна ў іх усунуць, кветкі. У некаторых кветках поўзалі, зумкалі вялікія мухі. Мама потым нам сказала, што гэта — пчолы і яны вельмі моцна кусаюцца. А мы яшчэ не ведалі

гэтага, мы глядзелі, як яны поўзаюць у кветках, вымазваюцца ў пылок. Мы панюхалі адну такую вялікую кветку, другую — і нашы пыскі таксама выпацкаліся ў пылок. Адну кветку Боб зацiснуў лапаю, запыніў там пчалу, як у мяшэчку. Прыклаў вуха, слухае «музыку», усміхаецца задаволена. А пчала паенчыла, пазумкала, потым выкарабкалася адтуль — узвілася ўгору. Потым вярнулася, пакружылася каля нашых насоў, павісела нерухома. З-з-з-зіў! — паляцела невядома куды. Пашкадавала нас, малых, не ўкалола. А мо падумала, што мы таксама кветкі? На нас было пылку, пылку...

Дзесьці ў агародзе голасна ціўкала, плакала кураня. Мо згубіла маму, заблудзілася? А курыца хадзіла на лужку, а не ў агародзе, каля яе папісквалі, іх не было відаць у траве, кураняты. «Кох-кох!» — клікала курыца-мама кураня з агароднага гушчару.

— Давай зловім кураня і з'ямо! — прапанаваў Боб. Вочы яго блішчалі драпежным агнём.

— Ты што — здурнеў? — сказаў я. Але тут жа ўспомніў смак пеўневай костачкі, і ў мяне ажно заныла ў жываце.— Як гэта жывое есці? Яму ж балець будзе! Лепш давай пашукаем яго, да мамы выведзем.

— Ух, а мяне так і цягне паганяцца за кімнебудзь, злапаць!

— У цябе лоб не баліць ужо? Забыў, як курыца дзюбнула?

— Не баліць! — крыкнуў Боб і палез у гушчар агарода.— Ты вартуй з гэтага боку, выскачыць — хапай! А я пайду гнаць! — крычаў ён мне, забіраючыся ў агародныя нетры.

Я сеў і пачаў паглядваць то на агарод, то на курыцу з куранятамі. Курыца набліжалася да мяне, кохканне яе чулася ўсё мацней. Яна часта задзірала ўгору галаву, схіляла яе то на адзін, то на другі бок — не магла пазнаць, з якога боку далятае піск кураняці. А мо яна паглядвала ў неба? Бо там лятала кругамі вялікая птушка і, мабыць, узіралася ў зямлю.

Раптам курыца прарэзліва крыкнула: «Кэ-эх!!!» Кураняты сыпанулі хто куды. І тут нада мною пацямнела — шум, свіст. Зверху падала, наставіўшы кіпцюры, сівая вялікая птушка. Курыца залапатала крыламі і ўзляцела насустрач драпежніку. І сашчапіліся там, уверсе: курыца біла яго дзюбаю і крыламі, драпежнік адбіваўся, драў курыцу кіпцюрамі. Ляцела ў бакі пер'е... Калматы камяк з дзвюх птушак зніжаўся да зямлі, і раптам той, хто нападаў зверху, адарваўся ад курыцы, імкліва ўзляцеў угору і знік за дрэвамі. Курыца ўпала на зямлю. Растрапаная, сярдзітая, надзьмутая, яна хадзіла па траве сюд-туд, кружылася на месцы, склікала куранят: «Кох-кох!» А тыя адгукваліся нясмела, вылазілі з травы, з агарода — хто куды паспеў схавацца.

А я сядзеў, нібы прыліп да травы. У маіх вачах усё яшчэ мітусіліся дзве птушкі, ішоў бой курыцы з драпежнікам.

Вось табе і свойская птушка! Курыца, аказваецца, і лятаць умее...

Як яна бараніла сваіх дзяцей!

— Боб, вярніся! — пагукаў я. Я баяўся, што калі курыца нападзе на яго, адбараняючы кураня, то ад Боба застануцца адны мэтлахі.

Боб не адгукваўся. Не чуваць было і кураняці, што згубілася ў агародзе. Мабыць, яно ўжо далучылася да сваіх брацікаў і сястрычак. Курыца, кохкаючы, павяла куранят на двор.

І раптам пачуўся разгублены голас Боба: «Ау-у-у! Ау-у-у-у!»

Сам заблудзіўся, не ведаў, у які бок выходзіць!

— Гаў! Гаў! — адгукнуўся я і палез у гушчар агарода на выручку.

## «Малайцы!» — сказала мама

— Ау-у-у! Дзе ты? — крычаў Боб.

Я прадзіраўся скрозь дрымучы зараснік на яго голас. Лісце і сцяблы раслін былі то калючыя, то крохкія і халодныя. Як сыра было ў агародзе, як цёмна!

— А ты дзе? — пытаў я.

І Боб адгукваўся:

— Тут я. А ты дзе?

Голас яго чуўся то справа, то злева.

На адну і тую ж сцежку між двума радамі раслін мы трапілі адначасова. Я прысеў ад страху — што гэта за звер? Прысеў і Боб, убачыўшы мяне. Адно вуха ў Боба закасалася, да носа прыліп нейкі ліст, сам увесь брудны.

— Гэта ты? — голас Боба задрыжаў.

— А ты — гэта ты? — спытаў і я.

— У якім баку двор? — спытаў Боб.

— Сюды трэба ісці,— паказаў я налева.

— Не, сюды! — паказаў Боб направа.

— Калі я лез у агарод, то сонца свяціла справа,— сказаў я.— Значыць, калі мы павернем назад, то яно павінна быць злева.

— А што яно — жывое? Чаго сонцу скакаць то направа, то налева? — нібы здурнеў Боб, сам не разумеў, што гаворыць.— Як хочаш, але я павярну сюды...

— А я сюды,— сказаў я.— Паглядзім, хто хутчэй выберацца на двор.

— Ай, я пайду з табою,— раптам згадзіўся Боб і спалохана азірнуўся.

Прабіраліся мы доўга. Рады раслін скончыліся, пачаліся зараснікі нейкіх сабраных у камячкі кветак з моцным пахам. Кожны лісток на доўгіх сцяблінках-чаранках складаўся нібы з трох лісткоў. Ідзём, блытаемся, плішчымся, спатыкаемся, а гушчэчы канца-краю няма. Боб паціху падвываў, скуголіў: «Мы ўжо ніколі не выберамся!» Можа, мы і праўда кружым на адным месцы?

Раптам уперадзе засвяцілася палянка. Хоць ногі нашы падкошваліся, трымцелі, мы прыбавілі кроку: мо там удасца разгледзецца, пазнаць, у якім баку двор?

— Ціха! Там нехта ёсць! — прысеў Боб.

Пярэсты кот, мо ў два разы большы за нас, дурэў на палянцы пад яблыняй. Штосьці ледзь чутна пішчала каля яго. Кот то падкідаў угору шэрую рабаватую падушачку з лапкамі, то спрабаваў яе на ляту злавіць. Потым падкідваў і пярэднімі лапамі скакаў на тое месца, дзе падала падушачка. Садзіўся на хвост і пярэдняю лапаю ленавата чапаў, падчэпліваў кіпцюрыкам, каб зноў падкінуць... Хаваўся за яблыню і — раптам налятаў на сваю здабычу з засады, падняўшы хвост і сагнуўшы яго кончык уніз...

— Наш кот забаўляецца з жабаю! — здагадаўся я.

Кот пачуў шум, зірнуў насцярожана ў наш бок.

А потым сеў каля жабы, абыякава адвярнуўся: хай паўзе, хай уцякае...

— Пусціў ужо! Пайшлі...— прашаптаў Боб.

Але толькі жаба зварухнулася, як кот узляцеў угору і ўпаў на яе мо ўсімі чатырма лапамі. «І-і-і-і-і!» — слаба піскнула жаба.

— Ты справа, я злева — уперад! — скамандаваў я і рынуўся на ката.

— Ш-ш-ш-ш!!! — падхапіўся кот. Зубы ашчэрыў, спіну выгнуў, шэрсць на спіне і на хвасце стала дыбам. Стукнуў мне лапаю па носе, ірвануў кіпцюром. Ад болю ў маіх вачах бліснулі кругі. Я залямантаваў...

Кот крутнуўся ў другі бок, драпнуў Боба за вуха.

— А-я-яй! — завішчаў прарэзліва і ён.

— Разам! Уперад! — Я зноў кінуўся на ката. Пярэсты ўзляцеў на яблыню.

— У-у-у-у-у-у! — пагрозліва завыў ён. Кончык хваста ад злосці варушыўся.

Ага, спужаўся, нягоднік... Хай сядзіць цяпер, хай вые. Разбойнік, увесь нос мне распаласаваў, кроў капае.

— Дзе жаба? Паслухай, яна дыхае? — спытаў я, асцярожна мацаючы нос лапкаю.

Боб прыпаў на пярэднія лапы, прыклаў вуха да жабінай спіны. Вільнуў хвосцікам...

— Ну — што? — не цярпелася мне.

— Не дыхае... А пахне як — ф-фу-у...— разагнуўся Боб.

— Доктар у чалавекаў, я чуў, пульс мацае. А дзе ў жабы пульс? — Я патыцкаў носам жабе ў спіну. І чмыхнуў, закруціў галавою. У нос пеканула, нібы крапівою. Пах ад жабы быў едкі — аж у носе закруціла, захацелася чхаць.

— Гэта яна адбараняецца такім пахам. Сілы не хапае, каб адбіцца, дык яна пах пускае,— сказаў я.

У гэты час жаба прыўзняла галаву. Пад ротам у яе заварушыўся белы мяшэчак.

— Жывая!..— выдыхнулі мы разам.— Бяжы, ну! — падштурхнуў я жабу лапаю. Але яна падумала, што з ёю зноў будуць забаўляцца, і падабрала лапкі, замерла нерухома.

Боб забрахаў на ката, забрахаў і я.

— У-у...— хацеў павыць кот і раздумаў, толькі кончыкам хваста памахаў. У катоў памахванне зусім іншае азначае, чым у сабак.

І нас, і голас ката пачула з двара мама Пальма, таксама забрахала. На брэх выбег з хаты Коля.

— Вунь яны дзе! У агародзе! — крыкнуў ён і хуценька палез на плот. Скок з плота.— А запэцкаліся! — сказаў ён, хапаючы Боба пад жывот і перадаючы яго цераз плот Толю.— А брудныя! — ён злавіў і мяне, таксама перадаў цераз плот.

— Пакарміцеся на дарогу,— сказаў Толя і панёс нас да мамы Пальмы, паклаў у будку.

Мама, убачыўшы, якія мы, толькі цяжка ўздыхнула.

— А мы жабу адбаранілі ад ката! На яблыню яго загналі! — наперабой хваліліся мы.

— Малайцы! — сказала мама, яшчэ раз уздыхнула і палізала мне скрываўлены нос, пысу, вушы.— Чэрці вы балотныя, а не сабачаняты!

## Дзядзька Міхась спазняецца

Мама мыла нас, лізала — то мяне, то Боба. А мы саплі і заўзята смакталі яе сусолкі. Каля будкі сядзелі на кукішках Толя і Коля, глядзелі,

як мы кормімся. У Толі на шыі было накручана больш, чым у Колі.

— Мама, а мы хацелі кураня злавіць,— пахваліўся Боб.— Яно, мабыць, смачнае!

— Ты што?! Вы што?! Падурнелі? Гэта ж наша кураня. І наогул свойскіх птушак ніякі сабака не ловіць. Хочаце, каб вас кураловамі звалі, з дому прагналі? Якая ганьба, які сорам!

— Не-е, мы хацелі яго знайсці і вывесці з агарода, яно заблудзілася...— сказаў я.

Але мама быццам не чула:

— Вы... Эх вы! Ёсць, праўда, сабакі-паляўнічыя, яны памагаюць паляваць чалавеку на дзікую птушку, на звера. Я вам знарок пра гэта пакуль не расказвала, каб не надумаліся паспрабаваць... А вы... Ох, гора з вамі!

Мы слухалі яе, але нічога не адказвалі: у роце былі сусолкі.

— Дзе вы там? Хутчэй, а то і так познімся, да цёмнага не заедзем,—пачулі мы голас дзядзькі Міхася.

На двары завуркатала машына.

— Тата, яны яшчэ ссуць! — крычалі ў адказ Толя і Коля.

— Ну хай пассуць, хай добра пакормяцца ў апошні раз,— чуўся лагодны голас бабы Ганны.— Міхась, я во тут пастаўлю сумку, на пярэдняе сядзенне. Мо ў дарозе захочуць гэтыя жэўжыкі есці, то знойдзеце яечкі вараныя, малако, сыр.

— Піп! Пі-і-іп! — пасігналіла машына.

— Бяры, яны ўжо не ссуць. За Пальму хаваюцца,— сказаў Толя.

Дзве рукі Колі пралезлі ў будку, адарвалі мяне ад мамы. Я праляцеў у паветры і трапіў у рукі Толі. За мною гэтак жа праляцеў і астаўся на

руках у Колі Боб. Следам адразу вылезла, пагрымліваючы ланцугом, Пальма. Яна жмурыла вочы, жаласліва павісквала, спрабавала лізаць рукі Толю і Колю.

— Хадзем... Здагадваецца, мабыць,— сказаў Коля.

Цікава, ці чула тады размову ў хаце мама? Ці ведае яна, што нас забіраюць, што мы паедзем далёка-далёка, у незнаёмы і таямнічы горад?

— Пі-і-іп! — зноў нецярпліва пасігналіла машына.

Толя і Коля пайшлі да машыны. Там стаяла, сашчапіўшы рукі пад грудзьмі, і ўздыхала баба Ганна. Дзед Антон адчыняў вароты на вуліцу.

Дзядзькі Міхася не было відаць, мабыць, сядзеў ужо ў машыне.

Мама Пальма пачала станавіцца на заднія ногі, напінаць ланцуг, вішчаць і хрыпець. Павісквалі і мы, нам таксама было нявесела. Мама схапіла зубамі ланцуг, каб перагрызці. Не, ніякая гэта не ўзнагарода, аброжак з ланцугом. Я разумеў ужо добра. Але што яна зробіць з ланцугом?

Аб жалеза можна толькі зубы паламаць, гэта не костачка пеўня.

— Сыночкі!..— хрыпела і выла мама Пальма.

— Мама! Ма-а-ама! — пішчалі і мы, вырываліся з рук Толі і Колі.

А яны прыгнуліся і нырнулі ў машыну на задняе сядзенне. Смурод, што ішоў ад машыны, усярэдзіне, здаецца, быў меншы.

— Стойце! Унучкі дарагія, дайце ж хоць пацалаваць вас!

Баба Ганна нагнулася ў машыну, пацалавала Колю, нахіліла да сябе галаву Толі, таксама пацалавала. А нас баба не пацалавала, нібы нас і на свеце не было.

Дзед Антон патрос руку дзядзьку Міхасю, той для гэтага вылез быў з машыны і зноў сеў за руль, бразнуў дзверцамі. Толю і Колю дзед проста памахаў. Абышоў машыну, патузаў за ўсе ручкі, ці добра зачынена.

— Ну — шчаслівa! — дзед і баба махалі ўжо рукамі ўсім, а Толя і Коля махалі дзеду і бабе.

Машына рванулася з месца, за варотамі адразу паехала ўправа. Таму Толя наваліўся на Колю, і нас прыціснулі. Потым выпрасталіся, паехалі роўна.

Машына трошкі патрэсвала нас і гула, гула... Я пачаў ужо драмаць, як раптам нешта здарылася. Машына завішчала, як парася ў плоце, тузанулася і стала. Толя і Коля падхапілі нас на рукі, крутнуліся да задняга акенца машыны. Пасадзілі туды нас...

— Пальма! Пальма бяжыць!

— Тата! Пачакаем, возьмем і Пальму!

Дзядзька Міхась толькі азірнуўся назад і зноў нешта зрабіў з машынаю — яна рванулася ўперад. Праз акенца нам відаць было, што вуліца і дамы ўжо скончыліся і там, дзе вуліца пераходзіла ў дарогу, сапраўды штосьці бегла. Мо і праўда Пальма? За ёю курэў пыл і беглі некалькі хлапчукоў, размахвалі рукамі. Хлапчукі па чарзе падалі на зямлю, спрабавалі нешта ўхапіць, нібы ў Пальмы цягнуўся доўгі-доўгі хвост.

— З ланцугом бяжыць! — крычаў Толя.

— Адарвалася з ланцугом! — крычаў Коля.

Раптам Толя захныкаў, пачаў, уздрыгваючы, плакаць.

А мы ўжо ледзь бачылі маму, яна ўсё больш і больш адставала, рабілася маленькаю.

— Яна заблудзіцца, дадому не вернецца! — плакаў ужо і Коля.

— Не заблудзіцца,— спакойна адказаў дзядзька Міхась.— І нас не дагоніць — зараз выедзем на шашу.

— О! Злавілі яе! За ланцуг ухапілі! — закрычалі раптам Толя і Коля.

— Ну і добра, завядуць дадому.

Пачалася роўная, нібы падлога ў хаце, дарога. Мо тая самая шаша?

Толя і Коля селі на свае месцы. Выціраюць вочы. Іх не радавалі мы, хоць зноў ляжалі ў іх на каленях. Нам таксама было сумна і хацелася выць. Мама... Мама Пальма асталася адна...

## Дык вось які горад!

Мы вельмі доўга ехалі, бо я засынаў, прачынаўся, зноў засынаў, прачынаўся... Шмат разоў так. Адзін раз мы спыняліся каля лесу (лес — гэта многа-многа дрэў і кустоў). Толя і Коля трошкі пагулялі па кустах, і мы пагулялі, размялі костачкі. Потым зноў ехалі, і я зноў заснуў. А калі прачнуўся, то мы былі ўжо ў горадзе.

Гэта Толя сказаў, што мы ў горадзе. Ён уткнуўся ў бакавое акенца і ўсё ахкаў:

— Ах, які прыгожы горад вечарам! Ах, колькі ўсякіх агнёў!

З другога боку машыны, у другое акенца, глядзеў на горад і ахкаў Коля. Ён падсадзіў Боба ў акно, каб бачыў горад, потым Толя падсадзіў і мяне. І праўда, агнёў было многа — і ўздоўж вуліцы, і на сценах дамоў, і нават на стрэхах. Шум, гул... Машын — не праехаць, ляцяць сюды, ляцяць туды. Ёсць машыны вялізныя, як дамы ў вёсцы, і бегаюць яны на прывязі па дратах, як

мама Пальма на ланцугу. Каля іх дзядзькава машына такая маленькая — як Пальма каля каровы. І ўсё было б добра, каб не гэты моцны машынны дух. У мяне ад яго пачала кружыцца галава, я нічога носам не чуў, акрамя гэтага духу.

Мы і па горадзе яшчэ доўга ехалі, паварочвалі, кружылі. Урэшце — усё!.. Прыехалі!

Толя і Коля сунулі нас пад рукі, адчынілі дзверцы.

— І сумку забірайце. А я паганю машыну ў гараж,— сказаў дзядзька Міхась. Але з машыны не вылез, у рукі дубца не браў, каб гнаць.— Не гуляйце, падымайцеся адразу ў кватэру.

Калі машына ад'ехала, Коля сказаў:

— Пачакаем тату на двары. І сабачаняты заадно пагуляюць.

Двор быў такі вялікі і ўвесь засаджаны дрэвамі і кустамі, што ні канца ні краю не відаць. Пахаў сабачых і чалавечых было многа, я іх зноў чуў. Кожнае дрэва, кожны куст, кожны пагорачак на двары меў свой пах, сабакі ставілі на іх свае меткі не раз. Але сабак пакуль што мы не бачылі, бачылі людзей, гуляла многа цётак і дзядзькоў, бегалі дзеці. З вокнаў на двор лілося святло, чулася музыка.

У нас дрыжалі ногі, мы не асмельваліся добра прабегчыся, дый нас ужо акружылі з усіх бакоў дзеці. Хто стаяў, хто прысеў, хто гладзіў, а хто і спрабаваў узяць на рукі. Былі і такія, што таксама дапытваліся, якое мы пароды, або гаварылі: «Дварнякі!»

— Сам ты дварняк! — агрызнуўся Коля.

— Не чапай, які сабака з яго вырасце, калі кожны будзе лапаць ды гладзіць? — крычаў Толя.

Раптам з усіх бакоў пачуліся крыкі:

— Жужу выпусцілі! Жужка, сюды! Цю, цю, цю...

— Жужа, пазнаёмся!

Дзеці трошкі расступіліся, і ў круг пралезла невялікае калматае стварэнне. Не пазнаць было, дзе хвост у гэтага камяка доўгіх валасоў, а дзе галава. А каб пазнаёміцца па-сабачы, то трэба ж ведаць, што спачатку нюхаць, дзе хвост!

— Мо гэта кот? — спытаў Боб.— Але пацёрся каля сабакі, сабакам пахне.

— Ты злева, я справа — уперад!

Мы скокнулі на Жужу з двух бакоў, учапіліся зубамі ў поўсць. Жужа закруцілася вакол сябе, і мы ўзляцелі ў паветра. Жужа браханула збянтэжана, крутнулася рэзка ў другі бок. Мы пападалі...

— Цьфу! Што за шчаняты цяпер пайшлі! — абурана праця́ўкала яна.— Шчасце, што вы малыя, а так бы я вас...— Яна палізала адзін бачок, другі. І мы зразумелі: там, дзе мільгае язычок,— галава.

Мы вінавата павілялі хвосцікамі, селі. Памыліліся, бывае...

— Колькі ім ад роду? — спытаў адзін хлапчук — такі, як Генка.

— Скора тры месяцы,— прыхлусіў крыху Коля.

— А я думаў, месяцы чатыры. Баявітыя!

— Аўчаркі! — сказаў Толя.

Жужа паказытала валасамі морды нам носікі, затрэсла калматым хвастом, запрасіла нас пагуляць, пабегаць навыперадкі. Але ў гэты час пачуўся голас нейкай бабулькі:

— Жужа-а! Да мяне! Марш ад іх — заразішся глістамі ад гэтых хлапчукоў!

Дзеці незадаволена пачалі расступацца ў бакі. Яны любілі Жужу, але не любілі яе гаспадыню.

Каля нас засталіся толькі свае Толя і Коля. Жужа пабегла на голас бабулькі.

— Гэта *вы* тут?! — пачуўся раптам яшчэ адзін голас жанчыны — здзіўлены і спалоханы.

Толя і Коля ўздрыгнулі:

— Мама...

Мы амаль не ведалі іх маму, цётку Кацю. Бачылі яе ў вёсцы ўсяго раз.

— А тата дзе? Чаму ён вас тут пакінуў? — закідала хлопцаў пытаннямі цётка Каця.— От жа чалавек, а? Хворых дзяцей пусціў на вуліцу!

Яна схапіла Толю за адну руку, Колю за другую, пацягнула ў дом.

— Тут Булька! Боб! — пачалі ўпірацца яны.— Нашы сабачаняты! І сумка наша!

Цётка Каця вярнулася па сумку, а Толя і Коля падхапілі нас пад жываты.

— Што гэта за звярынец? Пакіньце!

— Не пакінем! Мы іх у дзеда і бабы ўзялі! Гэта нашы! Тата дазволіў! На некалькі дзён! — крычалі Толя і Коля.

— Дазволіў?! Ну, я з татам яшчэ пагавару. Марш дадому, сабакаводы.

Толя і Коля кінуліся ў дзверы дома раней за маму.

## У гарадской кватэры

Толя і Коля доўга саплі, карабкаліся па лесвіцы. Потым стаялі каля дзвярэй і чакалі маму. А мне было ўжо не вытрываць: столькі ехалі, дый на двары нам не далі зрабіць што трэба, увесь час тармасілі і гладзілі. Ды яшчэ Жужа гэтая...

Цётка Каця адамкнула дзверы, усе зайшлі ў кватэру. Нас Толя і Коля адразу пусцілі на падлогу ў калідорчыку, а самі пачалі распранацца і разувацца. Потым трошкі забыліся на нас, пабеглі недзе далей у кватэру. Мы пачулі іх выкрыкі: «Ой, якая падлога ў нас стала! Як лёд!», «Ой, гэта не наша кватэра!», «Мама, калі вы зрабілі такую падлогу?». А мама адразу накрычала на іх: «Асцярожна, не падрапайце лак!»

Боб тым часам прыладзіўся ў куточку каля абутку і зрабіў лужынку. Я больш не мог цярпець і таксама прымайстраваўся. А як пайшлі мы з таго месца, то на падлозе засталіся мокрыя слядкі лап.

— Разведаем іх дом,— сказаў я Бобу.

Усё было тут незнаёмае. І пахі нязвычныя, новыя. А павярнулі направа, у адчыненыя дзверы, то падлога бліснула нам у вочы, як вада ў рэчцы. У гэтай «вадзе» нібы гарэлі тры лямпачкі — глыбока-глыбока. Яшчэ ярчэй гарэлі тры лямпачкі пад столлю. Толя і Коля бегалі па «вадзе» і не плюхалі ніяк, не рабілі пырскаў. Пад Толем і Колем бегалі ўгору нагамі яшчэ адзін Толя і адзін Коля. Толькі тыя, што дагары нагамі, даўжэйшыя і цьмяныя, нібы цені.

— Перастаньце бегаць і коўзацца! Драпін наробіце, пісагоў! — крычала з другіх дзвярэй, яе не было відаць, Толева і Колева мама.— Ідзіце мыць рукі, будзеце вячэраць!

Коля апошненькі раз разагнаўся і ўпаў жыватом на бліскучую падлогу, праехаў.

— Лёд! — разагнаўся і праехаў Толя.

Мы ступілі некалькі крокаў па бліскучым і ўбачылі, што там, пад лёдам-лакам, ідуць нейкія

страшныя звяры — лапа ў лапу з намі. Варухнеш галавою — і там звер варухнецца. Панюхаеш падлогу — і там цягнецца да цябе страшыдла, каб панюхаць ці ўкусіць. Боб задрыжаў і сеў на хвост, потым пачаў адпаўзаць назад. Павярнуў і я — страшна!

— Каму я сказала? Перастаньце коўзацца! — далятаў усё з тых жа дзвярэй голас цёткі Каці.

— Булька! Боб! — Толя кінуўся да мяне, Коля — да Боба. Не далі нам прайсці ў тыя дзверы, адкуль даносіліся смачныя пахі і голас цёткі Каці.— Пакатайцеся!

Толя сеў у адным кутку пакоя, Коля — у другім.

— Ж-ж-ж-ж-ж-ш-ш-ш-ш-с-с-с-с-с! — пусціў Коля з размаху Боба па падлозе. Боб перакруціўся некалькі разоў — галава-хвост, галава-хвост — і трапіў у расстаўленыя ногі Толі.— А ты да мяне! — крыкнуў Коля.

Толя схапіў Боба і каўзануў назад па падлозе, да Колі. Боб віскнуў ад страху, перакруціўся разы чатыры. І... трапіў у расстаўленыя ногі Колі.

— Я казаў, каб ты Бульку ўзамен пускаў, а ты!..— Коля падхапіўся і кінуўся на Толю з кулакамі.

Яны забыліся на нас, сашчапіліся і пакаціліся па бліскучай падлозе клубком. Не плакалі, не крычалі, толькі крахталі, саплі і ахкалі. Мо не хацелі, каб іх пачула мама.

Боб выпаўз паволі ў калідор, сеў пры сцяне і пачаў вылізваць свой ускамлычаны бачок. Мамы Пальмы тут не было, спадзявацца не было на каго — самім трэба вылізвацца.

— Разыдзіцеся!.. Пеўні, разыдзіцеся, бо вадою паабліваю! — прыбегла з кухні цётка Каця і лупцанула фартухом аднаго і другога.

— А чаго ён майго Боба шпурляе! — заплакаў Коля.

— Ты сам яго першы шпурнуў! Гэта ж не цацка! Не шайба! — адказаў Толя.

— Абодвух стаўлю ў куток, пакуль не прыйдзе бацька! — сказала цётка Каця.— Вось так... Адзін у гэты, другі — у той... Я думала, і праўда яны пахварэлі, з ног валяцца, а яны...

Толькі развяла іх цётка Каця па розных кутках, паставіла спінамі адзін да аднаго, як зазвінеў званок. Цётка Каця пайшла адчыняць і адразу спатыкнулася ў прыцемку на нас: мяне штурхнула нагою ў бок, Бобу наступіла на лапу... Боб вякнуў, а цётка Каця спалохана ўскрыкнула:

— А каб вас!.. Ледзь ног сабе не паламала.

Запаліла святло і ўпусціла дзядзьку Міхася. Не дала яму і слова сказаць, загаварыла сама:

— Нашто нам гэтая псярня? Дзе мы іх будзем трымаць? Пабіліся ўжо з-за іх, чмышуць у кутках. Цэлую кватэру сабак навезлі! Усю падлогу кіпцюрамі падрапалі!

— Бо не трэба быў нам гэты лак,— сказаў дзядзька Міхась.

— Гэта мы падрапалі, а не сабачаняты! — паказаўся з пакоя Толя.— Мы незнарок...

— А я дазволіла табе пакідаць куток?

— Ты сказала: пакуль тата не прыйдзе,— выглянуў з дзвярэй і Коля.

— Не трэба было, мабыць, іх прывозіць, не такія яны ўжо і хворыя. Толькі шкоднічаюць тут...

Я падумаў, што цётка Каця не вельмі любіць Толю і Колю, сваіх дзяцей.

— Ах! — Раптам убачыла яна лужынкі, што нарабілі мы з Бобам.— Ужо-о-о?! І калі яны паспелі!

Яна хуценька падышла да нас, схапіла за каршэнь Боба, схапіла мяне. Адчыніла дзверы на лесвіцу і... выкінула нас!

— Што ты робіш?! — пачулі мы праз дзверы голас дзядзькі Міхася.

Крычалі і плакалі, тупалі нагамі Толя і Коля.

Дзверы зноў адчыніліся, дзядзька Міхась пабраў нас на рукі, прынёс у калідорчык, затым у ванную, падаслаў нам нейкую анучу, паклаў. Пачаў суцяшаць дзяцей, якія ажно захліпаліся ад плачу.

Мы сядзелі, прытуліўшыся адзін да аднаго, дрыжалі. Нам таксама хацелася плакаць ад крыўды і болю. І нашто толькі мы сюды ехалі!

— Толя, вазьмі анучу, замый калідорчык. Коля, а ты набяры цёплай вады ў тазік, пакупаем шчанят з мылам,— распараджаўся дзядзька Міхась.

А з кухні далятаў голас цёткі Каці:

— Каб вымылі потым тазік з парашком!

— У-у-у... Гэта не Булька нарабіў, а Боб...— ныў плаксівым голасам Толя.— Хай Коля мые калідор, а я — сабачанят.

— Па чарзе будзеце прыбіраць, па чарзе. Ды вы ж на гэта згаджаліся — помніце? — сказаў дзядзька.

Коля набіраў у тазік цёплае вады і падміргваў нам абодвума вачыма.

## Помста

Мяне ўсяго памылі — з вушамі і хвосцікам. Спалосквалі маленькім цёплым дожджыкам. Прыемны такі казытлівы дожджык. Дзядзька трымаў

у руках штосьці круглае, з дзірачкамі, і адтуль струменіў дожджык. Ні хмар не было, ні ветру, а дожджык ліўся! І Боба гэтак купалі, а Толя мяне сушыў, дзьмухаў гарачым паветрам з нейкае жалезнае штуковіны, што шыпіць, як кот. Называецца яна фен. Потым Толя паклаў мяне на подсціл і памагаў сушыць Боба. Дзядзька Міхась, Толя і Коля сядзелі ў ваннай на кукішках і ўсё рабілі цішком, як змоўшчыкі.

«Эх, каб цёплага малачка пасмактаць, каб была тут мама Пальма...» — думаў я. І толькі так падумаў, як дзядзька Міхась прынёс нам у дзвюх бляшаначках малака, паставіў кожнаму пад нос — каб не сварыліся за яду. Малако было халаднаватае, але таксама смачнае.

Тое непрыемнае, што вытварыла з намі цётка Каця, ужо забывалася. У нас, сабачанят, памяць кароткая...

Дзверы ў ваннай не зачынялі, і мы яшчэ чулі, як цётка Каця гаварыла:

— Во, хіба што сам будзеш з імі забаўляцца. І так дзеці раздурэлі, адбіліся ад рук, а ты ўсё ім патураеш.

У адказ ніхто нічога ёй не сказаў.

Пасярод ночы мы прачнуліся. Было ціха і ўсюды цёмна. Амаль не чуваць было і гулу машын з вуліцы. Мы чулі толькі роўнае дыханне людзей — усе спалі.

— Будзем кватэру абследаваць? — папытаў Боб.

— Уночы? Спі от лепш...

— Затое цяпер ніхто не перашкодзіць... Дый выспімся яшчэ.— І мы пайшлі падарожнічаць па кватэры.

Доўга лазілі па ўсіх закутках, абнюхвалі, аглядалі. Акрамя таго пакоя, дзе пускалі Боба па «лёдзе», быў яшчэ адзін. Там спалі дзядзька Міхась і цётка Каця, спалі дзеці. Мы там нават паблудзілі крыху, не маглі знайсці выхад. І ў кухні заблудзіліся, зачапіліся за нешта, скінулі са стала, нарабіўшы грукату.

— Хіх-хі-хі! — не вытрымаў Боб.

— Ціх-ха! А то будзе нам зноў! — прыгразіў я.

Прышлёпаў у тапачках дзядзька Міхась, уключыў на кухні святло. «Ах вы, шкоднікі!» —палавіў нас, зноў занёс у ванную, паклаў на падсцілку і пальцам прыгразіў, каб больш нікуды не рыпаліся.

«А калі захочаце чаго, то во...» — кінуў каля нас брудную анучу.

Выключыў дзядзька Міхась святло, пайшоў.

Мы паляжалі крыху, пачакалі, пакуль зноў усё супакоіцца.

Спаць нам чамусьці не хацелася, і мы зноў асцярожна пайшлі гуляць. Далёка ўжо не хадзілі, гулялі ў калідорчыку.

Мы перанюхалі ўвесь абутак у кутку. Некалькі туфель пахла цёткаю Кацяю. Мы ўзялі ў зубы па адным туфлі, зацяглі ў ванную. Палеглі на свой палавічок і пачалі грызці.

Нясмачна было, цвёрда, а мы ўсё роўна грызлі. Слабыя былі ў нас зубы, а мы ўсё роўна жавалі, жвакалі, тузалі, ірвалі.

І знаходзілі ў гэтым асалоду, супакаенне.

Мы не задумваліся, што нас пасля гэтага можа чакаць.

Мы проста неўзлюбілі цётку Кацю...

## «Гэта вам не ветлячэбніца!»

Першы раніцаю ўстаў дзядзька Міхась, разбудзіў Колю:

— Падымайся, соня... Сабачанят на прагулку трэба вывесці.

Коля толькі мыкаў, як карова, і не хацеў расплюшчваць вачэй. Дзядзька Міхась сілком пасадзіў яго на пасцелі, пацёр яму вушы:

— Чуеш? Боба на прагулку вядзі...

— У-у-у... А чаму я-а-а? — урэшце зусім прачнуўся Коля.

— Любіш катацца, любі і саначкі вазіць. Пасля абеду даспіш.

Дзядзька Міхась прыйшоў у ванную ўмывацца, і я хуценька лёг на сваё месца. І тут дзядзька спатыкнуўся на цётчыны туфлі.

— Ах жа разбойнікі! Ну — будзе вам зноў... Ой, будзе! — Ён пабраў туфлі, панёс недзе хаваць.

Хутка і цётка Каця прыйшла ў ванную. Мы прыцісналіся адзін да аднаго, заплюшчыліся і нават захраплі. А самі прыслухоўваемся: што цяпер будзе? Але цётка Каця пакуль што нічога не ведала. А тут і сонны Коля прыйшоў, пабраў нас пад рукі, панёс на двор, і даўно было пара, мы цярпелі ўсю ноч.

Можа, гэта прагулка нас і ўратавала. Бо калі нас прынеслі ў кватэру, самая большая навальніца ўжо адбушавала.

— Мала ў цябе ўсякіх туфляў? Мо дзесяць пар валяецца па кутках. І не носіш, і не выкідваеш,— гаварыў дзядзька Міхась спакойна.

— А тыя мо не модныя! Самыя модныя, самыя любімыя — пажавалі... У чым я на работу пайду? У чым?

— Босая. Во будзе модна!

— Табе ўсё смешачкі. Ты знарок ім падсунуў мае туфлі.

— Ага.

— Хацеў, каб я дома сядзела. А я не буду сядзець з дзецьмі! У мяне квартальная справаздача гарыць,— гаварыла яна штосьці незразумелае.

— Я адпрашуся яшчэ на адзін дзень, па суботах адпрацую. От паснедаем, і павяду іх у паліклініку,— лагодна гаварыў дзядзька Міхась.

І вось прайшло снеданне. Нам далі малако, накрышыўшы ў яго белага салодкага хлеба. Боб малако выхлебтаў, а хлеб толькі аблізаў. А я ўсё з'еў. Смачна!

Ехалі мы ў паліклініку аўтобусам. Толя і Коля трымалі нас на каленях, дома не хацелі пакідаць адных. З іх размовы я зразумеў, што паліклініка — гэта дом, дзе многа-многа ўрачоў-дактароў, і ўсе яны лечаць дзяцей.

Калі падышлі да гэтага дома-паліклінікі, дзядзька Міхась сказаў, раскрыўшы гаспадарчую сумку:

— Саджайце іх сюды. Каб ніхто не бачыў. А то не пусцяць з імі...

І нас пасадзілі ў цесную цёмную сумку. Мне вельмі хацелася паглядзець, як будуць лячыць дзяцей. Але што ты ўбачыш, седзячы ў сумцы?

Сядзелі ў цеснаце і цемнаце доўга. Ажно задыхацца пачалі. Наўкол нас чуваць былі прыглушаныя жаночыя і дзіцячыя галасы, шоргалі ногі, рыпелі крэслы. Я не вытрываў, заскуголіў. Шморгнуў у сумцы замок, у дзірку зазірнуў Толя, а потым Коля.

— Ціха вы тут! Ні мур-мур! Мы скора выйдзем...— зашапталі яны.

І тут іх паклікалі: «Хто наступны?» Толя шморгнуў замок сумкі, але не да канца, пакінуў невялічкую шчылінку, каб нам было лепш дыхаць. Сумку паставілі пад крэсла.

Я пасядзеў крыху, а потым стаў пярэднімі лапамі на Боба, сунуў пыску ў шчыліну. Якраз пралазіць! Я напяўся, прасунуў больш. Замок з ціхім вуркатаннем разышоўся шырэй. Пралезла ўжо галава з вушамі...

— Што там? Што там? Дай і мне глянуць! — варушыўся пада мною Боб.

Я паспеў убачыць, што сядзім мы ў нейкім пакоі ці калідоры, наўкол многа людскіх ног — і маленькіх, і вялікіх. Замок душыў мне горла, я пачаў задыхацца. А тут яшчэ Боб — р-раз! Адсунуўся ўбок з-пад маіх лап. Я павіс на шыі, захрыпеў.

І тут да сумкі кінуліся дзеці.

— Ой! Ай! Ах! Шчаня! Задыхаецца!

Хтосьці —тр-р-ром! — шморгнуў замок, паклаў сумку набок. Я тут жа вылез на халодную падлогу.

— Глядзі, там і другі! Ой, які таўстунок! — гарлапанілі дзеці, цягнуліся да нас рукамі. Мы нічога не бачылі, акрамя іх рук і ног.

— Патрасіце сумку, мо там яшчэ адзін сядзіць! — параіў хтосьці.

Сумку патрэслі, заглянулі ўсярэдзіну — трэцяга не вытраслі.

У нос нам лезлі незнаёмыя рэзкія пахі, хацелася чхаць. Нясмачна пахла паліклініка! Не чулі мы толькі пахаў дзядзькі Міхася, Толі і Колі.

— Смялей! Пабегайце! Смялей! — галёкалі нам у вушы дзеці і самі бегалі па калідоры, падштурхоўвалі нас, цяглі за пярэднія лапы. Засумавалі, седзячы! — Цю-цю-цю! Даганяйце нас!

Мы палахліва і нязграбна крыху прабегліся. Усе страшэнна зарадаваліся і запляскалі ў далоні. Быццам мы зрабілі нейкае геройства. Шум, гам, тупат яшчэ больш памацнелі...

На крыкі дзяцей пачалі адчыняцца дзверы справа і злева ў калідоры, адтуль выглядвалі людзі ў белых халатах, белых шапачках.

Не толькі цёткі, але і дзядзькі.

— Гэта што яшчэ за цыркавое прадстаўленне? Што за сабакі тут? — пачуўся строгі жаночы голас.

Усе перасталі скакаць, бегаць, крычаць і смяяцца. Дзеці вакол нас расступіліся. Мы ўбачылі спачатку вялізныя ногі ў туфлях, а потым разгледзелі і ўсю цётку — вялізная, таксама ў халаце, толькі не ў белым, а ў шэрым, у руках у яе была палка і мокраяануча. Не іначай як вялікая начальніца была гэта цётка.

— Чые сабакі, я вас пытаю? Гэта ж не ветлячэбніца! Хто прывёў? Хто разводзіць антысанітарыю? — грымеў яе голас.

Мы сядзелі, прыціснуўшыся адзін да аднаго, як сіроты. Мы не ведалі, што з намі будзе ў наступную хвіліну. Ніхто не адказваў на грозныя пытанні цёткі. Асмеліўся самы маленькі хлопчык:

— Тут яны...— паказаў ён на самыя блізкія ад нас дзверы.— І дзядзя з імі... Пайшлі лячыцца.

Грозная цётка ў шэрым халаце адчыніла тыя дзверы, закрычала:

— Чые сабакі? Зараз жа вынесіце іх з паліклінікі, а то аштрафуем!

З тых дзвярэй, паднырнуўшы пад цётчыну руку, выскачыў Коля. Яго, мабыць, вылечылі ўжо. Ён схапіў нас, пачаў запіхваць у сумку.

Спачатку Боба хвастом уніз, а я быў заціснуты ў яго між каленяў. Колевы рукі дрыжалі, калені дрыжалі. Замок не слухаўся, а я вырываўся...

— Хлопчык, а дзе твая мама? Мы зараз выклічам санітарную інспекцыю і аштрафуем яе! Гэта ж ліха ведае ў што паліклініку ператварылі!

— Мама на рабоце...— сказаў Коля. Ён засоўваў ужо мяне ў сумку ўніз галавою.

— А з кім ты тут? — не адступала грозная цётка.

— Адзін,— схлусіў Коля.

— Як адзін?! — цётка ажно закашлялася.— Такі малы і без мамы ходзіш?

У гэты час я вырваўся з Колевых рук і нырнуў у гушчэчу ног. Убачыў — калідор пусты, усе стаяць у кучы. І прыпусціўся па калідоры куды вочы глядзяць.

— І-і-і-і-і! — завішчаў нехта з дзяцей. Ад радасці завішчаў. Затупацелі ногі, усе мяне кінуліся даганяць і лавіць.

— Ату яго! Ату!

— Лавіце яго! Трымайце!

— Перакусае ўсіх, ён шалёны! Не чапайце, я сама! — крычала цётка ў шэрым халаце. Яна бегла першаю і размахвала анучаю.

А тут і калідор скончыўся, бегчы далей няма куды.

— Га-а-а-а...— усе збегліся да мяне кучаю.

Схапіла мяне не цётка, а дзяўчынка са светлымі валасамі і з вялізным бантам. Панесла мяне і аддала ў рукі Колю. Усе ішлі за намі і гаварылі: «Ну і малайчына ж! Ну і цыркач!», «Як яго звацъ?», «Хлопчык, вы сабачак не прадаяце?».

Але Коля ішоў і нічога не гаварыў. А тут і дзядзька Міхась з Толем выйшлі ад доктара, заспяшаліся нам насустрач.

## На выстаўцы сабак

Дзядзька Міхась, як толькі выбраліся з паліклінікі, голасна зарагатаў:

— Го! Го! Го!

— Хэ-хэ-хэ! Хэ-хэ-хэ! — звонка падхапілі Толя і Коля. Яны неслі нас на руках.

— І тут прыгодаў нацярпеліся! Не шанцуе вам,— сказаў дзядзька Міхась.

— Бедненькія...— дружна ўздыхнулі Толя і Коля, загушкалі нас.— Тата, а давайце не паедзем больш у аўтобусах, тралейбусах. Пяшком пройдземся.

— Давайце,— згадзіўся тата.— Заадно і Булька з Бобам прагуляюцца. Нічога небяспечнага ў вас доктар не знайшоў. У Толі трошкі катар у горле.

Пакуль ішлі, Толя і Коля двойчы пускалі нас гуляць. Другі раз мы гулялі каля высознага, з жалезных палак плота. За ім расло многа-многа дрэў — парк называецца. На плоце вісеў шчыт, а на ім вялікая папера-аб'ява. Уверсе паперы намаляваны такі сабака, як Султан. Дзядзька Міхась голасна прачытаў, што пісалася на той паперы. Толя і Коля таксама прачыталі: «Выстаўка сабак».

— Сабачая выстаўка! Ой, мы хочам на сабачую выстаўку! Пабеглі на выстаўку, тата! — закрычалі яны, перабіваючы адзін аднаго.

— Па-першае, туды трэба ехаць — далёка. Яна не ў гэтым парку. Па-другое, выстаўка заўтра, у суботу.

— Мы Бульку з Бобам пакажам!

— Малых сабачанят не паказваюць. Там усякіх чэмпіёнаў, дыпламантаў і медалістаў будзе многа. Парodзістых... А вашы — невядома хто...

Зноў тое самае — «невядома хто...». Настрой у Толі і Колі адразу пагоршыўся. І ў нас пагоршыўся. Мы нават хацелі зашыцца куды ў густыя зараснікі, каб ніхто не бачыў, якія мы непрыгожыя, непародзістыя.

Рэшткі гэтага дня і ноч прайшлі так сабе, няма пра што і расказваць. Усе чакалі заўтрашняга дня, чакалі выстаўкі. Нават цётка Каця больш на нас не крычала — у нас была ўжо скрынка з пяском, і мы зразу навучыліся ёю карыстацца. А вось на дзядзьку Міхася сварылася. Што ён здзяцінеў з гэтымі сабачанятамі і з выстаўкамі. Мы не ведалі, ці кепска гэта — здзяцінець. Ведалі толькі адно — дзядзька Міхась добры, ён разумее малых.

... І вось прыйшло тое заўтра, і мы паехалі на выстаўку.

Мабыць, гэтая выстаўка яшчэ не пачыналася. А мо ўжо скончылася? Было многа і людзей, і сабак. Сабакі былі на павадках, былі і ў намордніках. А былі і без павадкоў, і без наморднікаў — усякая калматая драбяза. Большыя сабакі сядзелі ці хадзілі спакойна, а малыя ганяліся адзін за адным, дурэлі. Ніякай сур'ёзнасці, нібы дзеці малыя. Адзін сабака-велікан, яго ўсе называлі догам, хоць і на павадку быў, і ў наморлніку, хадзіў ганарліва, нікога не заўважаў вакол сябе. Некаторых сабак

ён пагардліва адштурхоўваў з дарогі, і тыя палахліва падціналі хвост, угіналіся, павісквалі.

Недзе пракрычала радыё: «Грамадзяне! Хутка пачне працаваць журы, падрыхтуйце сабак. Хто яшчэ не зарэгістраваў свайго сабаку, падыдзіце да судзейскага століка». Мы зразумелі, што выстаўка толькі пачынаецца.

Людзі з сабакамі крыху памітусіліся і пачалі выстройвацца радамі. Здымалі намордні́кі, расчэсвалі сваім калматым грыўкі, хвасты і бакі, папраўлялі аброжкі і нагруднікі з медалямі. Мы не дачакаліся, пакуль усе добра пастрояцца і падрыхтуюцца, пачалі хадзіць і глядзець. Хадзілі дзядзька Міхась, Толя і Коля, а мы сядзелі ў хлопцаў на руках.

Спачатку стаялі і сядзелі сабакі-веліканы. Каля некаторых былі ўваткнуты ў зямлю калочкі з шыльдачкамі. Дзядзька Міхась чытаў надпісы, і шмат хто хадзіў, глядзеў, чытаў...

— Хортая борзая...— прачытаў дзядзька Міхась.

І мы палахліва ўздрыгнулі на руках Толі і Колі. Вой, не сабака, а страх і смех: высозны, худы, ажно рэбры тырчаць, сагнуўся ў дугу, нібы ў яго жывот баліць. Не пазнаць, дзе ў яго канчаецца пыса і пачынаецца лоб — усё доўгае, пляскатае. Бр-р-р... І што ў яго пародзістага? За што яму прычапілі медалі? Ногі сухія, як палкі. І трэба ж выгадаваць такія хадулі: па метру, не менш!

— Дог...— сказаў дзядзька Міхась, і мы ўбачылі таго сабаку-велікана, што ўсіх ганарліва штурхаў грудзьмі. Страшна падступіцца, морда вышэй галавы Толі і Колі. Ногі даўжэйшыя, чым у таго, што сагнуўся ў дугу. Хвост тонкі і голы, нібы аблузаны.

Убачылі мы і баксёра. У гэтага галава вялікая, а пысы амаль няма. Нібы з разгону стукнуўся носам у дрэва, і нос уціснуўся ў галаву. Ад гэтага ў яго і зморшчын, складак многа і на лбе, і каля носа, верхнія губы абвіслі абапал рота. Вочкі круглыя, малыя і злосныя.

Ішлі мы далей, а дзядзька ўсё чытаў. Аўчарка ўсходнееўрапейская... Яна прыгожая, як Султан, а вочы разумныя-разумныя. Сенбернар... Вялікі і тоўсты здаравяка, галава большая, чым у дзядзькі Міхася, мо ў два разы. Аўчарка коллі... Прыгажуня, сама пярэстая, валасы з яе звісаюць доўгія, расчасаныя. Спакойная, лагодная. Былі і мудрагелістыя назвы: эрдэльтэр'ер, фокстэр'ер... Яны амаль такія ж калматыя, як Жужа, толькі большыя. І Жужа жвавая, рухавая, вясёлая, а гэта непаваротлівыя дуралеі.

Бачылі і таксу: сама па таўшчыні, як дог, але ногі ў чатыры разы карацейшыя, жывот амаль па зямлі цягнецца. Ну і вырадак! Потым пайшлі пумі, скайтэр'еры, пекінес, японскі хін, чы-хуахуа... У многіх, вельмі многіх віселі на шыі жэтоны і медалі.

— Пакаёвыя, дэкаратыўныя сабакі,— сказаў нейкі дзядзька каля нас.

— Пустышкі... Для забаўкі...— дадаў другі.

Потым службовых сабак доўга вадзілі па крузе, а іх глядзелі і ацэньвалі людзі з журы. Глядзелі, дзівіліся і гледачы. Пасля гэтыя сабакі паказвалі, што яны ўмеюць: бегалі па бервяне, пераскоквалі цераз сценку, лазілі па лесвіцах, поўзалі на жываце, «вартавалі».

Як ішлі мы з выстаўкі, адна цётка спытала: «Гэта выйгралі такіх шчанят? Гэта такіх разыгрывалі ў сабачую латарэю? Як вас ашукалі!..»

Мы паехалі дадому. Ехалі моўчкі і думалі, каторы з тых сабак атрымае самы прыгожы медаль. Дзядзька Міхась, Толя і Коля, мабыць, таксама думалі пра выстаўку: маўчалі і моршчылі лбы. А я скора перастаў думаць, бо разбалелася галава. Мне хацелася толькі аднаго — есці і спаць, спаць і есці.

І хацелася яшчэ трапіць хутчэй назад — у вёску.

## І ўсё-такі жыць добра!

Нядзеля. Мы зноў у дарозе. Зноў едзем усе разам — я, Боб, Толя і Коля. Вязе нас у вёску дзядзька Міхась. Тыдзень прабылі ў горадзе — хопіць!

Спыняліся адпачываць у прыгожым сонечным лесе. Дзядзька Міхась, Толя і Коля нарвалі чорных ягад — цэлы двухлітровы слоік. Наеліся самі — пачарнелі ў іх губы, пачарнела ў роце. Не было ў лесе Генкі, ён бы сказаў, што хлопцы сталі «з характарам». Давалі каштаваць ягады і мне — сілком запіхвалі ў рот. Нічога, як раскусіш, есці можна. Але цукеркі смачнейшыя.

І грыбоў набралі — цэлае вядро. Не ведаю, для чаго грыбы, іх хлопцы не елі. Пахнуць яны здорава, і я адзін пакаштаваў. Ат, ніякага смаку, як трава.

Ва ўсіх быў цудоўны настрой. Толя і Коля радаваліся і галёкалі на ўвесь лес, крычалі. А потым, калі зноў ехалі, спявалі на ўсё горла. Дзядзька Міхась ім памагаў.

Мы таксама папісквалі, нам таксама хацелася падпяваць.

Мы едзем зноў у вёску. Едзем да бабы Ганны і дзеда Антона. Дзеці — на адзін тыдзень, мы — назаўсёды.

Едзем да свінні з парасятамі, да курыцы з куранятамі. Ах, якія прыгожыя дзеткі ў мамы-свінні і ў мамы-курыцы! Мы іх ніколі не будзем крыўдзіць. Якія яны зараз, ці падраслі? А самі мы за гэтыя дні, здаецца, так падраслі, так падраслі. І наглядзеліся ўсякага, і паразумнелі...

А галоўнае — мы едзем да мамы Пальмы!

Мама... Скора мы ўбачым маму! Гаў, гаў! Ура, ура!

Мы зноў будзем жыць і расці на волі. Як добра расці на волі! І мы вырасцем вялікімі і дужымі.

І мы не вырасцем пустышкамі. Не!

Мы будзем служыць людзям, памагаць ім у рабоце.

Як добра жыць на свеце, калі ад цябе будзе людзям карысць!

# "Як на нашы іменіны..."



## «Толькі раз на год...»

У Толі і Колі на дваіх адзін дзень нараджэння. Толя і Коля — блізняты.

Тата і мама доўга абмяркоўвалі, што ім падарыць. Абодвум па сем гадоў спаўняецца, гэта не тры, не чатыры і нават не шэсць. Ім увосень ісці ў школу!

— Трэба іх саміх папытаць,— прапанавала мама.

— Во, лепш за ўсё,— згадзіўся тата.

— Я хачу хамяка,— не задумваючыся сказаў Толя.

— Добра,— сказаў тата.— Хамяк не сабака, лёгка ў кватэры трымаць.

— А я хачу рыбак! Акварыум! — запатрабаваў Коля.

— І акварыум можна. Рыбкі не брэшуць,— сказаў тата.

— Ур-ра!!! — закрычалі Толя і Коля, заскакалі па кватэры.

— А мама што мне падарыць? — перастаў скакаць Толя.

— Вы ў нас агульныя, і падарункі будуць агульныя,— сказаў тата, але запытальна паглядзеў на маму.

— Ну-у... я яшчэ торт куплю,— сказала мама.

— Два! Два тарты! — закрычалі Толя і Коля.

Тата капрызліва надзьмуў губы — нібы Карлсан, які жыве на даху:

— Ну-у-у, я так не гуляю. Адзін торт і сем свецак? Лепс адна свецка і сем тартоў!

Усім зрабілася весела.

— Куплю адзін, але вялікі-вялікі,— паправілася мама.

Коля ўсё-такі ўздыхнуў:

— Лепш, каб у нас былі два дні нараджэння. Мы б два разы святкавалі, у нас было б два тарты!

Тата праспяваў, як кракадзіл Гена з мультфільма, але былі ў песеньцы і словы Карлсана, які жыве на даху:

Як шкада,
Што «дзень варэння»
Толькі раз на год!

Потым паглядзеў на маму і сказаў:

— Мы маглі б і самі спячы торт. Яшчэ адзін.

— Ты горш за маленькага! — пачала злавацца мама.— Калі мне гэтым займацца?

— А што там вельмі займацца? Ты дай нам рэцэпт, а мы самі ўсё купім, замесім... Праўда, хлопцы?

— Ага-а! — закрычалі хлопцы. Ім гэта спадабалася.

## Усё не так проста!

Добра, што тата загадзя купіў тоненькую, як сшытак, кніжку пра акварыум. Без яе не ведалі б, што рабіць, з чаго пачынаць. А ў той кніжачцы ўсё расказана і паказана — намаляваны рыбкі, вадзяныя расліны, розных відаў акварыумы. І яшчэ там было сказана, што куплены акварыум трэба прамыць растворам марганцоўкі і заліць на двое сутак вадою. Добра было б за гэты час ваду ў акварыуме некалькі разоў памяняць. З замазкі вымакнуць усе шкодныя рэчывы, не будуць атручваць рыбак. На дно акварыума трэба насыпаць буйнога і добра прамытага пяску-жвіру. Яшчэ лепш, калі прамыты пясок пракіпяціць,— знішчацца ўсе заразныя мікробы.

— А ты казаў, што рыбак проста трымаць! — папракнула мама.

— Хто сказаў — я-а?! Калі я такое казаў? Хлопцы, вы чулі, каб я такое казаў?

Толя і Коля дружна закруцілі галовамі і заўсміхаліся: не, такога тата не гаварыў.

Каб рыбкі не захварэлі, трэба памыць у марганцоўцы і тыя расліны, якія будуць высаджаны на дно акварыума, і саміх рыбак. Трэба ведаць, дзе паставіць акварыум, каб на яго лішне не падала святло, каб не было і холадна. Трэба мець падагравальнік для вады і такую штуку, што пускае ў ваду пухіркі паветра, і тэрмометр, і кармушку, і малы акварыум-садок для малявак... Добра, каб у акварыуме жылі і куклянкі-смаўжы. Яны нібы санітары будуць падтрымліваць у акварыуме чысціню і парадак. Калі ўсё будзе зроблена правільна, сам акварыум ператворыцца

нібы ў жывы арганізм, усё ў ім ураўнаважыцца, вада будзе чыстай.

Тата дачытаў кніжачку да канца і пачухаў патыліцу.

— Та-а-ак... Коля, а мо і табе хамяка? — уздыхнуў ён.— Аднаму хамяка, другому — хамячку.

— Ну але! — не вытрывала мама.— Разведзяце мне тут цэлую ферму. А тады што — на базар прадаваць панесяце?

— Кгым, кгм...— пакашляў тата і нічога не сказаў.

— Акварыум!!! — ажно затупаў нагамі Коля.

— Яшчэ раз тупнеш — не ўбачыш акварыума як сваіх вушэй! — прыгразіла мама.

Пайшлі ў магазін «Прырода». Там было столькі ўсякіх акварыумаў! І малых, і вялікіх, і круглых, як плафоны на слупах у парку, толькі не белых, нібы залітых знутры малаком, а празрыстых. А колькі было ў магазіне рыбак! Розных, у розных акварыумах. Самыя вялікія плавалі ў маленькім басейне з каменнымі берагамі — проста пасярод магазіна. Усё дно ў гэтым басейне было засыпана меднымі манетамі. Каля яго круціліся некалькі хлапчукоў і ласа заглядвалі ў ваду. Ім так хацелася пабоўтацца, пазбіраць тыя грошы!

— Тата, а хто насыпаў туды грошай? І нашто насыпалі? — тузалі тату за рукавы Толя і Коля.

— Экскурсанты, турысты... Ёсць такое павер'е: калі кінуць у басейн мядзяк, то абавязкова яшчэ раз пабываеш у гэтым горадзе. А манеты акісляюцца, атручваюць рыб...— Тата падвёў Толю і Колю да вялізнага акварыума, які стаяў у кутку магазіна, падсвечаны зеленаватым святлом.

У акварыуме ў дзівосна-загадкавым ззянні сярод раслін плавалі не менш дзівосныя рыбы: і трохкутнічкі з чорнымі доўгімі плаўнікамі, і блакітнавата-рубінавыя рыбкі-агеньчыкі, і лянівыя аксамітна-чорныя таўстуны, і залаціста-ружовыя з вялікімі, нібы марлевымі хвастамі. У іх былі вялізныя і выпучаныя, нібы не свае, вочы. Толя і Коля як прыліплі да гэтага акварыума, дык не хацелі і адыходзіць.

Тата адразу аблюбаваў круглы акварыум. Прыгожы!

— Не бярыце круглы — галава ў рыбак замарочваецца,— сказаў яму адзін дзядзька-пакупнік і нават не ўсміхнуўся.

— Чаму? — здзівіўся тата.

— Няма куткоў, арыенціраў для рыб. Плаваюць, плаваюць кругамі — і брык на дно...

Татава рука паднялася да патыліцы, каб пачухаць. А мо і праўду гаворыць дзядзька, не жартуе?

Пачалі аглядаць прамавугольныя акварыумы з шыбамі-сценкамі.

— Во гэты...— паказаў ён прадаўшчыцы на акварыум з вадою, што стаяў на прылаўку. Пад акварыумам было суха, ён не працякаў.

— Можна і гэты,— абыякава сказала прадаўшчыца.— Памажыце пераліць з яго ваду.

Паднялі, пералілі ў парожні акварыум.

— Яны ўсе трошкі цякуць, асабліва спачатку. А замокнуць — і нічога,— сказала прадаўшчыца.

— А мо...— Цяпер тату здалося, што лепшы акварыум той, у які пералілі ваду.

— Грамадзяні-і-ін!..— з прыціскам сказала прадаўшчыца.

І тата засаромеўся, пайшоў да касы.

Дома акварыум напоўнілі вадою. Два дні ваду мянялі. А Толя і Коля набралі гравію і каменьчыкаў каля дома-новабудоўлі. І ўвесь час хлопцы спрачаліся, колькі і якіх рыбак купіць. Каб і цесна ім не было, каб хапала кіслароду. На кухні ў двух вёдрах адстойвалася вада. Нельга рыбак адразу пускаць у такую, што набярэш з-пад крана. У ёй многа вапны, яна таксама шкодзіць рыбкам.

## Чатырохлапы тарбахват

— А што-о ў мяне ё-ёсць...— голасна сказаў тата, як прыйшоў вечарам з работы.

Ён спыніўся ля парога, палез рукою ў кішэнь пінжака. І раптам выхапіў руку: «Ой!» На кончыку сярэдняга пальца чырванела кропелька крыві.

— Парэзаў? Брытвачкай? — Толя і Коля пакідалі буквары, падбеглі да яго. Абодва спачувальна глядзелі тату ў твар.

— Не-е,— сказаў тата загадкава.— Не!

Але не паспеў растлумачыць...

— Хамя-я-ак!!! — закрычаў Толя і заскакаў, запляскаў далонямі.

З кішэні татавага пінжака якраз паказалася светла-рудзенькая галоўка з кароценькімі цёмнымі вушкамі. Паварушыла верхняю губкаю з доўгімі вусікамі, панюхала паветра. Чорныя бліскучыя вочкі-парэчкі ўтаропіліся на дзяцей. Памкнуўся Коля ўзяць хамячка — і ад страху хуценька пацёр далонь аб далонь, затупацеў нагамі: «О-ё ёй!» Схаваў рукі за спіну.

А Толя не спалохаўся, падставіў да кішэні руку, і хамяк успоўз на яе. Ён дробненька трымцеў, дрыжалі лапкі. Прыціснуўся жыватом

да Толевай далоні, асцярожненька глянуў з рукі ўніз: ух, як высока!

— Маленькі, як мышка,— сказаў Толя.— Мякенькі, цёпленькі. А якія лапачкі — ружовыя, з пальчыкамі! І носік ружовы!

— А жывоцік белы! І бачок левы з белай плямкай! І хвосціка няма! — заглядваў знізу і з бакоў Коля.

Ад гэтых выкрыкаў хамячок задрыжаў яшчэ мацней. Сеў тым месцам, дзе павінен быць хвосцік, падняў пярэднія лапкі, пачаў іх вылізваць, старанна выціраць імі роцік і шчочкі. Мо знарок, каб не паказаць, што яму страшна.

— Ой, як мыецца пацешна! — крычаў Коля.

А Толя не ўтрываў, паднёс хамячка да рота, пахукаў на яго.

— От як схопіць зубамі за губу, будзеш ведаць... Паменш цягайце па руках, гэта не кацяня.— Тата схадзіў ужо на кухню і вярнуўся ў калідор. Палец яго быў карычневы ад ёду.

— Тата, а клетак у магазіне няма? — пытаў Толя.

— Толькі птушыныя. А для хамякоў трэба такія, каб не было драўляных частак, бо папераграызаюць.

— Во-о, а дзе ж ён будзе жыць? Яму ж хатка патрэбна.— Толя пакрыўджана надзьмуўся.

— Пасадзім у трохлітровы слоік. Цётка, у якой я купляў, таксама ў слоіку іх трымае,— сказаў тата.

Пайшлі на кухню. Тата дастаў з шафачкі пусты вялікі слоік.

— Саджай сюды. Усё будзе відаць, як у акварыуме,— і паставіў слоік на стол.

Толя не змог прасунуць у слоік руку з хамяком. Давялося нахіліць слоік і пусціць хамячка.

Ён з'ехаў на дно на жываце — нібы з ледзяной горкі. Слоік паставілі нармальна, і хамяк адразу ж забегаў кругамі ўздоўж сценкі. Потым стаў на заднія лапкі, такія ж карацелькі, як і пярэднія, выцягнуўся як мага ўгору і заскроб пярэднімі па шкле. Кіпцікі коўзаліся, тоненька шкрабацелі — не было за што ўчапіцца! Зноў прабег некалькі кругоў, вынюхаў сценку, зноў стаў на дыбкі, заскроб лапкамі. І гэтак скроб і скроб, а сам адступаў патрошку ўправа, нібы танцаваў на задніх лапках.

Перабраў усю сценку слоіка некалькі разоў — так і не зачапіўся!

Шкада стала хамяка. Нібы ў турму якую пасадзілі. Толя адкалупнуў ад батона невялікі, з арэх, кавалачак, кінуў у слоік. Хамячок не бачыў спачатку булкі, але вусы адразу заварушыліся — адкуль гэтак смачна пахне? Крутнуўся ў той бок, хап зубамі. Падтрымаў яду лапкамі і... запхаў кавалачак у рот цалкам! Левая шчака адтапырылася, як напакаваная торба. Такі ж кавалачак батона памачыў у малако і кінуў хамяку Коля. Хамяк палізаў трошкі булку, падхапіў лапкамі, як ручкамі, і запхнуў за тую ж левую шчаку. Яна адтапырвалася ўжо так, што пераважвала хамяка на адзін бок. Зрабіў круг па дне, стаў на дыбкі — глядзіць на Толю і Колю.

— Ой, яшчэ хоча! — замітусіліся яны.— Чаго б яму даць?

Тата ўкінуў кавалачак яблыка, зярняткі з яблыка. Хамяк тут жа іх прыбраў, засунуў за правую шчаку. Сыпнуў Толя семак сланечніку, яны разляцеліся па ўсім дне. Прапоўз хамяк, як пыласос,— не пакінуў ніводнай! Кінуў Коля белы

гарбузік — хамяк узяў семку ў ручкі, пакручвае, як шафёр руль, абгрызае рубчык. Тузець зубамі — лупінкі адпалі ў бакі, пляскатае зярнятка знікла за шчакой. Абедзве шчакі тырчалі ўжо так, што хамяк упоперак стаў шырэйшы, чым удоўж. Не торбачкі былі ў яго за шчокамі, а сапраўдныя мяшкі — аж да паловы тулава.

— Ой, ха-ха-ха! — не вытрывалі Толя і Коля.— Не есць, а ўсё запасаецца.

— Ну і тарбахват! — смяяўся і тата. Прынёс ірваную шарсцяную шкарпэтку, камяк ваты, кінуў у слоік.— Хай робіць гняздзечка.

Хамяк трохі пацягаў, патузаў шкарпэтку і вату зубамі, падрапаў кіпцямі. Потым падлез пад іх. Думаў, ніхто не бачыць, а яго было відаць з усіх бакоў: прысеў на заднія лапы і цісне пярэднімі на шчокі, выпіхвае харч. Пачысціў зашчочныя мяшкі, узяў у лапкі аблузаны гарбузік — есць.

— Вой, як чалавечак! — дзівіўся Толя.

— Ага, пальчыкі ружовенькія, ручачкі маленькія,— захапляўся Коля.

— Хомка, мы Гуліверы для цябе, праўда? — Толя пастукаў пальцам у сценку слоіка.

Хамяк адвярнуўся да яго спінаю, але жаваць не перастаў.

— Хомка ў многіх завуць. Другое імя прыдумайце,— параіў тата.

— Гаўрык, Гаўрычак,— пазваў Толя і засунуў руку ў слоік.

Хамяк крутнуўся, выварочваючы ўгору галаву, выставіў для абароны зубы: «Ш-ш-ш-ш-ш».

Толя спуджана выхапіў руку.

— Гаўрык, Гаўрык, гэта ж я — ты не пазнаў? Але Гаўрык нікога не хацеў пазнаваць. Палез праз дзірку ў шкарпэтку.

## Мама расказвае страхі

І тут прыйшла з работы мама.

— Міхась, не забаўляйся, як малы! Схадзі лепш у магазін, малака, хлеба купі. Во, яшчэ цэлы спіс... А для торта я сама ўсё купіла.

— Калі ж пацешны вельмі...— Тата пайшоў да вешалкі з адзеннем.

— Мама! У майго хамячка лапкі ружовенькія! Бярэ пальчыкамі ўсё, як чалавек! Гаўрык! Гаўрычак! Пакажыся маме! — Толя пастукаў кіпцем па сценцы слоіка, але хамяк не хацеў паказвацца.

— Падумаеш,— пакрыўдзіўся Коля.— У мяне рыбкі будуць лепшыя за твайго хамяка...— І пайшоў з кухні ў пакой.

— Я чакала, што так будзе. Яны яшчэ паб'юцца з-за гэтага хамяка,— папракнула мама тату.— Яны і ўрокаў не захочуць рабіць — каля хамяка будуць сядзець, каля акварыума. Хай толькі будзеце кепска вучыцца! Хай!.. Я тады вам...

Толя і Коля расхваляваліся. Хутка ўжо ў школу, ой, хутка!

Кінуліся да сваіх ранцаў з кнігамі, сшыткамі, каляровымі алоўкамі. Даўно ўжо, больш за месяц, стаялі ранцы ў куточку. І буквар, і чытанку Толя і Коля перагледзелі ў першы ж дзень, а штосьці і прачыталі. Абодва ўмелі чытаць. Нават цэлы год самі хадзілі ў дзіцячую бібліятэку.

— Ой, не трэба было іх вучыць чытаць! — забедавала мама, грукаючы посудам.— Ім нецікава будзе на ўроку, круціцца будуць.

— Як гэта — не трэба? — сказаў тата ад парога.— Цяпер настаўнікі патрабуюць, каб дзеці ўмелі чытаць да школы. Каго ў садзіку вучаць, каго дома, каго ў падрыхтоўчай групе.

Толя і Коля былі згодны з татам.

Як гэта — не ўмець чытаць? Зараз яны і жыць не могуць без чытання. Проста дзіва, як дасюль жылі. А за год — выгадалі цэлы год! — яны столькі кніг прачыталі, столькі ўсяго даведаліся!

Зноў пабеглі на кухню. Як там хамячок?

Слоік стаяў ужо не на стале, а на падлозе каля буфета-шафачкі. Мама зняла. Толя адразу лёг на бок, Коля стаў на калені — не відаць Гаўрыка! Толькі ледзь прыкметна варушыцца шкарпэтка, яго схованка. Не відаць і ваты — зацягнуў хамяк у шкарпэтку.

— Не коўзайцеся па падлозе! А то самі будзеце мыць адзенне,— пагразіла мама.

Толя засунуў руку ў слоік, расхіліў гняздзечка. Усе прыпасы ляжалі ў шкарпэтцы, а хамяк штосьці трымаў каля рота і хуценька, спяшаючыся, жаваў. Не ўцерпеў Толя, дастаў Гаўрыка, паднёс да рота. Мо зноў хацеў пахукаць на яго, а мо і пацалаваць у мордачку.

— Ой, не паднось! Каб больш гэтага не было! — закрычала перапалохана мама.— Я чула на рабоце, адна цётка расказвала, у іх доме гэта нарабілася... Дзяўчынка во так хукала на хамяка, разявіла рот... А ён шмыг у рот! І палез у глотку! Пакуль выклікалі «хуткую дапамогу», пакуль завезлі на аперацыю — увесь страўнік падраў кіпцюрамі. Ледзьве адратавалі!

Толева рука задрыжала, ён хуценька пусціў Гаўрыка ў слоік. У жываце ў яго пахаладзела, нават балець пачало, нібы ў яго таксама залез хамяк, пачаў драць там кіпцюрамі. Толя ўжо і любіў і не любіў Гаўрыка.

— Мама, добра, што я захацеў не хамяка, а рыбак! — сказаў Коля.

— Ідзіце мыць рукі. І каб сёння больш не браліся за хамяка!

Рукі памылі ахвотна. Цёплаю вадою, з мылам. Праўда, паштурхаліся трохі каля ўмывальніка, папырскалі адзін на аднаго і на сцены.

— Мы хочам мясіць торт! — прыбеглі на кухню, бо на кухні ўжо нечым смачна пахла.

— Ой, работнікі з вас... Я сама ўжо замясіла, зараз раскачаю, буду пячы каржы. Паглядзіце ў шафачцы якога павідла ці варэння. Вашага любімага...

— Яблычнага! — закрычаў Толя.

— Не, вішнёвага! — запярэчыў Коля, штурхануў Толю ад шафачкі.

— Цішэй, не паразбівайце слоікаў! І асцярожна, яны цяжкія! — папярэдзіла мама.

— А я люблю клубнічнае! — зайшоў якраз тата.— Што ж рабіць? Трэба пячы тры тарты!

— Хо-хо-хо! — засмяяліся, зарадаваліся дзеці.

— Яшчэ што выдумайце! — сказала мама.

— А колькі каржоў будзе? Тры?

— Тры,— сказала мама.

— Ну — во: на ніжні намажаш вішнёвага, на сярэдні — яблычнага, на верхні — клубнічнага,— параіў тата.

— Ага,— нібы згадзілася з ім мама.— А можна яшчэ перцу дабавіць, гарчыцы, таматнай пасты... Во будзе смак!

— А што? З'ямо! — сказаў тата і не ўсміхнуўся.

Толя і Коля паглядзелі адзін на аднаго, потым на тату і маму. Жартуюць?

І дурасліва засмяяліся.

## Падслуханая размова

Заснулі Толя і Коля. А тата і мама яшчэ доўга размаўлялі і шапталіся. Нават тэлевізар не ўключалі — усё гаварылі і гаварылі. А гаварылі пра тое, што рабіць з імі — Толем і Колем. Да першага верасня яшчэ паўмесяца. Раней было ўсё добра — раніцаю іх вялі ў садзік, вечарам прыводзілі дадому. А паўтара месяца ўлетку прабылі яны ў дзеда і бабы, у вёсцы. І вось зноў у Мінску.

— Пакідаеш ім ключ і дрыжыш: а раптам забудуць замкнуць кватэру? А раптам ключ згубяць?

— Не забудуць... Не згубяць...— гаварыў тата няўпэўнена.

— Яны пасля абеду будуць у школу хадзіць, у дзве гадзіны. Я распытвала. А калі ўрокі рабіць? Вечарам нельга, яны і так будуць стомленыя. Зранку толькі, да абеду... А хто з імі будзе сядзець? Я ж не магу работу кінуць!

— І я не магу,— гаварыў тата.— У школе павінна быць група падоўжанага дня. Мо дамовіцца, у групу іх аддаць?

— Цэлы дзень у школе? А на свежым паветры калі ім быць? Зусім змарнеюць.

— Чаму? Іх і гуляць водзяць, і кормяць абедам, і адпачываць кладуць. І ўрокі пад наглядам робяць.

— Невядома, ці будзе гэта група. Кажуць, настаўніцы яшчэ няма.

— Дык што ты прапануеш?

— Бабу трэба прывезці. Хай бы ў нас баба пажыла — год, два. Колькі трэба...

— Баба... А дзеда куды? У іх жа ў вёсцы свой дом, гаспадарка, карова. Не захочуць сюды ні

баба, ні дзед. Лепш ты сваю маці ўгавары, яна гараджанка... Дый на пенсію ёй даўно пара, нашто ёй тая работа?

— Не ўгаворыш... Ты яе слаба ведаеш.

— Унукі павырасталі — бабы ў вочы не бачылі.

— Яна ж была раз!

— Ага, сто гадоў назад... Пазвані заўтра, угавары. Ты ж умееш!

— Калі і ўгавару, то не хутка прыедзе. Пакуль пенсію аформіць, пакуль дабярэцца сюды... Раней трэба было думаць!

— Дык чаму ты не падумала?

— Я... Я... Усюды я! — павысіла голас мама.

— Цішэй, калі ласка. Хлопцы толькі што паснулі.

Толя хіхікнуў сам сабе і затуліў рот коўдраю. Ён усяго мо на хвілінку быў задрамаў і паспеў убачыць сон: у яго развялося і бегала многа-многа хамякоў! Рознакаляровых! Але як пачалі моцна размаўляць тата з мамаю, яго сон уцёк, а цяпер ніяк не хацеў вяртацца. Цікава было паслухаць!

— А пакуль прыедзе, будзем вісець на тэлефоне,— гаварыў далей тата.— То ты пазвоніш, то я... То ты падскочыш дадому, то я...

— У нас строга,— адказала мама.— Не магу я кідаць работу, раз'язджаць па асабістых справах.

Толя не вытрываў, вылез са свайго ложка, пайшоў да Колі. Паштурхаў яго пад бок.

— Пасунься... Скажу нештачка!

— А-а-а... М-м-м...— Коля спрасонку не мог зразумець, чаго ад яго хочуць.

— Тата і мама будуць на тэлефоне вісець. Чуеш? А мы адны будзем жыць. Чуеш?

— М-м-м... Замест трубкі вісець?

— Кіраваць намі па тэлефоне будуць. А мы адны будзем жыць!

Коля павярнуўся на другі бок і засоп носам.

— Эх...— махнуў на яго Толя і палез назад у свой ложак.

## «Хочаш яшчэ торта?»

Першы выспаўся і вылез з ложка Коля. Ні таты, ні мамы не было. З кніжнай паліцы-шафы звісаў плакат.

«СЫНКІ! — гэтае слова тата напісаў чырвоным фламастэрам вялікімі літарамі.— Віншуем вас з днём нараджэння і моцна цалуем! — гэта зялёным.— Будзем святкаваць ваш дзень пасля абеду, а лепш за ўсё вечарам. У абед я прывязу рыбак і куклянку!» — гэта сінім.

А ніжэй чорным фламастэрам прыпісала мама:

«У духоўцы яечня. Кісель у кубачках на стале. Да кісялю адрэжце сабе па кавалку куплёнага торта. А той, што я спякла, яшчэ не гатовы, яму трэба выстаяцца. З дому не выходзьце, пагуляеце на двары пад вечар. Цалую — мама».

Коля тузануў плакат. Аб падлогу моцна ляснула кніга — яна прыціскала верх плаката да паліцы. Прачнуўся і Толя.

— Пісьмо табе, на́ чытай! — кінуў яму плакат Коля, а сам раздзеты пабег на кухню.

Праз хвіліны дзве, калі Толя прачытаў усё, што было напісана ў плакаце, ён завыў: «У-у-у-у...» — і таксама кінуўся на кухню.

Спазніўся: Коля ўжо адчыкрыжыў сабе вялізны кавалак торта і еў на поўны рот. Самы лепшы кавалак выразаў — зверху мармеладная кветка і лісцік з зялёнага крэму.

— О-о, тады я два кавалкі адрэжу, калі так! — сказаў Толя і адрэзаў сабе два кавалкі торта.

— Тады і я два,— сказаў Коля і адваліў сабе другі, яшчэ большы за першы.

— У цябе і адзін першы большы за мае два! Тады я адрэжу тры!

— А я — чатыры!

— А я скажу тату!

— А я скажу маме!

— А я табе не дам хамяка глядзець!

— А я хамяка ўжо бачыў. Я табе не дам рыбак глядзець!

Абодва пхалі за шчокі торт, як той хамяк харч,— хто хутчэй і больш з'есць? Павымазваліся, як чэрці.

І тут зазваніў тэлефон. Раз, другі, трэці...

— Бяжы паслухай, у мяне рукі ў крэме! — сказаў Толя.

— Сам слухай! І ў мяне ў крэме!

Толя запхнуў рэшткі другога кавалка ў рот, хоць ужо нудзіла ад торта, пабег да тэлефона. Ухітрыўся ўзяць трубку сціснутымі кулакамі.

— Умгу? — не мог добра варухнуць языком.

— Разбудзіў? — сказала трубка татавым галасам.— Дай, думаю, пазваню, мо яшчэ спяць... Засцілайце ложкі, умывайцеся, снедайце.

— Умгу!

— Што — умгу?

— Мы ўжо з'елі торт! — У роце Толі пасвабаднела.

— Як — увесь? — здзівіўся тата.

— Трохі яшчэ не. Коля даядае.

Трубка маўчала, трубка цяжка дыхала.

— А яечня? Кісель?

Цяпер памаўчаў Толя.

— Няма на іх месца ў жываце.

Зноў памаўчала трубка.

— А як званіць у «хуткую дапамогу», ведаеце?

— 01!

— 01 — гэта ў пажарную. Спадзяюся, да пажару ў вас не дойдзе. 03! Але я сам пазваню — у псіхіятрычную! Скажу, што вы павар'яцелі, каб вас забралі ў вар'яцкі дом.

Трубка шчоўкнула, у ёй пачуліся кароткія гудкі.

Толя вярнуўся на кухню. На трэці кавалак торта не хацелася і глядзець.

Коля сядзеў на крэсле з нагамі, калені каля падбародка. Далонямі цісннуў на горла, нібы душыў сам сябе. Твар бледны-бледны, як пабелены, вочы вылупленыя. На талерцы каля яго пуста — з'еў чатыры вялікія кавалкі!

— Хочаш яшчэ торта? — пасунуў Толя свой трэці кавалак да яго.

Коля дзіка гыкнуў, затуліў далонямі рот, закруціўся па кухні — ледзь не перакуліў вёдры з вадою, не пабіў акварыума. Кінуўся ў туалет.

Толя адшчыкнуў кавалачак торта без крэму, паклаў у слоік.

Праз хвіліну хамякова схованка, шкарпэтка, уздрыгнула, паказалася мордачка з вусамі, уся галава... Вочы хамяка былі заплюшчаныя, вушы вялыя, нібы пакамечаныя. Панюхаў — цап здабычу зубамі.

Галава знікла...

Хамяк таксама любіў торт.

## «Сушаная мікроба» і «цыклоп з ножкамі»

Тата яшчэ два разы званіў: «Як вы там? Як Коля?» І кожны раз Толя дакладваў: «Кепска... Ляжыць...»

Прыехаў тата на абед, прывёз у слоіку з вадою рыбак і куклянак. А Коля не ўставаў! Толькі крыху павярнуў у яго бок галаву і папытаў:

— Колькі? Якія?

— Як і дамаўляліся: пара неонаў, пара гупі вуаляхвостых, пара чорных молі, пара мечаносцаў. У знаёмых браў, не ў магазіне. Гэтыя дарослыя ўжо, а ў магазіне маляўкі.

Коля адвярнуўся, заплюшчыў вочы.

— Э, брат, як цябе скруціла... А ўсё з-за прагнасці. Хамяк і то ўсяго адразу не есць, надалей пакладзе.

Тата пайшоў на кухню. Вычарпаў з акварыума — у апошні раз! — ваду, рэшткі сцадзіў ва ўмывальнік, падняўшы акварыум. Засыпалі на дно гравій, налілі паўвядра адстоенай вады, пасадзілі некалькі водарасцяў — іх тата купіў разам з рыбкамі. І панёс акварыум у спальню, паставіў на стол. Потым схадзіў на кухню і прынёс яшчэ поўненькае вядро вады, выліў у акварыум. Коля толькі злёгку паварочваў галаву, каб паглядзець, што робіцца, і нічога не гаварыў. Нічога яго не цікавіла!

— Гадзіны праз дзве пусціш рыбак у акварыум,— сказаў тата і паналіваў у талеркі разагрэты боршч. Сабе не наліваў, не было калі ўжо сёрбаць, і пабег на работу.

Толя застаўся ў хаце поўным гаспадаром. Што хочаш, тое і рабі! Ад такой волі ў яго ажно галава закружылася...

Забыў пра боршч: кульнуўся некалькі разоў на дыване, паспрабаваў пахадзіць «на галаве». Упаў, балюча стукнуўся нагою, костачкаю, аб крэсла.

— Можа, табе яблычак кісленькі даць? А можа, кефіру? — прапанаваў ён Колю маміным голасам.

Коля скрывіўся, як серада на пятніцу: «Адчапіся!»

Тады Толя прынёс шахматную дошку з расстаўленымі фігурамі, паставіў яму на жывот.

— Белымі — я. Згуляем?

Коля грабянуў шахматы з жывата.

Толя раззлаваўся: хварэць хварэй, а рукам волі не давай! Але стрымаў сябе, моўчкі поўзаў па падлозе, пакуль не пазнаходзіў усе фігуры. Пачухаў макаўку — і ўспомніў: у нейкай кнізе, зусім нядаўна чыталі, хлапчукі скакалі «з парашутам».

— Ух, прыдумаў! Ух, і прыдумаў! — прынёс з калідора, з вешалкі, парасон. Не раскрываючы закінуў на шафу. Сам ступіў на мамін ложак, адтуль на спінку ложка, учапіўся рукамі за верх шафы. Падрыгаў нагамі — р-раз! — залез на шафу. Раскрыў парасон: — Ур-ра! — скокнуў на ложак. Пад нагамі ў яго штосьці трэснула.

Коля зацікавіўся, сеў у сваім ложку.

— Ух, здорава! Ух, здорава! — Толя не знаходзіў слоў.

— А ты пакладзі падушку — мякчэй будзе,— параіў Коля.

Толя паклаў дзве падушкі. Зноў палез на шафу.

— Гэй-гох! — рынуўся зверху на падушкі. Без парасона ўжо.

І другі раз нешта глуха трэснула. А з адной падушкі, дзе відаць была ружовая насыпка, з ражка вылецела жменька пер'яў, закружылася па спальні.

Не ўтрываў, вылез са свайго ложка і Коля. Стаў у нерашучасці...

— А-а, баязлівец! — Толя залез і скокнуў трэці раз. З падушкі выпырхнула яшчэ больш пер'я.

— Дасць нам мама,— сказаў Коля, але палез на шафу і ён. Пакруціўся там на кукішках, глянуў уніз. Не вельмі высока... Гоп! — скочыў і ён.

З падушкі вылецела воблачка пер'я.

Схамянуліся, пачалі лавіць, збіраць пёрцы, запіхваць назад у дзірку насыпкі. Потым сяк-так заслалі ложак, ускінулі на падушкі пакрывала. Было непрыгожа, не гэтак, як у мамы. Адразу пазнае, што тут была баталія.

Пасля скачкоў Коля выпіў крыху кефіру. Падумаў — сербануў разы два баршчу.

— Я цябе вылечыў! — радаваўся Толя. І ён крыху пасёрбаў баршчу.

Коля вярнуўся ў спальню. Пакуль Толя прыбраў са стала і таксама прыйшоў у спальню, рыбкі ўжо плавалі ў акварыуме. Толя разявіў рот, хацеў закрычаць: «Што ж ты нарабіў?! Тата казаў — праз дзве гадзіны!» Коля апярэдзіў яго:

— Мае рыбкі, што хачу, тое і раблю!

Рыбкі, здаецца, адчувалі сябе няблага, хоць вада і была мутная. Гупі ганяліся па крузе, нібы хацелі ўчапіцца адна адной у хвост. Неончыкі нерухома віселі сярод водарасцяў. Молі пасталі стаўма і штосьці дзяўблі з каменьчыкаў. Мечаноска стругала губамі водарасць, а мечаносец плаваў каля яе задам наперад, нібы хацеў ука-

лоць хваставым плаўнікам-«мячом». Адна куклянка нерухома ляжала на дне ў куточку акварыума, другая наўскос паўзла па шкле. Антэнывусы распусціла шырока ў бакі, пакалыхвала імі — мо вынюхвала спажыву?

— Галодныя... Усе галодныя...— здагадаўся Коля.— А тата не купіў корму!

— Забыў, мабыць.

— А мо рыбкам хлеба накрышыць?

— Яны не ядуць хлеба. У садзіку бачыў? Іх кармілі такімі чырвонымі чарвячкамі і сушанымі мікробамі,— сказаў Толя.

— Сам ты мікроба сушаная! Гэта цыклопы такія з ножкамі. Выхавацелька казала, Зінаіда Аляксееўна.

— Сам ты цыклоп з ножкамі! — пакрыўдзіўся Толя.

— А ты... А ты...— пачаў заікацца ад злосці Коля і кінуўся да Толі біцца.

Пакачаліся па падлозе. Сёння Толя хутка апынуўся наверсе. Але Коля раптам войкнуў і скрывіўся, давялося яго пусціць. Хворы ж! Пабег Коля са спальні.

А Толя пайшоў на кухню, бо сюды з акна даносіліся дзіцячыя галасы. Зазірнуў у акно... Ух ты! Якія хвацкія вароты дзеці зрабілі з магазінных цукерачных скрынак! Мог бы і ён з імі паганяць шайбу, нічога, што далёка да зімы. Але ж мама не дазволіла выходзіць... Во, Сцёпа Мармышка горла дзярэ, верхаводзіць... Таксама ў першы клас пойдзе. Ён амаль на паўгалавы вышэйшы за Толю і Колю.

Залез Толя на акно, стаў на дыбачкі, каб бліжэй была фортка.

— Гэй! У нас хамяк і рыбкі! У нас дзень нараджэння!

Пачулі!.. Сцёпа Мармышка абапёрся на клюшку і закрычаў угору:

— А які ну-умар!.. кватэры?..

— Пяцьдзесят!!! — зноў стаў на дыбачкі Толя. Сцёпа кінуўся ў пад'езд, за ім натоўп дзяцей, нават малая Танька з суседняга корпуса.

— Коля, ратуйся! Госці бягуць! — закрычаў Толя, саскочыўшы з акна.

На лесвіцы ўжо звінелі галасы, чуўся тупат.

## Выбух у кватэры

Толя адчыніў дзверы, і яго ледзь не стапталі ў парозе. Большасць — амаль незнаёмыя хлапчукі, толькі Мармышка і яшчэ адзін, Андрэйка, знаёмыя. А Сцёпа стаяў і ўсё ціскаў клюшкаю на кнопку званка.

— Перастань! — тузануў яго Толя за рукаў.

— Вы, значыць, адны! — упэўнена сказаў Сцёпа, ступіў цераз парог. Толю з дарогі адгроб, як штосьці лішняе.

Апошняя ўскарабкалася на пляцоўку Танька. Расчырванелася, ледзьве дыхае. Папрасілася вельмі ветліва:

— Можна і мне на ваш дзень нараджэння? Толькі ў мяне няма чаго падарыць...— паказала яна пустыя далонькі і ўздыхнула.

— Заходзь,— дазволіў ён. Толю спадабалася, што яна ўспомніла пра падарунак, а ніхто з хлапчукоў і не заікнуўся нават.

Дзеці ўжо тапталіся на кухні каля слоіка з хамяком. Не, хамяка ў ім не было, Гаўрык сядзеў у Мармышкі на грудзях.

— Лезь, лезь! — падштурхоўваў Сцёпа хамяка знізу. Але той учапіўся кіпцюрыкамі за куртку і палахліва паглядваў на дол. Відаць было, як ён дрыжыць і трасецца.

Толя зняў хамяка, даў патрымаць Таньцы. Яна атуліла яго далонямі, атрымалася нібы гняздзечка. Дзяўчынка ўся свяцілася ад шчасця, і сам Толя глядзеў на яе і радасна ўсміхаўся.

— Пусці, хай пабегае! — Сцёпа сілком прыгнуў Таньку за рукі да падлогі, вытрас з іх хамяка.— Ату яго! Ату! — патупаў нагамі, пляснуў далонямі.

Гаўрык з пуду кінуўся пад буфет.

— Ой, уцячэ! Ой, не зловіце! — замітусіліся дзеці. Некаторыя палеглі, каб зазірнуць пад буфет.

— Куды ён уцячэ, каратканожка? Волю яму давайце! У мяне быў хамяк, дык бегаў дзе хацеў!— сказаў Сцёпа і абмацаў вачыма стол, буфет, выцягнуў шыю і зазірнуў у каструлю на пліце.— А дзе ж... вашы рыбкі?

— У спальні! — сказаў Толя. Яму не падабалася, як паводзіць сябе Мармышка ў іх кватэры. Усе сыпанулі ў спальню, а Толя і Танька пасталі на калені, папрыцiскалі ён левае, а Танька правае вуха да падлогі.— Гаўрык! Гаўрычак! Гаўрунька! Бяжы сюды! — але хамяк так і не паказаўся з-пад буфета.

Толя яшчэ трошкі паляжаў вухам на падлозе, але глядзеў ужо не пад буфет, а любаваўся Танькай.

— Ён з кухні не ўцячэ, давай зачынім дзверы.— Танька ўстала і патузала Толю за рукаў.

У спальні было шумна. Дзеці тоўпіліся каля акварыума: хто заглядваў зверху, хто праз бака-

выя сценкі, а Сцёпа стукаў кіпцямі па шкле — пужаў рыбак.

— У мяне ў акварыуме была чыстая вада, а ў вас... Хіба вы малака налілі? — гаварыў ён.

— Тата казаў — пачысцее, адстоіцца.— Толя распіхаў хлапчукоў, каб і Танька ўбачыла рыб.

— Хіба гэта рыбкі? — пагардліва крывіў губы Сцёпа.— Камары! Во ў мяне былі — вялікія, залатыя!

— Нічога ў цябе не было! — падышоў да іх ссінелы, змучаны Коля. Ён пакрыўдзіўся за сваіх рыбак.— Брахун ты! Задавака!

— Заложымся, што былі? Ну — на што заложымся? — палез на яго Сцёпа.— А-а, спужаўся? Спужаўся! Шкада прайграць! Мы прадалі акварыум, як пераязджалі ў Мінск,— во!

Мармышка даў Колю пстрычку ў лоб і пачаў шныпарыць па спальні, заглядваючы ва ўсе куткі.

— А што тут у вас? — адчыніў шафу для адзення.— А тут? — падбег да татавага стала, тузануў шуфлядку. Павярнуўся да адной кніжнай паліцы-шафы, да другой.— Э-э, у нас больш кніг было, з прыгажэйшымі вокладкамі... Здалі ў магазін, як пераязджалі.

Расчыніў дзверцы ўнізе кніжных паліц, усунуў туды нос. «У-у-у, і тут кнігі...» Разагнуўся, адсунуў шкло, але не кнігу ўзяў, а празрысты, нібы шкляны, кубік: «Гэта што?» І не стрымаў зайздрасці: «Ух ты-ы...» У сярэдзіне кубіка бялеў караблік з белымі ветразямі. А прымацаваны быў кубік да вішнёвай непразрыстай падстаўкі-квадраціка.

— У нас таксама... У нас яшчэ лепшае было...— А што — Сцёпа не прыдумаў.

Кубік пайшоў па руках. Загаманілі: «А як караблік уставілі туды?», «Залілі шклом — і ўсё!», «Ён не сапраўдны, а намаляваны!».

— Э-э, цаца, цаца ды ў кішэнь...— забраў Мармышка кубік у Андрэйкі, хацеў нібыта паставіць на месца. Але не паставіў — падняў высока і — «ах!» —упусціў на падлогу.

З долу кубік і падстававачку паднялі асобна — разляцеліся ў бакі.

— Я незнарок... Незнарок я...— мармытаў Сцёпа.

Ні Толя, ні Коля яму не паверылі.

Пакуль яны шукалі які-небудзь клей, каб хоць крыху склеіць кубік і падстаўку, Мармышка зазлянуў за тыя паліцы-шафу, што стаялі крыху наводшыбе, не прытуленыя да сцяны. За іх можна было свабодна залазіць: там былі дзверы ў кладоўку.

— А-а... а тут у вас што? О, добрая схованка... У нас большая кладоўка, тапчан у яе засунулі. Бабуля там начуе.— Выйшаў, крутнуўся сюды-туды.

— Хамяк і рыбкі — і ўсё? Мне на дзень нараджэння велік купілі, марожанага, торта, напітку... І ў садзік дзецям цукеркі насіў... Кілаграм...

— І ў нас ёсць торт,— сказаў Толя і павёў дзяцей на кухню. Усе ўбачылі, што хамяк шмыгануў з-пад буфета пад пліту.

— Гэта такі торт?! Хэ-хэ-хэ! — Мармышка схапіўся адною рукою за выпучаны жывот, а другою паказаў на кавалак, што не даеў Толя.— Хэ-хэ-хэ!

Толя адчыніў буфет. Вось ён, торт, што спякла мама. І чатыры бутэлькі напітку «Церамок»... І нават цукеркі «Кароўка»...

Падаставаў усё на стол. Прыпасамі далей распараджаўся Мармышка. Не прайшло і колькі хвілін, як усё было парэзана на кавалкі, адкаркавана, разліта па шклянках і кубках, хоць і несправядліва. Цмокалі, сёрбалі, плямкалі, чмыхалі, саплі, аблізвалі пальцы. Пра Толю і Колю ўсе забыліся, торта ім не дасталося і дробкі. Ды яны і не хацелі яго. «Церамка» дала пакаштаваць са сваёй шклянкі Таня. І кавалачак торта ім пакінула: «У мяне ад салодкага галава баліць!» «А ў мяне ад салодкага зубы павыпадалі,— пахваліўся Андрэйка.— Во!» — разявіў шчарбаты рот, каб паказаць, і... укінуў апошні кавалачак.

— А цяпер давайце ў карагод! — сказала Танька.— Бярыцеся за рукі, ну! — Яна злавіла Толю і Колю за рукавы і заспявала тоненькім галаском: — Як на Толевы імяніны мы спяклі ўсім каравай... Ну, што ж вы? — Яна нецярпліва патупала ножкамі ў белых гольфіках і сініх туфліках.— Як на нашы імяніны...

Ніхто не хацеў станавіцца ў карагод.

— Давайце ў «кошкі і мышкі»!

— Давайце ў хованкі! — кожны крычаў сваё.

Пабеглі ў пакой — цесна было на кухні.

— Я лічу! — Таня затуліла далонямі вочы і пайшла да акна.— Адзін... Два... Чатыры... Тры... Пяць...— выкрыквала яна. А вакол заціхаў тупат і шоргат — хаваліся хто куды.— Пяць! Я ўжо іду шукаць! Хто не схаван, той закован! — Яна расплюшчыла вочы і ўбачыла, што на канапе сядзіць, трымаючыся за жывот, хмуры Коля.— Кую-кую Колю! — пастукала яна лінейкай па падаконніку.

— Я не гуляю,— устаў ён і пайшоў на кухню: яму было млосна і сумна. Таня за ім — мо хто на кухні схаваўся?

І тут са спальні сыпанулі хлапчукі, застукалі лінейкаю, вырываючы адзін у аднаго,— «адкоўваліся».

— Ах вы так! — Танька пакрыўджана закусіла губу.— Я зараз знайду! Некага знайду...

Яна глядзела пад ложкі, за парцьеры, пад стол, зазірнула за паліцу-шафу: Мармышкі і Андрэйкі не было. Паспрабавала адчыніць дзверы ў кладовачку — яны былі зашчэплены знутры.

— Эй, я ведаю, вы тут. Вылазьце!

Ніхто не адгукаўся.

На дапамогу прыйшоў Толя, пастукаў у дзверы кулаком:

— Вылазьце, мы вас знайшлі!

І ўсе пачалі крычаць: «Выходзьце!»

Маўчанне...

— Ну і сядзіце там! Мы вас не выпусцім! — сказаў Толя і забразгаў зашчапкаю. Зашчапіць не паспеў — у дзверы штурханулі знутры. Толя падпёр дзверы плечуком, а потым перавярнуўся — спінаю. Рукі выставіў і ўпёрся ў паліцы-шафу. Ду-дух! — грымнулі з кладоўкі зноў, і дзверы таўханулі яму ў спіну, а Толя штурхануў паліцы. Шкло ў паліцах зазвінела, затрэслася... Напор не слабеў, а мацнеў, і Толя ўпіраўся што ёсць моцы, але не мог справіцца з двума.— Памажыце-е!!!

Усе стаялі і глядзелі, толькі Танька ўперлася з другога боку паліц, крахтала: «Не пад...да...вайся!»

Напор аслаб, паліцы пахісталіся ў яе над галавою, сталі на месца, супакоіліся.

Зноў націск... Толя раптам адчуў, што паліцы больш не памагаюць упірацца, а ...уцякаюць ад яго рук! Ой, ухапіць бы іх, затрымаць... Рынуліся паліцы ўніз, у кутку пасвятлела...

— Танька-а!!! — нечы не крык, а лямант.

Аглушальна гахнула... Звон, трэск... Здрыгануліся падлога і сцены, адляцелі, пасунуліся ўбок татаў і мамін ложкі, якія стаялі побач сярод пакоя.

Толя ўбачыў Таню — жывую! Яна круціла пальчыкам у вуху і трэсла галавою. Аглушыла! Каб на якую пядзю бліжэй, то і па ёй...

Хакнулі ўсе, выдыхнулі паветра. Заварушыліся...

— Ну — я дадому...— Сцёпа бачком, бачком абышоў перакуленыя паліцы, пакаўзнуўся на шкляных асколках.

— І я... І мы...— Дзеці хуценька вымеліся з кватэры.

— Што цяпер бу-у-удзе...— працягнуў Коля і схапіўся за горла. Яго зноў занудзіла — ужо ад страху.

«Танька жывая... Танька... не трапіла пад шафу!..» — Толя выцер спацелы ад страху лоб.

— Спакойна... Галоўнае — спакойна,— сказала Таня голасам дзяўчынкі-бабраняці з нейкага мультфільма. Грабанула рукою ў кучу асколкі і адразу парэзала пальцы. Не плакала, а глядзела, як зрываюцца на падлогу кроплі крыві. Глядзела і на левую нагу, дзе асколак рассек гольф і краі рассечанага таксама набрынявалі чырвоным.

З-пад паліц відаць адарваныя дзверцы. Пасечаныя асколкамі кнігі, асколкі шкла грувасціліся не толькі каля паліц, але разляцеліся і па ўсім пакоі. А ложкі не проста адсунуліся — у татавым адбіта спінка, адарвана бакавая дошка.

І тут зазваніў тэлефон. Званіла мама, хацела пакіраваць Толем і Колем. Толя пачаў расказваць ёй пра ўсё і не змог расказаць — расплакаўся ў

трубку. А потым крычаў: «Ало! Ало!», а трубка піпікала кароткімі гудкамі і маўчала. Мабыць, маме зрабілася кепска і ёй рабілі «хуткую дапамогу».

— Спакойна, я вас не пакіну... Я ў вас буду, пакуль тата і мама накрычацца... На мяне ніколі мама моцна не сварыцца пры чужых. Я пабуду — добра? — тузала Таня Толю за рукаў.

А ён сядзеў пад тэлефонам і ўмываўся слязьмі. Яму нікога не хацелася слухаць.

Яму хацелася ўцячы з дому назаўсёды.

## Танька выратоўвае «ваякаў-баякаў»

— Ты ўвесь выплакаешся, адна лупінка застанецца... І ў мяне парэзаны пальцы і нага, а я не плачу,— Таня дастала з аднаго рукава насовачку з намаляваным грыбком, з другога— з ягадкамі і паспрабавала выцерці Толю адною нос, а другою — вочы. А ён круціў галавою, не даваўся.— У цябе колькі насовак? — пытала Таня.— У мяне адна на слёзы, адна на нос, адна на губы...

Толя перастаў хліпаць, прыслухаўся, што яна гаворыць.

— Які ваш торт смачны! Як ён называецца, дзе вы яго купілі?

— Самі спяклі,— буркнуў Толя.

— Ой, скажу маме, каб рэцэпт узяла. І «Церамок» смачны, і «Церамок» самі рабілі?

— Куплялі. Адстань!

— А мы давай усё збяром шчоткаю і саўком. І ў вядро! — надумала Таня.— Прыбяром усё — і слядочка не будзе.

Толя пакорліва схадзіў на кухню і прынёс шчотку, савок і вядро. «Шпінгалетка... І пяці гадоў мо няма, а камандуе!»

— І ты не ляжы! — накінулася Танька на Колю, бо той улёгся ў свой ложак і знарок моцна вохкаў і крывіў твар.

— А я не куляў паліц! Я не вінаваты!

— Ну і што, калі не куляў! Усе гулялі, усе і кулялі, усе вінаватыя,— сказала Таня.

Толю спадабаліся яе словы.

Коля вылез з ложка, неахвотна падняў адну кнігу, другую.

Працёр рукавом, паклаў на стол. Учапіліся ў паліцы ўтраіх — «Уп-па! Уп-па!». Толькі крыху з месца зварухнулі.

— Во, як кінжалам кніга прабітая...— Коля цярнуў кнігу рукавом.— Да сярэдзіны асколак убіўся. І паркет пасечаны, падзяўбаны... Ой! — войкнуў ён і задраў локаць да вачэй.

Толя і Таня ўбачылі: востры шкляны зуб урэзаўся ў руку каля локця. Таня хуценька выхапіла асколак, кінула ў вядро.

— Вой, там яшчэ, мабыць, адломак сядзіць! Да сэрца далезе! Вой, паміраю! — затупаў Коля нагамі.

— Я бінт прынясу! — Пабег Толя на кухню, дзе вісела аптэчка.

— Закасвай рукаў! Хуценька! — камандавала Таня.— У мяне ёсць трэцяя насовачка, яна чыстая!

Коля, хныкаючы, закасаў. З невялічкай ранкі сачылася кроў. Таня смела пачала закручваць руку насоўкай. Хапіла толькі раз агарнуць і завязаць вузельчык.

— Кладзіся ў ложак, інвалід! — загадала яна.— Градуснік паставім... Ёсць градуснік?

Толя прынёс і бінт, і градуснік.

— Во, пад паху... Я ад градусніка адразу папраўляюся.— Таня старанна прыкрыла Колевы ногі коўдраю.

Зноў збіралі асколкі. Хутка бінт спатрэбіўся і Толю, і ёй. Рэзалі бінт на кавалкі, завязвалі адно аднаму далоні, пальцы. Зноў збіралі... Зноў бінтавалі... Вялікія абломкі шкла не лезлі ў вядро. Толя ўзмахваў — дзын-н! — біў іх аб падлогу. Асколкі разляталіся па ўсёй кватэры.

Калі ў дзверы пазванілі, то першы раз і не пачулі — так захапіліся работаю. А потым пачулі, і Толя збялеў — «Мама!».

— Кладзіцеся! Абодва! Хутчэй, ваякі-баякі! Вы — хворыя! — выпаліла Танька, як з кулямёта, і пабегла адчыняць.

— Ой, добра, што адчыніла... Не магу ў дзірку ключом пацэліць — так рукі дрыжаць,— пачуўся мамін голас.— А тыя хуліганы дзе?

— Добры дзень, цёця Каця! Як вы пажываеце, як ваша здароўе? — Галасок у Танькі такі мілагучны, такі прыветлівы.

— Здароў, здароў! — пачуўся і татаў голас.— І ты ў нас? А Толя і Коля дзе?

— У нас усё ў чыстым парадку... Яны цяжка захварэлі...

— Вой...— пачуўся мамін голас.

— Не-е, ім ужо куды лепш! — папраўлілася Танька.— Дзядзька Міхась, а ў вас на рабоце землетрасення не было, вас не трэсла? А нас так трэсла, усё пераварочвалася. Мы тут ратавалі, ратавалі, пазабінтоўваліся...

— Землетрасенне?! — перапытаў тата, ідучы ў спальню.

Спыніліся ў дзвярах і ён, і мама, і Танька. Толя і Коля адразу моцна застагналі, і мама схіснулася, учапілася за вушак дзвярэй.

— Вы—жывыя?! — скокнуў тата цераз раскіданыя кнігі да Толі, а мама — да Колі.

— Торт быў не свежы, патруціліся,— прастагнаў Коля.

— І паліцы... Ад землетрасення...— выставіў Толя, каб паспачувалі, забінтаваныя рукі.

І Коля паказаў завязаную руку, і Танька — нагу і пальцы.

— Я гэтага не перажыву! На тысячы рублёў шкоды! За адзін дзень! — Мама пакінула Колю і лазіла па кнігах, мацала шафу, татаў ложак.

— Нічога, магло быць і горш,— сказаў, уздыхнуўшы, тата. Ён адзін — ну і сілач! — падняў паліцы. З іх вывалілася яшчэ некалькі асколкаў і кніг: дзын! ба-бух! — Будзем самі, то будуць і сані,— тата пачаў змятаць у кучу рэшткі шкляннога друзу.

— А я ж табе казала! Я ж цябе прасіла-маліла: не стаў паліцы далёка ад сцяны, прытулі іх да кладоўкі. Чорт з ёю, абыдземся без яе... Дык не паслухаў! Ні разу ў жыцці не паслухаў! — заплакала мама.

— Параста-а-ань...— гаварыў спакойна тата.— Ці званіла ты бабе?

— Званіла! Але калі яна яшчэ прыедзе! За гэты час яны ўсю кватэру ўшчэнт разнясуць! Або спаляць!

— Што яны — такія ўжо дурні, каб паліць?

І ўсё-такі навальніца мінalася. Толя першы зразумеў гэта і сеў у ложку. Пазяхнуў, пацягнуўся — і вылез памагаць тату збіраць кнігі.

— Трыццаць шэсць і пяць,— дастаў Коля з-пад рукі градуснік.— Нармальная...

— То я пайду ўжо. Заставайцеся жывыя і здаровыя! — ветліва развіталася Танька.

Толя выйшаў за ёю — правесці, за імі — тата.

— Можна я да вас буду прыходзіць рыбак і хамяка глядзець?

— Можна, можна.

У спальні пачуўся звон шкла. Гэта мама ўзяла сябе ў рукі і пачала выграбаць асколкі з-пад ложкаў.

## Акрабат у бутэльцы

Учора, як усё падмялі, падчысцілі падлогу пыласосам, пасартавалі, працерлі і зноў расставілі кнігі на паліцы (без шкла ўжо!), шукалі хамяка. Пераставілі на кухні і ў ваннай усе рэчы, заглядвалі ва ўсе закуткі, потым агледзелі добра абодва пакоі — а раптам перабраўся туды? — нідзе Гаўрыка не было. Толя паплакаў ды так і лёг спаць.

— Ого! — раніцаю выгукнула мама і паклікала да сябе тату.— Бачыш? — паказала яна на скрынку з буракамі і морквою.

І буракі, і морква былі пагрызены. Значыць, хамяк усё-такі на кухні? Але дзе? Не мог жа ён залезці пад падлогу — няма такое шчыліны.

Зноў пераглядзелі ўсё — няма!

— От купіў забаўку! — зазлавала мама.— Толькі і будзем цэлымі днямі шукаць.

Раптам мама пачула пад плітою ціхі шкробат. Нагнулася, пераставіла паасобку слоікі, бутэлькі... Аг-га! Вось ён, у бутэльцы з-пад кефіру. Мокры, ускамлычаны і такі малюпасенькі, худзенькі... І так знябыўся, небарака, такі быў змучаны! І гэтак вінавата глядзеў праз бутэльку на маму!

— Ну і дурань! Свет не бачыў такога дурня! Сам сябе пакараў. Нябось усю ноч шкробся ў бутэльцы? Галодны? — Тата вытрас Гаўрыка з бутэлькі, выцер сухою анучкаю, пагрэў яго ў далонях, пахукаў. Даў кавалачак варанай бульбы, і хамяк імгненна засунуў яго за шчаку. Паклаў Гаўрыка ў слоік. Хамяк патузаў зубамі сваю шкарпэтку-гняздзечка, падлез пад яе.

Як толькі хлопцы ўсталі, тата расказаў ім пра хамяковыя прыгоды. Толя і Коля паўкленчвалі каля слоіка і ўсё шапталі, заглядваючы ўсярэдзіну: «Хамячок... Гаўрык... Хамячок... Гаўрык...»

— Як ён мог туды трапіць? Чаго ён лез на бутэлькі? І як мог ускарабкацца на такія гладкія? — разважаў тата за сталом.

— Дай хлопцам пад'есці спакойна,— сказала мама.

Але тата не вытрываў, не дапіў нават чаю, а стаў каля пліты на калені, заглянуў пад ніз.

— Ён лазіў у каробку з буракамі, з каробкі на слоік паўлітровы, з паўлітровага — на літровы, з яго — на бутэльку. Балансіраваў, як акрабат-канатаходзец...— гаварыў тата.— У пліце дзірачкі спадыспаду ёсць, паветра па іх ідзе ў духоўку. От яго і спакусілі гэтыя норкі... Праверыць трэба духоўку!

Усе стоўпіліся каля пліты, а мама адчыніла дзверцы і павымала скавароды, бляхі, запаліла запалку, а потым паперку — каб даўжэй свяціла.

— Ай-яй-яй, во назапасіў... Во нанасіў! — Мама выграбла кучкі нагрызенай морквы і буракоў, сухія скарыначкі і крошкі хлеба, усохлыя агрызкі і зярняткі яблык, семкі сланечніку. З другога кутка дастала камяк поўсці і нітак, пашкуматаны кавалачак бінту, раскудлачаную газету, камячок ваты.

— Холадна ад жалеза ў бок, пасцель сабе рабіў... Добра, што агледзеліся, не падпалілі духоўку.

— Во было б! — паківаў галавою тата.

Хлопцы са страхам пераглянуліся: у такую пастку мог Гаўрык трапіць!

І адразу захацелася паглядзець на яго. Адгарнуў Толя паціху шкарпэтку-гняздо... Спіць на голай газеце! Лёг на бачок, скруціўся паўабаранкам... Мёртвым сном спіць... А ў лапцы трымае, як дзіця піражок, недаедзенае пшанічнае зярнятка.

— Напрацаваўся за ноч... І напакутаваўся ў бутэльцы. Відаць, што начная жывёлінка. І любіць запасы рабіць. Ні сну, ні спакою няма, пакуль у запас не пакладзе чаго.

Тата сказаў гэта і раптам охнуў.

— Гэта ж у мяне ў плашчы сухі корм для рыбак! Забыў выняць.

З пакецікам «сушаных мікробаў» і «цыклопаў з ножкамі» пайшлі ў спальню да акварыума. Тата ўзяў у тры пальцы гэтага дабра, сыпнуў на ваду. Корм быў падобны на дробнае шэрае шалупінне.

Рыбкі ўсплывалі наверх, хапалі цыклопаў, дробненька варушылі губамі. Дзіва, выходзіць, што рыбы таксама жуюць! А ў моляў раты вялікія, ніжняя губа адкідваецца, адвісае ўніз, як

пад'ёмны мост у рыцарскім замку. Бачылі Толя і Коля такія масты і замкі ў нейкім фільме.

А якія куклянкі мудрыя і хітрыя! Не лавілі па адной церушынцы, а дапаўзлі па сценцы да самай паверхні вады, пагарнулі з падэшваў ног лейкі і давай у іх засмоктваць, сцягваць усё, што плавае. Трымаліся за шкло толькі невялікім лапікам падэшвы, тым, што знізу. Прыгледзеліся Толя і Коля — а падэшвы ж не зусім і гладкія! На іх хвалямі ідуць, варушацца мяккія, ледзь прыкметныя адростачкі, яны і сцягваюць у лейку вадзяную плёнку. Цыклопы трапляюць на дно лейкі, потым камячок іх куклянка пасоўвае яшчэ далей пад нагу, каб вызваліць месца ў лейцы для новай здабычы. То адна, то другая пераставала адфільтроўваць корм, разгортвала лейку. З кацёлак высоўваліся рагатыя галоўкі з вочкамі-булавамі, згіналіся пад нагу да самага корму. Хап-хап, цмок-цмок, нават бліскала штосьці жоўтае ў роце — мо зубы? Усё з'едзена, зноў галава адгінаецца, хаваецца ў кацёлку, зноў з нагі робіцца лейка...

— Ну — папрыліпалі ўжо! Ідзіце, канчайце есці! — паклікала мама з кухні.

Уздыхнуўшы, хлопцы паадрываліся ад акварыума.

## Развітальны дзень

Тату прыйшла ў галаў добрая думка: чаму б не схадзіць у нядзелю ў Батанічны сад? І адпачнуць, і з летам развітаюцца.

І вось яны выбавіліся з тралейбуса на патрэбным прыпынку. Пакамечаныя, здушнелыя, назла-

ваныя. Тата валачэ ў руцэ цяжка напакаваную сумку. З другога боку ўчапілася за яго локаць мама. «На людзі» яна абула новыя туфлі, і яны цісннуць і рэжуць ногі. Толя ўчапіўся за татаву сумку, Коля — за левую маміну руку.

Такая думка прыйшла ў гэты дзень да многіх мінчан. Ад каланады, што каля ўвахода ў Батанічны сад, па ліпавай алеі валам валіў народ. Дзяцей і вялі, і неслі, і везлі ў калясачках, чародкі хлапчукоў прабіваліся скрозь людскую гушчэчу, абганялі дарослых.

— Батанічныя сады робяцца для таго, каб сабраць дзівосы раслліннага свету, паказаць іх людзям,— расказваў тата, пакуль стаялі ў чарзе да касы.— У садзе нельга нічога рваць, можна толькі глядзець...

— А нюхаць можна? — папытаў Коля сур'ёзна.

— Можна,— адказаў тата.

Як толькі іх прапусцілі праз варотцы, Толя і Коля адразу закружылі, забегалі то ўправа, то ўлева, зноў вярталіся, нецярпліва пазіралі на тату і маму: ну чаму яны так марудзяць? Чаму ідуць сюды, а не туды? Чаму не глядзяць на грэцкія арэхі? Яны ж вісяць над самымі галовамі, варта толькі руку працягнуць...

— Зялёныя, зялёныя...— гаварыў тата, каб супакоіць іх.

На ўсіх дарожках, на ўсіх сцежках, каля кожнай градкі і клумбы стаялі або павольна хадзілі людзі. Дарослыя ўголас чыталі надпісы на таблічках, што былі ўторкнуты пад дрэвамі, кустамі, каля градак з кветкамі. І не стрымліваліся: «Ах, якія гладыёлусы!» Каля астраў: «Ах! Ах!» Каля вяргіняў: «Ах! Ах! Ах!» І нюхалі іх, і

ўздыхалі, і бясконца фатаграфаваліся. А Коля ўлазіў у чужыя фотакадры, перашкаджаў людзям здымацца, абнюхваў кожную кветку.

Зусім побач, за плотам, быў парк, адтуль далятал гам і віск, грукат і гул — там працавалі атракцыёны. Толя і Коля пазіралі ў той бок і ўздыхалі, яны стаміліся ўжо глядзець на кветкі і дрэвы.

Ішлі па дубовай алеі, потым па яблыневай. Яблыневая дугою агінала пладовы сад, на дрэвах чырванелі невялікія райкі.

— Нельга рваць яблык,— гаварыў тата.

Але і ён, і мама, і хлопцы бачылі, як там і тут уздрыгвае голле, шастаюць па яблынях хлапчукі. Не ўтрывалі Толя і Коля, завярнулі пад адну яблыню, паднялі некалькі падалак. Абцерлі, пакаштавалі — смачныя.

Тата хутчэй збочыў у сасоннік і бярэзнік. І тут хадзілі людзі — не па сцежках, а па траве, глядзелі пад ногі. «Нельга тут ірваць грыбы!» — толькі паспеў сказаць тата, убачыўшы маленькую сыраежку, як Толя закрычаў на ўсё горла: «Баравік!» — і хуценька схапіў з-пад маладой сасонкі такога прыгажунчыка, такога здаравячка... Палюбаваліся, паклалі ў сумку. І закружылі вакол таго месца, паўгіналі галовы, нібы пачалі прынюхвацца. «Пасярод горада — баравік! Падумаць толькі!» — на тату напаў грыбны азарт. Але ўрэшце тата спахапіўся: «Ф-фу, што гэта мы?! У лес паедзем па грыбы, у лес...»

Уперадзе сярод блакітных ялін засвяціўся вялікі прагалак. Возера! На ўзлеску міліцыянер прабіраў цётку з дзяўчынкаю: у дзяўчынкі на галаве жаўцеў вянок з лугавых кветак, у цёткі ў

руках — вялікі букет. Дастаў міліцыянер кніжачку квітанцый, будзе браць з іх штраф.

— Ну і народ! Сказана — нельга тут нічога рваць! — голасна гаварыў тата, як ішлі міма. Ён ужо забыў, як сам толькі што ледзь не на каленях поўзаў, каб знайсці яшчэ аднаго баравіка.

Па берагах возера густа тоўпіліся людзі, ажно не відаць было з-за іх вады. Дзеці прарэзліва ўскрыквалі: «Мама! Тата! Во, во!!!» Дарослыя выгуквалі больш стрымана: «Ай-я-яй! Як палена! І вунь плюхнула... І вунь!», «Хлеб у лебедзяў адбіраюць!», «Гэта ж столькі карпа развялося!».

Мама не глядзела ні на рыб, ні на лебедзяў, яна дакульгала да лаўкі і ўпала на яе без сілы. А хлопцы прашыліся скрозь натоўп і таксама заахалі: вада паўз берагі чарнела ад рыб-малявак. «Вы адсюль зірніце, адсюль!» — паклікаў іх да сябе босы хлапчук. І Толя, і Коля, і тата зайшлі супраць сонца, паглядзелі на сярэдзіну возера. І не паверылі сваім вачам: у вадзе спаважна праплывалі вялізныя рыбіны-пачвары.«Мо па пуду! Няўжо могуць карпы такімі вырасці?!» А нейкі дзядзька з абветраным, загарэлым тварам ажно стагнаў: няйначай, гэта быў рыбак.

Потым ішлі вакол возера і ў прасветах паміж людзьмі бачылі часам, як спаважна і ганарыста плаваюць чорныя і белыя лебедзі, як жыруюць каля астраўка з чырвона-зялёным домікам качкі (дзікія качкі!), як плавае на лодцы каля астраўка дзядзька — мо лічыць птаства?

У бярозава-дубовым гаі зрабілі полудзень. Толя і Коля сядзелі на дзіўнай лавачцы з палавінкі бервяна і з такім апетытам елі і памідоры, і

бутэрброды, і малако з булкаю, што тата і мама аддалі ім і свае бутэрброды: «Ешце! Ешце! Вас знарок трэба прыводзіць сюды есці...»

Зрабілі паўкруг па гаі і па бярозавай алеі дайшлі да фантанчыка і плантацый ружаў. Вецер раздзімаў султаны пырскаў, і ў іх пералівалася ўсімі фарбамі вясёлка. Толю і Колю не хацелася ўжо любавацца ні ружамі, ні фантанам. Яны зноў пачулі шум, які далятаў з парку, з атракцыёнаў.

— А ў парк? Мы з паркам не развіталіся! — зацягнулі хлопцы.

— А што? Можна было б за адным заходам... Калі яшчэ выберамся сюды! — згадзіўся ўжо тата.

— Не-не-не! Я ледзь жывая! Ногі парэзала...— запратэставала мама.

— Мамачка, ты пасядзіш на лаўцы! — угаворваў яе Толя.

— Мы цябе ні ў «халі-галі», ні ў цэнтрыфугу не будзем засоўваць! — дабаўляў Коля.

Але мама была няўмольная.

Павярнулі дамоў. Мама вісла на татавым плячы, Толя і Коля хныкалі і ледзьве валачылі ногі. У тралейбус і з тралейбуса тата іх зносіў і выносіў амаль на руках. А як толькі зайшлі ў свой пад'езд, мама паскідала туфлі і сунула іх у сумку. Узбіралася, чапляючыся за парэнчы, падцягваючы сябе. А Коля апошні пралёт лесвіцы адольваў рачком, па-сабачы. Мабыць, для смеху...

І толькі ўскарабкаліся на сваю пляцоўку, як убачылі: каля дзвярэй на вялізным чамадане сядзіць нейкая пажылая цётка ці бабуля, гаротна падперла шчаку далонню. Перад ёю на другім чамадане, крыху меншым, сядзіць Танька. Размахвае рукамі, штосьці расказвае — забаўляе бабулю.

— З’явіліся, бадзягі...— уздыхнула незнаёмая, убачыўшы іх.

— Ой, мамачка!..— працягнула да яе рукі Толева і Колева мама.

## Бабуля прыблудзілася...

— А я вас цэленькі дзень чакаю! — пацалавала бабуля маму.— Усе глядзелкі праглядзела, усе чаканкі прачакала...— пацалавала тату.

— А чаму ж вы тэлеграмы не далі? Мы б падскочылі ў аэрапорт, на машыне прывезлі б,— гаварыў тата з папрокам і адмыкаў дзверы.

— Сюрпрыз! Вы ж не чакалі мяне так хутка... Думала, сюрпрыз зраблю.— Бабуля нагнулася да Колі, расцалавала ў абедзве шчакі, потым перацмокала шчокі Толі.— Вялікія ўжо хлопцы, вялікія! Малайцы!

— Ажно мы табе сюрпрыз зрабілі,— сказала мама.

— Толя, а бабуля спачатку ў другі корпус прыблудзілася, таксама ў пяцідзесятую кватэру,— сказала Танька і спалохана паглядзела на бабулю — мо не трэба было выдаваць такі сакрэт! — І там вашу бабулю за сваю прынялі!

— Ага! І там двое хлопчыкаў роўненькіх. Пытаю: «Чакаеце бабулю?» — «Чакаем!» — «А як вас завуць?» — «Віця і Жэня».— «Ой, то я, мабыць, не ваша...» — «Наша, наша!» — крычаць. А прозвішча я забыла папытаць... Пааддавала падарункі... А бацькоў іх няма, на базар паехалі. Ну — вярнуліся тыя бацькі, бачу — не тое. То ўжо і нядобра было назад падарункі забіраць.

— Толя і Коля — вялікія хлопцы, яны і без падарункаў абыдуцца. Праўда ж? — Тата паглядзеў на сыноў.

Але яны нічога не сказалі, адвярнуліся.

— Часцей трэба прыязджаць. А то гадоў мо пяць не былі.— Мама кінула ў куток калідора туфлі.

— Па годзіку Толю і Колю споўнілася, тады была,— прыпомніла бабуля.— А я вам куплю гасцінцы, куплю!

— Я вашу бабулю да нас у госці запрашала. А яна не захацела! — з крыўдай у голасе сказала Танька.

— Мяне і ў той, пяцідзесятай, пакідалі пачакаць. Але нашто ж мне валачыцца па чужых кватэрах? — Бабуля распранулася, павесіла плашч і крутнула галавою, паправіла далоняй валасы. І ўсе ўбачылі, што бабуля яшчэ маладжавая, чырванашчокая і нават стройная.

— Ох, пайду перадыхну, бо з ног падаю.— Мама павярнула ў пакой, а не на кухню.

— Ідзіце, ідзіце, пагаварыце там... Я сам збяру на стол! — сказаў тата.

А дзеці хутчэй пабеглі ў спальню паглядзець рыбак.

— У лебядзіным возеры — во такі-і-ія рыбы! Во такенны акварыум на іх трэба! — Коля спачатку развёў рукі ў бакі, як заядлы рыбак, а потым узмахнуў над галавою, нібы хацеў ахапіць увесь пакой.

— Як кракадзілы! Лебедзі баяцца плаваць, каб іх не праглынулі,— сказаў Толя.

— Ой, ім жа страшна спаць на вадзе! — схапілася за шчокі Танька.

— Не бойся, яны ў домік залазяць спаць,— сказаў Коля.

— Не домік — цэлая кватэра: два пакоі, душ з ваннаю,— дабавіў Толя.

Танька засмяялася, зразумела: разыгрываюць!

Тым часам у пакоі мама скардзілася бабулі на хлопцаў. Гэта ж такія шкоднікі, такія шкоднікі! На дзень нараджэння такі пагром учынілі...

— Без дагляду, што ж ты хочаш,— сказала бабуля.— Ну — у мяне дысцыпліна будзе жалезная.— І яна расказала, чаму ўдалося так хутка прыехаць: — Якраз на пенсію выйшла летам... На курорт з'ездзіла — і няма больш чаго рабіць. Кідаюся адна ў кватэры, як звер у клетцы. Хацела зноў ісці прасіцца на работу...

А ў спальні Танька голасна чытала Толю і Колю «лекцыю».

— У майго таты ёсць «Жыццё жывёл». Во-о такая кніга! — развяла ў бакі рукі.— І малюнкі ўсякія каляровыя. І мой тата сказаў, што жывёл нельга лавіць і ў хаце трымаць ці ў звярынцах, заапарках. Гэта для іх няволя, а ў няволі яны не такія, як на волі. Зусім-зусім не такія! Звяроў, птушак і рыб трэба ў прыродзе наглядаць. А ў няволі яны не жывуць, а мучацца і паволі паміраюць.

Пачула іх гаворку бабуля, прыйшла ў спальню.

— Танечка, твой тата праўду гаворыць: жывёлы паводзяць сябе ў няволі ненатуральна. Але людзі дваццатае долі таго не ведалі б пра жывёл, птушак і рыб, што зараз ведаюць. А чаму? Заапаркі, звярынцы і запаведнікі памаглі ўведаць.

— Пра зуброў!..— крыкнуў тата з кухні. Ён ужо кухарыў як мае быць, бо адтуль пахла дымам.

І бабуля адразу здагадалася, што тата хацеў сказаць.

— Ага, зубры зусім перавяліся б, каб не захавалася колькі штук у заапарках. На волі ніводнага жывога не засталося. Выпусцілі з заапаркаў, развялі... А во гэтыя рыбкі... Ой, я з самага дзяцінства марыла мець акварыум! А разводзіла кактусы... І сюды папрывозіла іх... Ага, дык гэтыя рыбкі, што ў вас, паходзяць з якіх-небудзь рэк ці азёр Афрыкі, Інданезіі, Цэйлона. А каб пусціў іх туды зноў, то мо і жыць не змаглі б. Адвыклі! А колькі акварыумных рыбак самі акварыумісты вывелі, такіх і ў прыродзе няма.

— Акіянарый! — зноў крыкнуў тата і закашляўся. Дым з кухні валіў клубамі.

— Ага,— зразумела яго бабуля.— А марскіх жывёл і рыб, думаеце, як вывучаюць? Доўга ж пад вадою не ўседзіш... Вось для іх і будуюць вялізныя акварыумы — акіянарыі. Бачылі ў кіно дэльфінаў?

— Бачылі! У іх такія вясёлыя мордачкі! — закрычалі дзеці.

— Во... У акіянарыях і дэльфінаў вывучаюць...— Баба падняла ўгору ўказальны палец.— З сённяшняга дня будзем весці назіранні. Усё, што заўважым, запішам у дзённік — і пра рыб, і пра хамяка.

— Прашу за стол! — з'явіўся ў дзвярах тата. Твар яго быў чырвоны і спацелы.

Усе пайшлі на кухню, павялі з сабою і Таньку.

— О, у вас пельмені... Я так люблю пельмені без халацікаў,— сказала Танька.

— Прыгарэлі...— развёў тата рукамі.— І яечня падгарэла. Я кансерваў наадкрываў, будзем налягаць на кансервы...

— Нічога,— суцешыла яго Танька,— я і кансервы люблю.

Мама змоўчала, нічога не сказала.

## З «Дзённіка назіранняў»

«Адна куклянка, мабыць, хворая. Сядзіць нерухома ў куточку, толькі не ўнізе, а каля паверхні вады. Калі яна перапаўзла? Ноччу? Некаторыя расліны (лімоннік) моцна пагрызены.

Ці не куклянкі ўпадабалі водарасць? Значыць, яны ноччу не спяць.

Другая больш рухавая. Калі сыпнеш сухога корму, чуе мо праз секунду. Адразу размахвае вусамі і паўзе ў той бок. Калі ж усыплеш мала, двух-трох цыклопаў, шукае іх доўга, нервуецца.

Бачылі, як дыхае куклянка. Дабярэцца па шкле да паверхні вады, выпусціць сантыметры на два ўгору трубку-шланг і дыша, дыша, ажно раздзімаецца яе цельца, падымаецца-апускаецца кацёлка. Дыхальная трубка ў яе справа ад галавы, калі глядзець ад падэшвы нагі. Кончыць дыхаць-пампаваць і трубку ўцягвае, пакуль не застанецца ад яе нейкі пупышак.

Часам зачыняе накрыўку наглуха і ападае на дно, ляжыць нерухома. Спіць? Калі ж лазіць па шкле, то або ўгору, або наўкос угору. Уніз паўзці не любіць, робіць з падэшвы-нагі начовачкі-крыло і падае, плануе на дно.

Бачылі раз, што большая куклянка падбірае з дна жывы корм — чырвоных чарвячкоў, лічынак трубачніка. Нават жывых! Дык што — куклянкі не толькі санітары, але і драпежнікі?

Молі чорная з'ядае ў чатыры-пяць разоў больш корму за самца. Кідаецца на чарвякоў маланкава, іншых рыб ад кармушкі адганяе. Самец праглыне аднаго-двух і больш на іх увагі не звяртае. Часам любіць шморгаць губамі па шкле ўгору-ўніз. І мечаносцы гэтак робяць. Мечаноска некалькі разоў ужо, наеўшыся, з разгону церлася-білася жыватом аб камяні.

Захварэла? А мо проста аб'елася і гэтак робіць сабе масаж?

Хамяк удзень спіць моцна, да непрытомнасці. Але, калі пакласці што смачнае, пачуе ўраз. Нават вачэй не расплюшчвае, вылазіць са схованкі, хапае яду і валачэ ў свой склад. Зноў завальваецца спаць.

Спрабавалі пускаць яго на ноч гуляць на кухні. Грызе дзверы знізу, ажно трэск стаіць, хоча вылезці, каб пабегаць па ўсёй кватэры. І кухня для яго цесная! Давялося злавіць, каб не перашкаджаў спаць, і пасадзіць назад у слоік.

Тата абяцаў зрабіць яму домік з фанернай скрынкі. Мо ў доміку яму будзе лепш?»

## Бабуліна слабасць

— Што яшчэ? Што? — дапытвалася бабуля ў хлопцаў. Ручку пакручвала ў пальцах, вымазалася чарнілам.— Значэнне мае ўсё-ўсё. Падумаеш — дробязь, махнеш рукою, а тады будзеш гадаць: адкуль што ўзялося? Чаму такое нарабілася ў акварыуме? Акварыум — не жартачкі.

Як згаварыліся тата з бабуляй. І тата казаў, што акварыум — не простая рэч, і чухаў патыліцу.

І Танька хныкала, што акварыум для рыб — няволя, што яны доўга не жывуць у няволі, а мучацца і паміраюць.

Коля і Толя больш нічога не ўспомнілі пра рыбак і хамяка, і бабуля загарнула сшытак для назіранняў.

— А цяпер я вам нештачка пакажу! — падняла бабуля палец і пайшла ў куток ледзь не на дыбачках, нібы баялася некага разбудзіць. Там ужо два дні стаяў яе меншы, але цяжкі, нібы з каменнямі, чамадан.

Узяла яго асцярожненька, паклала бокам на канапу. Шчоўк, шчоўк замочкамі...

— Вы ведаеце, што такое кактусы?

Толя і Коля ўжо стаялі адзін справа, другі злева ад бабулі каля самага чамадана, нецярпліва паглядвалі на яго.

— Ведаем! Яны ў пустынях растуць! — ахвотна адгукнуўся Коля.

А Толя дадаў:

— У дзіцячым садзіку адзін ёсць. Ён круглы і калючы.

— Не, вы нічога не ведаеце пра кактусы. Гэта — мая слабасць,— бабуля ўздыхнула і з радаснай усмешкай на твары расчыніла чамадан. Хлопцы ўбачылі, што ўвесь чамадан усярэдзіне падзелены фанернымі палоскамі на скрыначкі і палічкі. На палічках і ў скрыначках было многа газетных скрутачкаў, большых і меншых. А дзе ж кактусы?

— Кактусы — не абавязкова калючыя шарыкі. Кактусаў на свеце — тысячы відаў! — Бабуля пачала даставаць скрутачкі і расказваць.— Ёсць падобныя на калючыя бочкі, ёсць калоны вышы-

нёю 15—20 метраў, іх спілоўваюць самымі звычайнымі піламі, драўніну скарыстоўваюць на розныя вырабы, нават у будаўніцтве. Ёсць кактусы, падобныя на калючыя змеі, ёсць кактусы-аладкі, рогі аленяў ці ласёў, ёсць падобныя на кусты з лісточкамі, ёсць таўкачыкі, кінжалы, булавы, языкі... І яны не толькі ў пустынях растуць. Многа іх у Паўднёвай Амерыцы на травяністых раўнінах, растуць кактусы і ў гарах, сярод скал, і ў трапічных лясах, дзе парна і душна, пануе прыцемак... Я з сабою толькі самыя малыя пабрала, а з некаторых «дзетак» наадрэзвала, а «матак» кактусаводам пааддавала. Набрала больш тых, што прыгожа цвітуць...

— А хіба кактусы цвітуць?! — не ўтрымаліся ад здзіўлення Толя і Коля.

— Хо, мае даражэнькія... То вы і праўда нічога не ведаеце пра кактусы! У нас сады якія? Яблыні, грушы, ну слівы яшчэ, вішні... А ў мексіканскіх індзейцаў каля хацін кактусавыя сады. І цвітуць сады, ох, як прыгожа цвітуць! І плады — во, во такія! — бабуля сціснула кулак.— А на некаторых плады падобныя на ягады.

— І іх можна есці?! — яшчэ больш здзівіліся хлопцы.

— А як жа! І плады, і самі кактусы. Не ўсе, праўда... От, скажам, едзе коннік па пустыні. Выгаладаўся, сасмаг — языком не варухнуць... Конь ледзь ступае — прыстаў, схуднеў. І раптам бачыць: стаяць зялёныя калючыя бочкі! Ён калючкі шах-шах, паабсякае, адчыкрыжыць сабе — во-о-о такую лусту! — развяла бабуля рукі ў бакі.— І есць, як кавун. Каню насячэ кавалкаў... І пад'ядуць, і нап'юцца заадно. Некаторыя какту-

сы можна есці сырымі, некаторыя пячы і смажыць, з некаторых вараць варэнне, мармелад, цукаты-цукеркі... Смаката!

— Ух, наямося! — ажно пастукаў кулачок аб кулачок Коля, падступіўся бліжэй да чамадана.

Бабуля не звярнула ўвагі на яго словы. Разгортвала кактусы і раскладвала на паперках і на канапе, і на падлозе вакол сябе, а тыя, што былі ў пластмасавых вазончыках, расстаўляла на стале і крэслах.

— О, у нас якраз такія кубікі ёсць! І большыя нават! — сказаў Толя.

— Большыя — мае,— удакладніў Коля.

— Гэтыя вазончыкі таксама з дзіцячых кубікаў,— сказала бабуля.

— А вунь з каранямі, а без вазончыкаў. Засохнуць! — пашкадаваў Толя.

— Не засохнуць, яны жывучыя. А «дзетак» знарок трэба падсушваць з тыдзень, потым укараняць над вадою, а тады ўжо садзіць.

Толя і Коля спрабавалі некаторыя кактусы ўхапіць — і адразу абкалоліся, пачалі смактаць пальцы.

— Што — кусаюцца? Яны ўмеюць добра абараняцца... Во гэты — сеніліс,— падняла бабуля адзін белавалосы, калматы кактус-«дзетку». Твар яе свяціўся радаснай усмешкай.— Цэфалацэрэус сеніліс... Такое ў яго прозвішча і імя.

— У нас на двары такі сабачка калматы ёсць! Жужа называецца, балонка! — усклікнуў Толя і падставіў свае далонькі.

— Асцярожна, ён таксама колецца.— Бабуля паклала яму ў далоні кактус.

Кактус быў хоць і калматы, але валасы шорсткія, а з іх сям-там вытыркаліся калючкі.

— І мне дай патрымаць! І мне! — затузаў Коля за Толеў рукаў.

Толя перакуліў коўшык-далоні, і кактусяня скацілася ў Колевы рукі. Той загушкаў яго, залюляў, нібы жывога.

Такіх, што зусім не колюцца, не было. Бабуля, пачала браць кактусы пінцэтам, на кончыкі якога былі ўсцягнуты гумавыя трубкі. Падымала кактус і чакала, пакуль дзеці наглядзяцца, клала і брала другі.

— Мамілярыя бамбіцына...— паказала баба штосьці бела-ружова-шаўкавістае з рэдкімі калючкамі.— Мамілярыя плюмоза...— і падняла камячок бела-кучаравых, злепленых у адзін, кактусікаў.— Мамілярыя магнімама...— і падчапіла нейкі гурочак з пупырышкамі. Пупырышкі цёмна-зялёныя, буйныя, як зярняты кукурузы, і на кожным тырчыць некалькі доўгіх шыпоў.

А потым бабуля паказвала пародыі, лабівіі, цэрэусы, рэбуцыі, эхінакактусы...

У Толі ажно галава закружылася ад такіх цяжкіх назваў. І як іх запомніла бабуля?! Гэта ж колькі трэба завучваць, запамінаць!

Захапіліся Толя і бабуля кактусамі і не заўважылі, што Колі ўжо няма каля іх.

— А-а-о-у... А-яй! — раптам пачуўся Колеў крык. Здаецца, з кухні.

Бабуля з пуду ажно ўпусціла адзін кактус. А Толя забыў, што кактусы стаяць на падлозе вакол іх. Як падфутболіць аднаго нагою, як шлэпне на другога! Хрумснуў кактус пад падэшваю, як гу-

рок. «Ах!» — адхапіў ён нагу. Позна! Бабуля падхапіла з долу рэшткі. «Эхінопсіс? Ага, эхінопсіс...» — паклала раструшчаны кактус на крэсла і пабегла на Колеў крык.

Толя за ёю...

## Дзве аперацыі

Коля сядзеў за кухонным сталом і мыкаў, высалапіўшы язык. На цыраце валяліся кавалачкі кактуса.

— Мыа-мыа...— плакаў ён, языка не хаваў. Па шчоках цяклі вялікія слязіны.

Бабуля спачатку схапіла паглядзець абрэзкі кактуса.

— Не мама, а магнімама... з роду маміляры-яў...— Яна са шкадаваннем уздыхнула і глянула на Колеў язык.

— Я дыу-мыаў...— целяпаў Коля высалапленым языком,— шыто гэеты як ку-ку-ку...

— Кукуруза? Параная? — падказаў Толя.

— Ыгэ.

— Ну і смачны?

— Ны-е...— пакруціў Коля галавою.

— А мо і не магнімама... Можа, мамілярыя цэнтрыцырха...— Бабуля прысела да стала, падперла далоняй шчаку. Пальцамі другое рукі асцярожна пераварочвала абрэзкі кактуса.— А мо пародыя маасі? Не, не пародыя... Які ж у мяне быў? «Слановы зуб»? Па-латыні ён называецца... называецца...

— А-а-а-а-а-а!!! — закрычаў Коля на ўвесь голас. Бабуля, родная бабуля, не ратавала яго, а забаўлялася з кактусам!

— Чаго гэта ты? Хіба мо баліць? — спакойна папытала яна ў Колі.— А нам з Толем не баліць, мы з Толем не елі кактусаў.

І яшчэ трошкі знарок пасядзела бабуля, потым пацерла далоняй па самай макаўцы Колевай галавы: «Эх, ты! Кактусаед...» — і хуценька пайшла ў пакой, да свайго чамадана. Прынесла адтуль камячок ваты, эфір у бутэлечцы, ланцэт і пінцэт, лупу.

— Зараз табе аперацыю зробім...

Коля завішчаў і хацеў уцячы з кухні. Але Толя хуценька — ляп! — зачыніў дзверы і падпёр іх плячыма.

— Бабуля, хутчэй! Я трымаю!

— А чаго нам спяшацца? Нам не баліць.

— А-а-а-а! — круціўся Коля па кухні, затуляў далонямі рот.— Ные хыа-чоу апер... апер...

— Дурненькі, я пажартавала,— пасур'ёзнела бабуля.— Вымем стрэмкі, і ўсё. Хіба ты ніколі да гэтага не заганяў стрэмак? У мяне ў малое вечна былі збітыя калені і стрэмкі...

Бабуля працерла свае пальцы і кончыкі пінцэта ваткаю з эфірам. На ўсю кухню запахла рэзка і нясмачна.

— Ну — давай...

Коля падышоў, трасучыся, адняў далоні ад рота. Але толькі паднесла бабуля пінцэтам камячок ваты, каб падсушыць язык, паглядзець, што на ім робіцца, як Коля зноў завойкаў, закруціў галавою.

— Высалапі больш язык... Аг-га...— Бабуля цапнула леваю рукою за кончык Колевага языка, а праваю пінцэтам — раз! — вырвала іголку-калючку, мо сантыметры два даўжынёю.— Во, палюбуйся, які трафей,— паказала яму стрэмку,

стрэсла яе на стол. Два! — дастала яшчэ адзін адломак, мо на сантыметр.— Паварушы языком — не чутно больш?

Коля пабалбатаў языком: «Няма!»

— Я абрэзаў іголкі ножанкамі... Усе, здаецца, абрэзаў, а яны...— усхліпваў ён, не хацеў супакойвацца.

— Сам сябе пакараў. Трэба ранкі чым запячы. Выбірай — ёд, эфір, адэкалон?

— Нічым не хачу! — Коля зноў ірвануўся да дзвярэй, але Толя замахаў, забаксіраваў рукамі, адбіваючы атаку.

— Лепш адэкалон. Згаджайся! — падказваў ён.— Смачна будзе з рота пахнуць.

Коля згадзіўся.

Толя пусціў дзверы і першы пабег у пакой, дастаў з серванта татаў пульверызатар. Тата, калі паголіцца, пырскае ім сабе на шчокі, на падбародак адэкалон, моцна зажмурваецца і ахкае ад задавальнення.

Коля таксама заплюшчыў вочы і высалапіў язык. Ш-ш-ш-ш-ш! Ш-ш-ш-ш-ш!— з усёй моцы націснуў Толя на гумавы капшучок, і ў рот Колю паляцелі пыркі.

— А-а-а-а! — схапіўся ён за рот, пабег, прытанцоўваючы, у спальню.

Толя не вытрываў, зарагатаў. Дастаецца гэтаму Колю за прагнасць.

Бабуля ўсміхалася і рабіла яшчэ адну аперацыю — кактусу! Акраец-вяршэчак роўненька падрэзала ланцэтам.

— Прынясі той, раструшчаны,— папрасіла яна Толю.

Ён пабег у пакой, згроб на паперку ўсе кавалачкі. Самы большы і цалейшы кавалак быў каля каранёў.

— З двух кактусаў зробім адзін,— сказала бабуля і адсекла ўсё патрушчанае, пакінула якіх сантыметры два з карэньчыкамі. Потым заглянула ў аптэчку, што вісела на кухні, зняла з нейкае бутэлечкі з лякарствамі чорную гумку-зацiскалку. Якраз такую бачыў Толя на «хвосціку» ў Танькі.

Бабуля стуліла абодва кавалкі кактусаў зрэзамі, надзела на іх гумавае кольца, каб сціснуць іх яшчэ мацней.

— Вось так... Прыжывецца ці не? Ні разу яшчэ не прышчэпвала кактус на падвой, які не расце, а валяецца вырваны.

Пайшлі з кухні. Бабуля зноў загортвала кактусы і кактусяняты без вазончыкаў, размяркоўвала іх па палічках і ячэйках чамадана.

— Дзён праз два каторых пасадзім, каторых будзем укараняць. Земляное сумесі наробім... А кубікі свае аддасце мне на кактусы? Вы ж вялікія ўжо хлопцы, сорамна з цацкамі гуляць.

— Аддамо! — паабяцаў Толя.

А Коля ці не пачуў, ці прамаўчаў. Ён ужо не любіў кактусаў.

А потым бабуля разглядвала свае пальцы і пінцэтам даставала калючкі і глахідзіі. Глахідзіі — гэта такія малюпасенькія і тоненькія калючкі з кручочкамі на канцах. Сядзяць яны кучкамі, адрываюцца ад кактусаў лёгка. А колюцца моцна, залазяць у скуру глыбока.

Вымала іх бабуля і ні разу не войкнула.

## Каляровыя сны

Хлопцам здалося, што ў спальні хтосьці ходзіць. Потым нібы пачулася:

Прыплыла тады рыбка, спытала:
«Чаго табе хочацца, старча?»

Але хлопцам аднаго хацелася — спаць. І абодва ўзахапкі стараліся дагледзець апошнія сны.

Колю сніцца, што едзе ён на вярблюдзе цераз пустыню. Хочацца вады, сасмагла ў роце, язык, здаецца, распух, разбалеўся ад гэтага. А сонца пячэ і смаліць, сонца слепіць — не зірнуць. Коля б'е пяткамі пад шорсткія, як у таго кактуса-«балонкі», бакі, падганяе вярблюда, а сам усё аглядаецца па баках: ці не блісне дзе якое азярцо ці рэчка? І раптам бачыць кактусавы лес. Вось ён, ратунак! Вярблюд сам кіруе, імчыць туды, вярблюд падбрыквае з радасці... Аднекуль у руках Колі з'яўляецца нож-мачэтэ, якім сякуць кубінцы цукровы трыснёг. Размахнуўся, як шабляю,— г-гах! Злятае з аднаго кактуса калючая шапка-папаха, з нутра свішча, струменіць угору фантанчык. Прагна нагнуўся да вады, глытнуў... Ого, што за дзіва?! Не проста вада, а газіроўка з сіропам. «Ага!» — гаворыць вярблюд і лезе да вады, адпіхвае мордаю Колю. Коля не паддаецца, адпіхвае вярблюда. «А я табе кавуна не дам!» — грызе вярблюд кактус збоку, жуе разам з калючкамі і не баіцца, што ўколецца. А Коля п'е, Коля аж захлёбваецца, ніяк не можа напіцца. Выпростваецца, каб перавесці дух... Мамачкі-бабулечкі, ратуйце! І яго, і вярблюда шчыльнаю сцяною абступілі кактусы, варушаць калючымі лапамі. «Папаўся! Папаўся!» — радуюцца, лапочуць на

розныя галасы. Прысеў Коля за ссечаны кактус, хацеў адпаўзці ўбок. А нейкі пацешны пузаценькі кактусік забег збоку, варушыць смешна носікам-«дзеткаю», пляскае ў ладкі: «Вось ён! Вось ён!» Ускочыў Коля на вярблюда, паганяе: «Но! Но!» А кактусы за ім: і пешкі бягуць, і скачуць, уссеўшы адзін на аднаго, як на каня. Размахваюць пікамі-калючкамі, ляскаюць мячамі-шыпамі. Тупацяць ногі, цокаюць капыты, гудзе пагоня... Вось-вось нагоняць, заколюць. «Я іх паем, не бойся!» — спыняецца вярблюд, паварочваецца да іх. Ашчэрыў шчарбатыя зубы і... цап Колю за кашулю, сцягнуў уніз. «А-а-а!» — крычыць Коля і ў жаху прачынаецца...

Ф-фу... Сэрца тахкае, як не выскачыць. Лоб мокры ад поту. Азіраецца Коля — мо і Толя яго сон бачыць? Не, усміхаецца Толя, у яго свой сон, прыемны сон...

Бачыць Толя вялікую залатую рыбку. Нават сам дзівіцца ў сне: чаму сніцца не хамяк Гаўрык, а рыбка? Кружыцца залатая рыбка наўкол яго, ахутвае, аблытвае сваімі доўгімі і мякенькімі плаўнікамі, гоніць у твар хвастом-прасціpáдлам прахалоду. «Чаго табе хочацца, хлопча?» — нібы гаворыць, заваблівае яна Толю з сабою, у падводнае царства. І Толя плыве за ёю — далей, глыбей. І ўжо не дзівіцца, што наўкола сіні і залаты бляск хваль, што ён свабодна дыхае пад вадою, што яму лёгка ў вадзе, як рыбе. Вось штосьці ззяе, расце ў вачах, набліжаецца... «Замак цара марскога!» — гаворыць рыбка. Зіхаціць замак неонавымі агнямі, у вокны, у дзверы заплываюць рознакаляровыя рыбкі-агеньчыкі. Падплыў і Толя, заглянуў у дзверы. Уга, колькі там дзівосных,

фантастычных рыб! Плаваюць кругамі, водзяць карагод. А малыя вуаляхвостыя гупі дурэюць, як кацяняты, ганяюцца адна за адной... «А дзе неончык? Дзе неончык?» — крычыць хтосьці пісклявым голасам. І Толя пазнае: хамяк Гаўрык крычыць. Ходзіць па зале на задніх лапках, у смешных сініх штоніках, памахвае веерам.

— Дзе неончык? — зноў крычыць хтосьці, ужо Колевым голасам. І Толя прачынаецца, садзіцца на пасцелі.

Вунь дзе Коля, прыліп да акварыума, сам у адных трусіках.

— Неончык прапаў! — крычыць Коля.

Прыбягае бабуля ў фартусе, вылазіць з пасцелі, прыпадае да акварыума і Толя. Пад вадою і праўда стаіць маленькі замак-грот, выкладзены чарапашкамі і каляровымі шкельцамі. Мабыць, тата раніцаю паставіў.

— А я ўжо прыходзіла вас будзіць,— гаворыць бабуля і здымае з акварыума шкло-накрыўку, заглядвае зверху.

Коля і Толя прытулілі свае галовы да бабулінай, перабралі вачыма кожны каменьчык. Няма неона... Плаваюць і молі, і мечаносцы, і гупі, і адзін неончык... А дзе ж другі?!

Коля адразу захныкаў, падазрона паглядзеў на Толю: можа, ён што натварыў?

— Не румзай... Мо ў грот заплыў,— сказала бабуля. Падкасала рукаў і засунула руку ў ваду, перавярнула грот, патрэсла ім, потым дастала з вады, заглянула. Пуста было ў пячорцы, не вельмі там і схаваешся.

— Мо выскачыў з акварыума? — сказаў Толя.

— Накрыты быў шклом.— Бабуля агледзела стол вакол акварыума. А Коля і Толя нават пад стол злазілі, там усё агледзелі, абмацалі. Няма!

Бабуля прынесла тонкі, нібы аловак, гумавы шланг. Калі адзін канец шланга засунуць у акварыум, а за другі смактануць, то па шлангзе пацячэ вада з гразёю. Так ужо раз чысцілі акварыум.

Перагрэблі кожны каменьчык, пачысцілі дно. Нідзе не знайшлі ніякага следу ад неона!

Бабуля прынесла з кухні свежай, адстоенай вады, даліла ў акварыум. Выцерла добра рукі, прысела да стала, разгарнула дзённік.

— А ты не плач, чуеш? Купім яшчэ аднаго, каб да па́ры было.

Коля глядзеў у акно і выціраў слёзы. Толя не ведаў, як суцешыць брата. А бабуля запісвала пра падзею ў сшытак і хмурыла бровы. «Няўжо... кукляна?» — адзін раз нягучна, нібы сама сабе, сказала яна.

Запісала яшчэ пра тое, што ў самкі молі і ў мечаноскі вельмі растаўсцелі жываты, мабыць, у іх поўна ікрынак. Запісала і пра мечаносца. Нейкі ён стаў натапыраны, як вожык. Што з ім робіцца?

## Бабуля разгулялася

Як добра, што ў іх ёсць бабуля! Гэта ж проста шчасце, вялікае шчасце! Маму і тату хлопцы мала нават бачаць. Хіба што вечарам. Дый то — колькі таго вечара? Сюд-туд — і трэба ісці спаць. Хоць таго сну ні ў адным воку няма, хоць па тэлевізары ідуць цікавыя перадачы — спаць, і ўсё!

— Бабуля, а ў нашым парку такія атракцыёны! — сказаў неяк Коля.

— Ага! — перабіў яго Толя.— Электрамабілі, што па роўным ездзяць, і машынкі, што па рэйках угору-ўніз лятаюць, і ўсякія круцёлкі з парашутамі, каруселі з гарматамі, ракетамі...

— Ага! — перабіў і Коля Толю.— Мы ў Батанічны сад ездзілі, дык чулі: гудуць атракцыёны! Грукочуць! І ўсім так весела — крычаць, вішчаць!

— З парашутамі? — зацікавілася бабуля.— Гм... Наядайцеся добра, з'ездзім, развітаецеся і з атракцыёнамі.

— Ур-ра!!! — загалёкалі Толя і Коля.— Што трэба з'есці? Давайце хутчэй!

...Хоць быў будзённы дзень і толькі адзінаццаць гадзін раніцы, атракцыёны ўжо працавалі. З усяго парку, як ручайкі да возера, сцякаліся да іх людзі. І столькі новых сцежак напратоптвалі паміж дрэў, так выгарцавалі траву вакол атракцыёнаў, столькі хваёвых карэнняў агалілася! Бабуля спынілася каля адной сасны, у якое быў абсечаны сякераю бок, а на залысіне напісана чырвоная лічба «83». Задрала ўгору галаву, задралі і хлопцы — ой, дык сасна ж засохла! Галлё ўверсе амаль голае, толькі сям-там відаць рыжыя шыпулькі.

— І вунь надпісаная! — паказаў Коля.

— І вунь! Дзве разам! — крыкнуў Толя.

Падышлі і да тых: «98»... «105»... «112»...

— Калі кожны год будзе па столькі высыхаць, то хутка ў парку ніводнай сасны не застанецца,— горка паківала галавою бабуля.

А знекуль — мо з рэпрадуктара на слупе, а мо з чыйго транзістара — далятаў чысты і звонкі хлапчукоўскі голас:

Давайте же вместе, ребя-ята,
Родную природу бере-е-ечь!

Падышлі да атракцыёнаў, і не было ўжо таго настрою, з якім выходзілі з дому.

Білецікаў бабуля накупляла цэлую жменю. А пачалі з дзіцячай каруселі.

Толя спачатку не ведаў, што выбраць, у што сесці,— вочы ажно разбягаліся. Потым залез у ракету, а Коля ў нейкі пляскаты касмічны карабель. Кружыліся, кружыліся, кружыліся... Толева ракета маўчала, а касмічны карабель і агнямі бліскаў, і апускаўся-падымаўся, і завываў, як сірэна «хуткай дапамогі». А бабуля за кожным абаротам лавіла іх вочы сваімі вачыма і задумліва ўсміхалася або перамаўлялася з чужымі мамамі і татамі, што стаялі за плоцікам.

— Ну, а цяпер будзем правярацца, ці зможаце быць лётчыкамі,— павяла іх бабуля на «Супер-8».

На гэты «суп» адных дзяцей ніколі не пускаюць, а з бабуляю іх пусцілі. Уплішчыліся ў адну машынку, бабуля прытуліла Колю да сябе леваю рукою, а Толю — праваю. Дзядзькі падштурхнулі машынку і... паехалі-пагрукаталі, паляцелі паляскацелі... За імі яшчэ машынкі, яшчэ... Сядзелі ў тых машынках дарослыя дзяўчаты і хлопцы, і ўсе адразу закрычалі: «Ух-ха! Ух ты!», завішчалі. Машынка то ўзбіралася высока-высока, то падала ўніз, як у прорву, і сэрцы ў Толі і Колі трапяталі і падскоквалі пад самае горла.

— Бабуля... А чаму ты... не вішчыш? — пракрычаў ёй у вуха Толя.

— А чаго? Ніколечкі не страшна.

— І я не ба... Ой-і-і-і! Ай-і-і-і! — завёў тоненька Коля.

Урэшце машынкі спыніліся ўнізе. Вылезлі, і бабуля — «Гуляць дык гуляць!» — павяла іх на «Халі-галі». А ўжо хапіла б і «супа», хлопцы здаволіліся.

На «Халі-галі» іх таксама пусцілі толькі таму, што з бабуляю... Дыск вялізны-вялізны, паўз край па крузе кабінкі-лавачкі на двух чалавек. Усе садзіліся па двое, толькі яны ўтраіх. «Зашчапіце поручні! Увага!» — скамандаваў з будачкі дзядзька ў мікрафон. Загарэліся, пачалі мігаць вакол «Халі-галі» каляровыя лямпачкі, заспявала радыё вясёлую песеньку. Дыск спачатку закруціўся, як патэфонная пласцінка, і ўсё хутчэй, хутчэй... Берагі дыска пачалі то падымацца, то апускацца. Потым штосьці нібы падхапіла гэты дыск з усімі кабінкамі і людзьмі, павяло, шпурнула ўбок і пачало ганяць па крузе. Здавалася, што ўсё наўкола кружыцца, уздыбілася зямля, пачало скакаць угору ўніз расквечанае агнямі неба. Крыкі наўкол, віск — аж глушаць! А бабуля ні разу не віскнула, не войкнула. Толя і Коля з усяе моцы стараліся маўчаць, сціскалі зубы. Ім зрабілася млосна, у галаве, здаецца, усё перакруцілася дагары нагамі. Яшчэ б секундачка, яшчэ б дзве — і не вытрывалі б. Але пачало суцішацца вярчэнне і кручэнне, заміраць... Ш-ш-ш! Стоп...

Бабуля вывела з кабін Толю і Колю пад рукі. Яны не маглі стаяць: уцякала з-пад ног зямля. Давяла іх бабуля да лаўкі, і яны пападалі на яе, паадкідвалі галовы, пазаплюшчвалі вочы.

— Во як выбеліліся... А вы ж кружыліся ўсяго ў адной, ад сілы ў дзвюх плоскасцях. Што ж тады адчуваюць лётчыкі і касманаўты? Іх у трох-чатырох плоскасцях круцяць і кружаць...— Ба-

буля паказала рукамі, як выпрабоўваюць касманаўтаў. Але хлопцы не хацелі расплюшчваць вачэй.— От ім — цяжка. А гэта — дробязь. Я з парашутам скакала, дык і то, бывала, больш нагушкае і выматае.

— Бабуля, ты была-а парашуты-ы-стка?! — расплюшчыў ад здзіўлення вочы, выпрастаўся Толя.

— Была, а як жа! У нямецкі тыл скакала з радыёперадатчыкам. Да партызан, да разведчыкаў... Весткі ад іх у Маскву, на фронт перадавала.

Тут ужо і Коля расплюшчыў вочы, паглядзеў на бабулю. Не можа быць, каб іх бабуля была такая! Яна ж як прыехала, то па ёй нічагусенькі нельга было пазнаць, што яна такая гераічная.

Як ім пашанцавала з бабуляю! Як пашанцавала! Ажно млоснасць адступілася, пасвятлела ў галаве...

Ішлі з парку і моцна трымаліся за бабуліны рукі. Ішлі і з гордасцю паглядвалі на сустрэчных: ніхто не ведае, што ў іх такая бабуля! Незвычайная бабуля, цу-доў-на-я!

Ім здавалася, што яны ўсё яшчэ святкуюць дзень нараджэння і гэта свята будзе працягвацца доўга-доўга.

## Папаўненне ў акварыуме

Яшчэ дзень мінуў. Настала пятніца. А за пятніцай, як вядома, ідзе субота, потым нядзеля. У нядзелю — у школу. Як падумаюць пра гэта Толя і Коля, дык ажно сэрцы заміраюць ад невядомага.

Раніцаю Коля хацеў кінуць рыбам лічынак камароў — і нарабіў крыку:

— Ой, а тут ужо ёсць нейкія камары! Не, апалонікі! Чорненькія, а хвосцікі як са студзеню!

Прыбег Толя, прыйшла з лупай, перастала разглядваць свае кактусы бабуля.

— Гэта маляўкі, рыбіныя дзеці,— сказала яна.— Але чые яны?

Памеркавалі, памеркавалі — прызналі, што молі.

— Правільна, малінезіі. Яны жывародныя. Праўда, мечаноска таксама жывародная,— і не вытрывала, каб не здзівіцца: — Але ж і крахатулечкі, мо на паўміліметра!

— А хітранькія якія! Толькі нарадзіліся, а ўжо хітранькія! — пахваліў сваіх рыбак Коля.— Ведаюць, як хавацца ад вялікіх!

А маляўкі і праўда ведалі. Пазалазілі на лісцікі лімонніку, на тыя, што каля самай паверхні. Яны ўвагнутыя, у іх патрошку вады. У гэтых начовачках маляўкі і дрэмлюць, плюхаюцца. Ім там спакойна, ніводная рыбіна не бачыць, нават не здагадваецца пра іх схованку. Бо маглі б і праглынуць: маляўкі меншыя за лічынак камара!

— Раз, два, тры... Пяць!.. А во шэсць, сем! — пачаў лічыць Коля.

— Вунь яшчэ адзін з зелля выблытваецца... Не — два! Дзевяць усіх! — радаваўся і Толя.

— Хопіць, хопіць! — адцягнула іх бабуля ад акварыума.— Садзіцеся снедаць... Ды будзем кактусы садзіць.

На кухні ў куточку ляжалі цэлафанавыя мяшэчкі з зямлёй, гравіем, крошкай мармуру, вугалем, бітай цэглай, кавалачкамі старога тынку. Ляжалі пірамідкаю і дзіцячыя кубікі. Толевы і

Колевы кубікі. Праўда, яны ўжо і не кубікі, у іх не хапала па адной бакавінцы, а ў донцах былі папрапальваны дзіркі.

— Ой, а нашто вугаль? Хіба кактусы на вугалях растуць? — спытаў Толя.

— Глеба ад вугалю здаравейшая, плесня ў ёй не заводзіцца.

— А каменьчыкі? Будзеце вучыць нас у каменьчыкі гуляць?

— Вы ж не дзяўчынкі. З гэтага ўсяго будзем рабіць сумесі, глебу для кактусаў.

— Хай Коля пачакае, я хамяка пакармлю! — успомніў Толя. Нахіліўся да фанернай скрынкі-доміка, якую зрабіў нядаўна тата і куды перасялілі Гаўрыка.

Хамяка ў скрынцы не было. Толя нават логава яго патрос, анучку, шкарпэтку і вату — пуста. А дзверцы зачынены, нават на кручок зашчэплены, на месцы і накрыўка-рашотка. Не мог жа Гаўрык уцячы так, каб і дзверцы за сабою зашчапіць!

— Ён цераз верх вылез,— сказала бабуля.— Толькі цераз верх! Падмасціў сабе пад ногі анучу, ускарабкаўся па сценцы, падняў носам накрыўку...

Забылі пра снеданне, шукалі хамяка... Усюды, па ўсіх пакоях. На кухні ва ўсіх закутках, пад буфетам і плітою грэблі палкаю. Глядзелі і ў пліту — няма!

— Нідзе ён з кватэры не дзенецца,— сказала бабуля, паглядзеўшы на Толю.

Той ужо кусаў губы, каб не расплакацца.

— Ага! Нідзе! Мо ў акно螺 вываліўся, забіўся! — шморгаў Толя носам.

Бабуля падышла, праверыла зашчапку ў акне, змерала вачыма вышыню ад падаконніка да

форткі. Бачылі раз, як разгульваў хамяк па падаконніку. Але каб выкінуцца ў фортку?! Такога не магло быць.

Пагнала Толю і Колю за стол.

А паснедалі, то было хоць разарвіся. Цягнула і ў спальню да акварыума; цікава было і глядзець, як бабуля робіць на газеце сумесі. Яна то падсыпала ў кучку аднаго, то дамешвала другога, то дабаўляла трэцяга. Пад кожны кактус — свая сумесь. Толя трошкі памог бабе, прынёс з пакоя пінцэт, савок і некалькі кактусікаў на паперках — тых, што з каранямі.

— У кожнага свой густ, кожнаму трэба ўнаравіць. Тады і расці будуць добра, і цвісці,— гаварыла бабуля лагодным голасам. Сыпала на дно вазончыка жменьку гравію, жменьку сумесі, апускала на горачку карані кактуса і дасыпала зверху саўком да самага краю. Стукала вазончыкам па падлозе і, калі сумесь ушчыльнялася, асядала, засыпала зверху крошкай ці гравіем.—Во... На, палі гэтага, кропель дваццаць — трыццаць... І вунь таго. А гэтых не трэба, хай дзён колькі без вады пастаяць. Я ў іх карані ўкарочвала.

— Пятнаццаць ужо! — прыбег на кухню Коля.— А мо і больш, я збіўся...

Не ўтрываў, пабег палічыць малявак і Толя. Семнаццаць! А яшчэ ўбачыў: мечаноска ляжыць на дне, прыціснуўшыся жыватом да шкла, нібы ахалоджвае жывот, студзіць. Да яе падпаўзла куклянка і спрабавала зачапіць. Рыбка паволі, няўклюдна адплыла ўбок.

А на кухні бабуля ўжо кончыла пасадку кактусаў. Пачала «ўкараняць» тыя, што без карэнняў. Але як? Смех, дый годзе. Пазакрывала

шклянкі і кубкі кавалкамі газеты, папрывязвала іх, каб не спадалі. Зверху ў паперы папрарывала дзіркі і пінцэтам пасаджала ў іх кактусянят.

— А вады і забыла паналіваць! — спахапілася яна. Выняла па адной дзетцы (у некаторых кубках было адразу па тры, па чатыры), у дзіркі асцярожна наліла вады. Але так, каб кактусы да яе не дакраналіся. Яны павінны вісець над вадою.

Потым бабуля вылоўлівала сачком з акварыума малявак, перасаджвала ў слоік з вадою.

— Ой, яны ж, мабыць, есці хочуць! Чым іх карміць? — занепакоіўся Коля.

— Першыя суткі можна ім нічога не даваць,— сказала бабуля.

Але пад вечар сама не вытрымала. Расцерла ў вадзе згустачак кіслага малака — з чвэрць гарошыны. Маляўкі віравалі і хапалі малюсенькімі, як іголкай ткнуць, роцікамі мікраскапічныя церушынкі малака. Нават адштурхоўвалі адна адну. Толькі нарадзіліся, а ўжо барацьба за існаванне!

Бабуля запісала ў «Дзённіку назіранняў» пра малявак. І пра мечаноску: зусім захварэла, ужо два дні нічога не есць. І пра хамяка — зноў знік...

Вечарам, як сабраліся ўсе за сталом, многа гаварылі пра падзеі ў акварыуме. А потым мама сказала, што трэба не забыць купіць заўтра кветкі. Бо зранку ў нядзелю могуць і разабраць усе. А не ісці ж дзецям у школу з пустымі рукамі.

— Я сама куплю, я не забуду,— сказала бабуля.

Гаманілі — і не адразу пачулі, што ўверсе недзе зашорхала. Потым пачулі добра — шалпоча нешта... на буфеце. «Мыш?!» — прашаптаў тата і асцярожна зняў з буфета кардонную каробку

з-пад боцікаў, у якую складвалі старыя газеты. Складвалі абы-як, частка ляжала краямі на борціку, і пад імі ўтварылася нібы норка. Прыўзняў тата газеты — ён, Гаўрык! Глядзіць здзіўлена на ўсіх... Надраў, нашкуматаў газет, зрабіў сабе логава. У другім кутку каробкі — кучка наструганага зубамі бурака, бульбы, нейкія скарыначкі, крошкі, костачка слівы. Ламалі галаву: як ён мог забрацца на буфет?

Вырашылі прасачыць, паставілі каробку з хамяком назад.

Хамяк шорхаў, шорхаў — выбраўся з каробкі і за буфет. А паміж буфетам і сцяной была шчыліна як засунуць далонь. Хамяк чапляўся кіпцікамі за каструбаватую непафарбаваную фанерную сценку буфета, пазіраў уніз і асцярожна спускаўся. Спінаю ўпіраўся ў сцяну, і гэта не давала ўпасці.

Накідалі на падлогу крошак хлеба, кавалачкаў яблыка, мяса, рассыпалі семак — што будзе рабіць? А ён злез, усё вынюхаў, сабраў і пакарабкаўся па шчыліне ў сваю схованку.

Ну і нягоднік! Злавіў яго тата, зноў пасадзіў у трохлітровы слоік. Хай у ім жыве, калі такі спрытны.

## Трагедыя ў акварыуме

Тата прыйшоў з цырка і развёў рукамі:

— Няма ўжо білетаў да самага Новага года. І ў адну касу, і ў другую, і ў трэцюю кідаўся — прадалі...

— То хай бы на пасля Новага года ўзяў,— сказала мама.— Ты ж ведаеш, як задурылі галаву дзеці...

— Там вісіць плакат, хутка будуць прадаваць білеты на навагодняе цыркавое прадстаўленне. Амаль тая ж самая праграма, на яе і купім.

Гэта было ў суботу, усе сядзелі дома. Не ўзрадавала такая вестка Толю і Колю. Яны сабраліся глядзець мультфільмы і ўключылі тэлевізар раней. Якраз перадавалі навіны. І трэба ж здарыцца такому супадзенню: убачылі, як з чыгуначнай станцыі вязуць на грузавіках клеткі з тыграмі. А сланоў не везлі, яны самі ішлі. Пакорліва, сумна паапускаўшы галовы, і кожны слон быў прыкуты да машыны ланцугом. За нагу! Сланы падтрымлівалі свае ланцугі хобатамі, бо грузавікі то прытарможвалі, то павялічвалі хуткасць. І гэтую тузаніну прымалі на сябе хобаты, а ланцугі правісалі за хобатам свабодна, не так naцiралі ногі.

— Якія разумнікі! Вы паглядзіце — ніхто ж іх гэтаму не вучыў! — захаплялася мама.

— Навучыць гора кашу есці,— зазначыла бабуля.

А Толя і Коля, уражаныя, нічога не гаварылі. Сланы даўно прайшлі, і тэлевізар паказваў нейкі завод, станкі, а ў вачах у хлопцаў усё ківалі хобатамі сланы, неслі свае ланцугі.

І вось пачулася знаёмая мелодыя перад мультфільмамі. Бягуць глядзець мульцікі і Воўк, і Заяц, і кракадзіл Гена, і Чабурашка... Ужо і бегемот усхапіўся з насілак, павалюхаўся следам, ужо самі мульцікі пачаліся і кончыліся... І тут пачуўся званок у дзверы!

Пайшоў адчыняць тата і прывёў... Таньку. Твар яе заплаканы, у руцэ трымае шэрую паперку. Спынілася каля дзвярэй, нешта гаворыць, а губкі горна крывяцца і дрыжаць. Прыцішылі гук у тэлевізары, і хлопцы пачулі:

— Можа, вам трэба білеты ў цырк? Тры білеты ёсць...

— Лішнія?! Тата, бяры! — усхапіліся Толя і Коля.

— Не лішнія...— усхліпнула Танька.— Я хацела з татам і мамаю ісці, а цяпер расхацела...— І яна закрыла далонькамі вочы, заплакала ўголас.— І нізашто не пайду! Там мучаць звяроў... Толькі што сланы ішлі за машынамі... і плакалі... Я бачыла, як у іх слёзы капалі...

— Не плач, дзіцятка,— падышла бабуля, памагла ёй выцерці вочы «слёзнаю» хусцінкаю.— Пойдзем на рыбак паглядзім, у нас маляўкі ўжо ёсць — такія пацешныя!

— Ну во, я ж казаў, што дастанем білеты ў цырк,— гаварыў тата, а сам хутчэй адлічваў грошы.— Аддай Тані...— працягнуў Колю.

Той схапіў грошы і кінуўся ў спальню. А Толя затанцаваў з білетамі, закружыўся па пакоі. Апошняе іх перадшкольнае жаданне спраўджваецца!

— Ой, што гэта?! Ой! — пачуўся са спальні перапалоханы крык бабулі.

Патупацелі ў спальню ўсе.

Бабуля, Танька і Коля ўтаропілі вочы ў акварыум. У Танькі на твары былі страх і жаллівасць, з вачэй выкочваліся слёзы, а Коля глядзеў са здзіўленнем і цікавасцю.

Куклянка падмяла пад сябе мечаноску, наступіла на яе падэшвай і... жэрла. Палавіну бока ўжо выела, віднеліся белыя, як нітачкі, рэбры.

— Выкіньце куклянку! Я не магу на яе глядзець! Гэта яна зжэрла і неончыка! — закрычала мама.

— Ціха, Каця! Яна проста выконвае свае абавязкі. За што ж яе караць? — Тата сачком адсу-

нуў куклянку, вылавіў мёртвую рыбку і панёс на кухню выкінуць у смеццеправод.

А ўсе стаялі каля акварыума і слоіка з маляўкамі, глядзелі, ці астатнія жывыя і здаровыя. Жывыя! Праўда, самец молі быў нейкі натапыраны, нібы луска пастала дыбам, невясёлы. Калі да яго падплывала самка, ён рэзка кідаўся ўбок, баяўся, каб яго не зачапілі. Мо і ён захварэў?

Толя збегаў на кухню, узяў крошачку варанага жаўтка, расцёр у пальцах і кінуў маляўкам. Яны завіравалі, хапаючы корм, і Танька ажывілася, выцерла вочы «слёзнаю» хусцінкаю.

Прыйшоў тата, моўчкі ўзяў кніжку-брашуру пра акварыум, пачаў гартаць. Гартаў, глядзеў, чытаў, мармытаў: «Як вата павуцінка на лусцы...» Не тое... «Упіваецца і грызе клешчык...» Не тое... «Кіста... Захворванне ікры ад прастуды...» Ага! Ікра ў мечаноскі прастудзілася, маляўкі памерлі яшчэ ў ікрынках, у жываце... Таму куклянка і падбіралася да рыбкі, чула пах.

— Накуплялі прычындалаў, а ні разу яшчэ не падагравалі ваду. А тыдзень назад была такая халадэча ў хаце, батарэі ж яшчэ не ўключаны,— сказала з папрокам мама.

— А з мечаносцам што? — паказала бабуля на рыбку.

Тата зноў пачаў праглядваць кніжку, чытаць, мармытаць. Уздыхнуў...

— Мабыць, таксама прастуда... Вадзянка... А як ратаваць — не сказана.

— А нашто дапусцілі да гэтага? — рэзка сказала мама.— Выкінуць трэба акварыум, не мучыць рыб.

— У людзей жывуць жа, разводзяцца,— сказала бабуля.— Уключайце падагравальнік, а то і астатнія пахварэюць.

— Заразная вадзянка ці не? — пачухаў тата патыліцу.— Адсадзім мечаносца ў слабы раствор марганцоўкі.

Але марганцоўка не памагла. Мечаносец, калі яго зноў пусцілі ў акварыум, плаваў рыўкамі, кідаўся ўгору-ўніз, нібы задыхаўся. Праз гадзіны дзве, калі Танька пайшла ўжо дадому, ён апошні раз стралою ўзвіўся ўгору, ухапіў паветра.

На дно падаў куляючыся. Падаў мёртвы...

## Першы раз у першы клас

Бабуля ўчора купіла не толькі кветкі. Купіла яшчэ дзве каробкі. У дзверы не званіла, у яе быў ужо свой ключ. Пацiху адчыніла, пацiху зайшла. Правільней, старалася, каб было ціха. А каробкі былі, мабыць, вялікія, павярнуцца з імі ў дзвярах цяжка. Дакрануліся яны да дзвярэй, дакрануліся да сцен, і штосьці дзынкнула ў тых каробках металічнае.

— Каця, хлопцы дома? — шэптам спытала бабуля ў мамы.

Мама і тата мылі ў ваннай бялізну і, мабыць, выглянулі адтуль.

— Няма. Выскачылі на двор пагуляць.

А «выскачыў» толькі Коля, а Толя яшчэ быў у туалеце і ўсё-ўсё чуў.

— Ну, то і добра. Вазьмі, прыхавай у сваю шафу. Як прыйдуць са школы, тады і ўручым. У гонар першага школьнага дня.

— А што ў гэтых каробках? — па-змоўніцку прашаптала мама.

— Аднаму... гэта... Не, не скажу.

— Ой, дарагія ж, мабыць, цацкі.

— Няхай. Я ж ім яшчэ не давала падарункаў.

Мама і бабуля пайшлі ў спальню, а тата ўсё плюхаўся ў ваннай. Толя паціху выбраўся з туалета і шмыгнуў на двор.

Вой-ё-ёй, да заўтрага — цэлыя суткі! Як тут вытрываць, не папытацца —што там? І гаварыць Колю ці не? Урэшце ўзяў з Колі «страшную клятву», што і выгляду той не падасць, быццам нешта ведае пра бабулін сюрпрыз, і расказаў.

Пакуль прайшоў сённяшні дзень, прыйшла нядзеля, змучыліся хлопцы ўшчэнт.

У школу ў дзесяць нуль-нуль. А прачнуліся Толя і Коля ў восем. Самі! Праўда, і ноччу яны кепска спалі, бачылі мо сто сноў, і ўсе пра школу.

У мамы ўсё падала з рук. А селі снедаць, то замест цукру яна ўсыпала тату ў кубак солі.

— Каця, супакойся! Каця, што з табою? — гаварылі ёй то бабуля, то тата.

Толю і Колю зусім не хацелася есці. Хацелася адразу бегчы ў школу.

— Пакуль не пад'ясце добра, з кватэры не выпусцім,— прыгразіла бабуля. Але і сама яна нічога не ела, а толькі выпіла чаю.

— Не бярыце ранцаў з кнігамі! Сёння без кніг ідуць, там раскажуць вам усё, пакажуць клас,— сказала мама хлопцам.

Яна нават чаю не піла.

— А нармальныя заняткі заўтра з дзвюх гадзін дня. Я даведвалася...— дадала бабуля.

Але ж ранцы былі такія прыгожыя і яркія, яны ажно прасіліся, каб іх узялі.

І хлопцы хныкалі, хныкалі...

— Ну — бярыце, калі такую ахвоту маеце,— дазволіў тата.— Хутчэй прывыкнеце насіць.

— Бярыце,— згадзілася і бабуля.— Каця, я мо адна павяду? Вам тут дома яшчэ работы многа.

— Ой, не ведаю, за што хапацца. У цырульню не схадзіла, прычоскі не зрабіла...

У самых дзвярах Коля раптам прашаптаў Толю:

— Дай памацаю тваё калена... Дрыжыць?

Толева калена не дрыжала.

— А памацай маё...

Толя памацаў. Яно дрыжала дробненька, нібы хамяк, калі яго першы раз узялі ў рукі.

— Ну — шчаслíва! Ну — усяго добрага! Ну — каб выдатна вучыліся! — жадалі напаследак мама і тата, зміналі выходзіць. Мама пацалавала хлопцаў, злёгку падштурхнула ў ранцы.

І праўда, ніхто з ранцамі і партфелямі ў школу не ішоў. Але ўсе ішлі з кветкамі. Дзіцячы гоман поўніў вуліцы, перамагаў шум машын. Дзяўчынкі ў белых фартушках і белых гольфіках, з каляровымі банцікамі і кветкамі ажно ззялі, расчырваненеліся ад хвалявання іх шчокі. Хлапчукі былі ў сініх касцюмчыках — якраз у такой форме, як і Толя з Колем. З мамамі ішлі, з татамі, з бабулямі і дзядамі. Ішлі дзеці і без дарослых — мо якія трэцякласнікі ці чацвёртакласнікі.

Толя і Коля моцна сціскалі бабуліны рукі, не адставалі ні на крок. У аднаго ў левай, у другога ў правай руцэ было па тры гладыёлусы — белы, ружовы і цёмна-чырвоны, ледзь не аксамітны.

— Гэй, першаклашкі, а ці пад'елі маннай кашкі? — абагнаў іх нейкі хлапчук-бальшун. Свой букет ён трымаў пад пахаю, як венік, з якім ходзяць у лазню.

Хлопцы дружна паказалі яму языкі.

Каля газетнага кіёска на рагу вуліцы стаяў Сцёпа Мармышка з моднаю сумкаю цераз плячо.

Шыкоўная сумка, з замежным надпісам на баку — «Adidas». Сцёпа купляў значкі і жаваў гумку. У вітрыне было многа-многа значкоў пра Ваўка і Зайца.

Ледзь стрымаліся Толя і Коля, каб не папрасіць у бабулі: «Купі!»

Сцёпа пайшоў за імі. На грудзях блішчалі значкі, як медалі ў ветэрана вайны. Калі Толя і Коля азіраліся, Мармышка выдзімаў на губах брудна-шэры гумавы пузыр і вылупліваў на іх вочы — пацвяляў. Во, маўляў, які я самастойны... Што хачу, тое і раблю! І сам у школу іду!

На школьным двары было поўна людзей — і дарослых, і дзяцей, і ўсе з кветкамі. Людзі пераМаўляліся, тупалі на месцы ад нецярпення. Першакласнікі цягнулі шыі, пазіралі па баках. Большыя дзеці гойсалі па двары, мітусіліся, галёкалі, і ад гэтага здавалася, што іх у два разы больш. У шум і гоман урываліся гукі «Школьнага вальса» — на сцяне школы вісеў рэпрадуктар. Чырванела над ганкам палотнішча з белымі літарамі: «Калі ласка!»

І вось на высокі ганак выйшлі мужчына і жанчына.

«Дырэктар Мікалай Кірылавіч... І завуч — Аксана Фёдараўна...» — зашапталі жанчыны. Раптам рэпрадуктар сціх.

— Таварышы! Усіх першакласнікаў прашу пастроіць спераду,— сказаў дырэктар.— Смялей, смялей! Па класах станавіцеся...

Пакуль мамы і бабулі выстройвалі першакласнікаў, з дзвярэй пачалі выходзіць тыя, для каго гэты школьны год будзе апошнім, і станавіцца шарэнгай насупраць іх.

І вось дырэктар пачаў гаварыць прамову, вітаць дзяцей і дарослых, віншаваць са святам першага

званка. Ён стрымана ўсміхаўся, нібы прыхоўваў сваю сапраўдную ўсмешку на потым. Затое Аксана Фёдараўна ўсміхалася шырока, сонечна, цёпла, нібы і дзеці, і дарослыя зрабілі ёй вельмі прыемны падарунак. Як скончыла яна гаварыць сваю прамову, з рэпрадуктара зноў палілася музыка — не то марш, не то полька. Старшакласнікі ступілі па два крокі і пачалі ўручаць першакласнікам па адной кветачцы, па кніжцы і паштоўцы з віншаваннем.

Колю давала падарунак дзяўчынка з рабацінкамі на носе, з дзвюма коскамі-хвосцікамі, якія весела тырчалі ў бакі.

А Толю трапіўся «акулярык». Ён пацiснуў яму руку як даросламу і замест віншавання спытаў: «У шахматы гуляеш? Ну і малаток!»

А потым усе пайшлі па сваіх класах, а дарослыя ў залу на сход.

— Я вас завяду, завяду! — сказала бабуля.— Вам у першы «А», я ведаю дзе... Глядзіце, якою нагою ступіце на школьны парог. Лепш — праваю... Ёсць такі забабон.

— Гэты бабон бабулі выдумалі? — недачуў крыху Толя.

Каля парога школы хлопцы азірнуліся. На прыступкі ўзышло ўжо многа людзей, напіралі на іх. Стаяў натоўп яшчэ і каля ганка. У прагалачку паміж людзей Толя і Коля заўважылі, што амаль каля самых прыступак стаяць мама і тата, трымаюцца за рукі. Мама выцірае хусцінкаю вочы.

— Шчаслiва! — усміхнулася ім мама.

— Шчаслiва!..— махнуў тата абедзвюма рукамі.

І хлопцы ступілі цераз парог, нават не заўважылі — якою нагою...

## Змест

ПРЫГОДЫ БУЛЬБОБАЎ
3

«ЯК НА НАШЫ ІМЯНІНЫ...»
91

**Місько П.**

М65 Прыгоды Бульбобаў: Аповесці: Для сярэд. шк. узросту / Павел Місько; Маст. У. Б. Максімаў.— Мн.: Маст. літ., 2004.— 167 с.: іл.

ISBN 985-02-0676-4.

Цікавы, захапляльны сюжэт адразу заваюе ўвагу юнага чытача — аповед у «Прыгодах Бульбобаў» вядзецца ад імя... сабачанят. З мяккім гумарам аўтар расказвае, як маленькія істоты адкрываюць для сябе такое вялікае і складанае жыццё.

Аповесць «Як на нашы імяніны...» займальна распавядае пра ўзаемаадносіны дзяцей.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**МІСЬКО** Павел Андрэевіч

ПРЫГОДЫ БУЛЬБОБАЎ

*Аповесці*

Рэдактар *У. М. Мазго*
Мастак *У. Б. Максімаў*
Мастацкі рэдактар *К. С. Ракіцкі*
Тэхнічны рэдактар *В. Ю. Серчанка*
Стылістычны рэдактар *Д. Р. Лосік*

Падпісана да друку 27.01.04. Фармат 60×90$^{1}/_{16}$.
Папера афсетная № 1. Гарнітура Школьная.
Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 10,5. Улік.-выд. арк. 6,36.
Тыраж 2000 экз. Заказ 162.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Ліцэнзія ЛВ № 3 ад 28.11.2002.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.



ISBN 985-02-0676-4